В.С.СМЯТАННІКАЎ

# БЕЛАРУСАЗНАЎСТВА



БЕЛАРУСАЗНАЎСТВА



**ВІКТАР СЯРГЕЕВІЧ СМЯТАННІКАЎ** скончыў гістарычны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута і аспірантуру па кафедры сацыяльна-палітычнай гісторыі.

Выкладае беларусазнаўства і асновы сацыяльна-гуманітарных навук у Мінскім дзяржаўным вышэйшым лётна-тэхнічным каледжы.

Займаецца праблемамі методыкі выкладання сацыяльна-гуманітарных навук і выхаваўчага працэсу ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах; мае шэраг метадычных распрацовак і друкаваных прац.

В. С. Смятаннікаў

# БЕЛАРУСАЗНАЎСТВА

*Рэкамендавана Навукова-метадычным цэнтрам*
*вучэбнай кнігі і сродкаў навучання*
*Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*
*у якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка*
*для выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў*

***2-е выданне***

Мінск
"Беларуская навука"
2000

УДК 39(=826)+908.476(072)
ББК 63.5(4Беи)Я7
С 52

Рэцэнзенты:
кандыдат гістарычных навук Ю. М. Бохан,
кандыдат гістарычных навук Ю. Л. Казакоў

**Смятаннікаў В. С.**

С 52 Беларусазнаўства. Вучэбна-метад. дапам. для выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. — Мн.: Беларуская навука, 2000. — 149 с.

ISBN 985-08-0406-8

Вучэбна-метадычны дапаможнік адпавядае дзеючай праграме па беларусазнаўству для сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў Беларусі. Ён змяшчае інфармацыйныя і бібліяграфічныя матэрыялы і метадычныя распрацоўкі, якія дапамогуць выкладчыку падрыхтаваць лекцыйныя і семінарскія заняткі па беларусазнаўству. Дапаможнік забяспечаны неабходным даведачным апаратам (прадметны і імянны паказальнікі, тэматычныя спісы літаратуры). У дадатку друкуецца праграма курса «Беларусазнаўства» з заўвагамі і парадамі.

**УДК 39(=826)+908.476(072)**
**ББК 63.5(4Беи)Я7**

ISBN 985-08-0406-8

© В. С. Смятаннікаў, 2000

# ЗМЕСТ


Прадмова .......... 7

**Метадычныя матэрыялы да вучэбных тэм:**

Уводзіны .......... 10

**Тэма 1**

БЕЛАРУСЫ. МІЖНАЦЫЯНАЛЬНЫЯ АДНОСІНЫ НА БЕЛАРУСІ .......... 15

**Тэма 2**

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ САМАСВЯДОМАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ ... 22

**Тэма 3**

СУВЯЗІ БЕЛАРУСАЎ З СУСЕДНІМІ КРАІНАМІ. БЕЛАРУСЫ ЗА МЯЖОЮ .......... 36

**Тэма 4**

СВОЕАСАБЛІВАСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПОБЫТУ .......... 44

**Тэма 5**

ВЕРАВЫЗНАННІ НАРОДАЎ БЕЛАРУСІ .......... 53

**Тэма 6**

РАЗВІЦЦЁ АЙЧЫННАЙ ГРАМАДСКАЙ ДУМКІ .......... 60

**Тэма 7**

СЛАВУТАСЦІ БЕЛАРУСІ .......... 75

**Тэма 8**

МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ .......... 81

**Тэма 9**

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АДУКАЦЫЯ .......... 90

**Тэма 10**

ПРЫРОДНЫЯ ЎМОВЫ І ЭКАЛАГІЧНАЯ СІТУАЦЫЯ НА БЕЛАРУСІ .......... 97

**Тэма 11**

СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ .......... 102

**Тэма 12**

АТРЫБУТЫ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СУВЕРЭНІТЭТУ .......... 108

Заключэнне .......... 126

Дадатак .......... 129

- Праграма курса па беларусазнаўству .......... 129
- Метадычныя заўвагі да праграмы .......... 132
- Прыклады картак-тэстаў .......... 134

Прадметны паказальнік .......... 137

Імянны паказальнік .......... 140

# ПРАДМОВА

У пачатку 90-х гадоў у сярэдніх спецыяльных навучальных установах Рэспублікі Беларусь уведзены новы вучэбны прадмет "Беларусазнаўства". Гэты прадмет атрымаў фактычна другое жыццё ва ўмовах сучаснага этапу нацыянальнага адраджэння, калі ажыццяўляецца працэс замацавання, удасканалення беларускай дзяржаўнасці і рашуча аднаўляецца змест навучання і выхавання ў сістэме адукацыі.

Прадмет "Беларусазнаўства" ў значнай ступені можа абапірацца на беларусазнаўчыя асновы, якія былі закладзены найперш у школьных курсах гісторыі, геаграфіі, мовы і літаратуры, выяўленчага мастацтва, музыкі і спеваў. Новы прадмет абагульняе набытыя веды навучэнцаў пра Бацькаўшчыну, дае ім тэарэтычнае тлумачэнне, уводзіць у змест навучання элементы краязнаўства, этнаграфіі, народнага і прафесійнага мастацтва, народнай педагогікі, сучаснай гістарычнай і грамадска-палітычнай думкі. Фактычна сучаснае беларусазнаўства — гэта абагульняючая назва комплексу гісторыка-філалагічных і іншых навук пра Беларусь і беларускі народ. Асаблівасцю гэтага прадмета з'яўляецца магчымасць для выкладчыка ўвесці ўслед за тэарэтычнымі заняткамі практычныя, якія маюць этнаграфічную, краязнаўчую і іншую накіраванасць. Практычныя заданні могуць і павінны ў значнай ступені ўлічваць асабістыя інтарэсы і ўзровень падрыхтаванасці навучэнцаў, а таксама магчымасці правядзення заняткаў у музеях і на мясцовасці, забяспечанасць літаратурай і раздатачнымі матэрыяламі.

Выкананне практычных заданняў можа ажыццяўляцца ў розных формах: індывідуальна, па мікрагрупах, калектыўна. У якасці метадычных прыёмаў магчыма выкарыстоўваць даследчыцкую работу па карце; тлумачэнне ўзнікнення назваў мясцовасці, апісанне помнікаў прыроды і культуры, выраб макетаў, збор фальклору і мясцовых дыялектаў, афармленне этнаграфічных куткоў і музеяў, падрыхтоўка рэцэнзій, анатацый, правядзенне творчых вечарын, сустрэч са знакамітымі людзьмі і г.д. Гэтыя і іншыя формы і метады работы выкладчы-

ка па арганізацыі выканання практычных заданняў навучэнцамі, як сведчыць практыка, якасна ўплываюць на глыбіню і трываласць засваення матэрыялу аб Бацькаўшчыне.

Напрыклад, кожны навучэнец або студэнт выконвае практычнае заданне з выкарыстаннем картаграфічных матэрыялаў (па этналінгвістычнай характарыстыцы насельніцтва, па месцазнаходжанні помнікаў прыроды і культуры і г.д.). Тапаграфічнай асновай для этнаграфічных карт могуць быць контурныя карты па геаграфіі і гісторыі Беларусі для сярэдняй школы. У якасці прыкладу (узору) трэба выкарыстоўваць карты, змешчаныя ў энцыклапедычных выданнях і атласах. Асаблівую ўвагу раім звярнуць на выданні апошніх гадоў (напрыклад, працы Л. Р. Казлова, А. К. Цітова, Я. Шыраева), якія ўпершыню ахопліваюць розныя гістарычныя карты і даюць магчымасць адзначыць этнічныя, гісторыка-культурныя і дзяржаўныя межы беларусаў, даюць аб'ектыўную інфармацыю аб зменах палітычных межаў Беларусі на працягу яе шматвяковай гісторыі.

У якасці метадычнай літаратуры па пытаннях выканання практычных заданняў па краязнаўству выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя выданні: Моя республика: Методическое пособие по историко-краеведческому движению "Моя республика" /Сост. В. П. Ергольская. Мн., Б. Г.; Лобач М. С. Ахова этнаграфічных помнікаў. Мн.,1975; Помнікі этнаграфіі: Методыка выяўлення, апісання і збірання. Мн.,1981; Белакоз А. Як стварыць этнаграфічны музей у школе // Бел. мова і літаратура ў школе. 1990. № 8.

З мэтай удасканалення выкладання беларусазнаўства пажадана апрабіраваць такія метадычныя падыходы, як параўнальны аналіз тэарэтычных публікацый і розных дакументаў-першакрыніц; заняткі-экскурсіі (дзе ў якасці экскурсавода выступае не выкладчык, настаўнік, а вучань, студэнт); арыгінальныя і прыгодніцкія фабулы ў падачы матэрыялу; мясцовы матэрыял пра малую Бацькаўшчыну; выкарыстанне сучасных тэхнічных інфармацыйных сродкаў і г.д.

Новы прадмет "Беларусазнаўства" патрабуе адпаведнага метадычнага забеспячэння, і ў сувязі з гэтым падрыхтаваны метадычныя рэкамендацыі для выкладчыкаў.

У метадычныя рэкамендацыі ўключаны кантрольныя пытанні, практычныя заданні і тэматыка рэфератаў для навучэнцаў (студэнтаў), некаторыя метадычныя заўвагі і наглядныя сродкі, а таксама літаратура па ўсіх тэмах прадмета. Спісы літаратуры складзены як максімальна падрабязныя ў сувязі з адсутнасцю дапаможніка па прадмету. Літаратура ўмоўна падзелена на асноўную і дадатковую, якую раім выкарыстоўваць перш-наперш выкладчыкам. У якасці асноўных выданняў для навучэнцаў і студэнтаў — энцыклапедыі (розных гадоў выдання), Нарысы гісторыі Беларусі (Мн., 1994—1995). Прапануемыя пытанні, заданні і тэмы рэфератаў могуць карэкціравацца

выкладчыкам у залежнасці ад рэгіянальнай спецыфікі і профілю навучальнай установы, у сувязі з інтарэсамі і асаблівасцямі навучэнцаў.

У час распрацоўкі рэкамендацый былі выкарыстаны метадычныя матэрыялы, якія выдадзены вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Рэспублікі Беларусь, Беларускім навукова-метадычным цэнтрам гульні і цацкі, асабісты педагагічны вопыт, а таксама навуковая, мастацкая, публіцыстычная літаратура апошніх гадоў выдання (па стану на снежань 1996 г.).

Метадычныя матэрыялы размешчаны паводле тэматычнага прынцыпу ў адпаведнасці з дзеючай праграмай прадмета для сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

У дадатку дапаможніка змешчаны праграма прадмета "Беларусазнаўства" для сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і заўвагі да праграмы, узоры картак-тэстаў.

1а Зак. 1271

# МЕТАДЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ ДА ВУЧЭБНЫХ ТЭМ

## Тэма: Уводзіны

З гэтай тэмы пачынаецца вывучэнне курса беларусазнаўства. На першай сустрэчы с навучэнцамі выкладчык павінен раскрыць сутнасць прадмета, яго змест і асаблівасці, асноўныя гістарычныя этапы станаўлення і развіцця беларусазнаўства як навуковай і адукацыйнай дысцыпліны, сувязі з гісторыяй, геаграфіяй, археалогіяй, этналогіяй, дэмаграфіяй, краязнаўствам, сацыялогіяй і іншымі навукамі. У працэсе ўводнага занятку выкладчык абавязкова знаёміць навучэнцаў з тэматыкай курса, літаратурай па прадмеце, беларускамоўнымі перыядычнымі выданнямі (напрыклад, часопісамі "Беларуская мінуўшчына", "Беларускі гістарычны часопіс", "Полымя", "Беларуская думка", "Роднае слова", "Беларусь", "Маладосць", "Культура" і г. д.).

На гэтым і наступных занятках выкладчык асаблівую ўвагу звяртае на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці навучэнцаў, іх гістарычнай памяці, гонару за сваю дзяржаву, яе культуру, мову, гісторыю, славутасці яе людзей. У гэтых мэтах рэкамендуецца выкарыстоўваць розныя метадычныя прыёмы і формы арганізацыі заняткаў. На ўводным занятку маецца магчымасць разгледзець некалькі асноўных пытанняў:

1. Беларусазнаўства як навуковая і адукацыйная дысцыпліна.
2. З гісторыі назвы "Белая Русь".

Першае пытанне з'яўляецца для навучэнцаў (студэнтаў) новым, таму выкладчык пераважна выкарыстоўвае лекцыйны метад; другое пытанне, якое ў пэўнай меры вядома слухачам, можа разглядацца ў форме гутаркі. Асноўныя змястоўныя характарыстыкі па вучэбных пытаннях навучэнцам рэкамендуецца фіксаваць у сшытках.

Рыхтуючыся да заняткаў па гэтай тэме, выкладчык павінен выкарыстаць навейшыя выданні па гісторыі Беларусі. Так, для першага пункту плана раім азнаёміцца з артыкуламі "Беларусазнаўства" ў энцыклапедыях, вызначыць асноўныя этапы развіцця, узроўні існавання, навуковыя плыні.

**Беларусазнаўства** ўяўляе сабой навуку, што вывучае адметнасць і агульнасць беларусаў, іх нацыянальны рух, узаемаадносіны з суседзямі і ролю ў сістэме міжнароднай супольнасці народаў у мінулым і сучасным; адначасова гэта абагульняючая назва комплексу гісторыка-філалагічных і іншых навук пра Беларусь і беларускі народ — яго сацыяльную і этнічную гісторыю, умовы бытавання, матэрыяльную і духоўную культуру, мову ў іх сучасным стане і гістарычным развіцці.

Вызначаецца беларусазнаўства комплексным, міждысцыплінарным падыходам да праблем даследавання і ўключае шэраг рознагаліновых навук: гісторыю, геаграфію, прыродазнаўства, эканоміку, этнаграфію, мастацтвазнаўства, кнігазнаўства Беларусі, беларускую фалькларыстыку, літаратуразнаўства і мовазнаўства, гісторыю культуры, гісторыю рэлігіі на беларускіх землях і інш.

Беларусазнаўства здзяйсняе самапазнанне нацыі з мэтай выпрацоўкі і ўдасканалення нацыянальнай тэорыі, вызначэння нацыянальнага шляху (аб'яднаўчай ідэі), аховы нацыянальных форм быцця, у якіх выяўляюцца заканамернасці агульначалавечага прагрэсу (Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 2. Мн., 1996. С. 389; Беларусь: Энцыкл. даведнік. Мн., 1995. С. 82).

Узнікла беларусазнаўства ў XIX ст., калі фарміравалася беларуская нацыя; вельмі інтэнсіўна развівалася на рубяжы XIX—XX стст. і ў першыя гады станаўлення нацыянальнай дзяржаўнасці.

У наш час беларусазнаўства існуе на навуковым і адукацыйным узроўнях, арганізавана дзяржавай і ажыццяўляецца Міністэрствам адукацыі і навукі, Акадэміяй навук, Нацыянальным навукова-асветніцкім цэнтрам імя Ф. Скарыны, кафедрамі вышэйшых навучальных устаноў. Важную ролю ў распаўсюджанні ведаў па беларусазнаўству выконваюць нацыянальная адукацыйная сістэма, выдавецтвы, радыёстанцыі, кіна- і тэлестудыі, бібліятэкі, музеі, архівы, творчыя калектывы і г.д.

Беларусазнаўства як навука дзеліцца на некалькі плыняў — айчыннае, эміграцыйнае і замежнае. Навукоўцы, якія даследуюць розныя аспекты развіцця Беларусі, аб'ядналіся ў Міжнародную асацыяцыю беларусістаў, першы кангрэс якой адбыўся ў Мінску ў маі 1991 г.

Выкладчыку таксама важна падкрэсліць выдатную ролю канкрэтных асоб у вывучэнні беларускага этнасу, абгрунтаванні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў і іх культуры, якія тым самым садзейнічалі развіццю інтарэсаў да сваіх каранёў, да гісторыі Бацькаўшчыны і фарміраванню нацыянальнай свядомасці (напрыклад, І. М. Даніловіча, М. К. Баброўскага, К. Каліноўскага, Ф. Багушэвіча, К. Каганца, Г. Татура, А. Сапунова, В. Ластоўскага, Я. Карскага, Б. Эпімах-Шыпілы, А. і І. Луцкевічаў, Я. Купалы, Я. Коласа і інш., сучасных навукоўцаў, дзеячаў культуры, пісьменнікаў, публіцыстаў і г.д.).

Разглядаючы пытанне "З гісторыі назвы "Белая Русь", выкладчык мае магчымасць выкарыстаць першую частку "Нарысаў гісторыі Беларусі" (Мн.: Беларусь, 1994. С. 198—200), дзе змешчаны матэрыял аб розных версіях наконт паходжання назвы нашай зямлі. Умоўна гэтыя гіпотэзы магчыма вызначыць як :

1) Кліматычна-геаграфічную;
2) Этнаграфічную;
3) Царкоўна-рэлігійную;
4) Дзяржаўна-палітычную ("Белая" — значыць вольная Русь, незалежная ад мангола-татарскіх намеснікаў).

Апошняя гіпотэза з'яўляецца найбольш распаўсюджанай, але ёй пярэчыць той факт, што гэта назва атрымала асаблівае пашырэнне на Беларусі ў XV — XVI стст. — у той перыяд, калі і іншыя ўсходнеславянскія землі былі ўжо незалежнымі ад мангола-татар.

Таму больш верагоднай лічыцца канцэпцыя, якая ўлічвае своеасаблівы адміністрацыйна-дзяржаўны статус зямель Белай Русі (перш за ўсё Полацкай і Віцебскай) у складзе Вялікага княства Літоўскага.

Выкладчыку рэкамендуецца падкрэсліць гістарычную агульнасць тэрмінаў "Русь" і "Белая Русь", адзначыць на карце тэрыторыю, на якой зацвярджалася назва "Белая Русь" ("Alba Rossia"). Так, цікавы прыклад можна прывесці з гістарычнай працы сакратара польскай каралеўскай канцылярыі Марціна Кромера (прыкладна 1558 г.), які адзначаў, што Белая Русь мяжуе з Маскоўскай дзяржавай, а на поўнач ад яе граніцы (57° шыраты) размешчана Лівонія; на поўдні Белая Русь мяжуе з Валынню і Чырвонай Руссю.

Канкрэтным сведчаннем міжнароднай вядомасці назвы і тэрыторыі Белай Русі з'явілася стварэнне і друкаванне ў 1645 — 1952 гг. французскім інжынерам-фартыфікатарам Г. Бапланам сумесна з гданьскім выдаўцом В. Хондыем карты "Вялікае княства Літоўскае і Белая Русь", дзе ўпершыню назва нашай зямлі вынесена ў загаловак (Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т.1. Мн., 1993. С. 293).

Цікавыя падыходы да гісторыі паходжання тлумачэння паняцця "Белая Русь" змешчаны ў працах Р. А. Агеевай, М. Ф. Піліпенкі, А. Рагалёва і іншых аўтараў (гл. спіс літаратуры да тэмы).

Па выніках разгляду ўводнай тэмы слухачы павінны засвоіць яе змест і адказаць прыкладна на такія пытанні.

## Кантрольныя пытанні:

1. Калі і чаму ўзнік прадмет "Беларусазнаўства"?
2. Якія асноўныя этапы выдзяляюцца ў развіцці гэтага прадмета?
3. Хто з дзеячаў нацыянальнай культуры стаяў ля вытокаў "Беларусазнаўства"?

4. У чым сутнасць прадмета "Беларусазнаўства"?

5. Якія існуюць узроўні і накірункі ў "Беларусазнаўстве"?

6. Як сфарміравалася назва "Белая Русь"? У чым асаблівасці розных навуковых падыходаў да гэтай назвы?

7. У якім стагоддзі назва "Белая Русь" зацвердзілася на нашай зямлі?

## Рэфераты:

1. Гісторыя назвы "Белая Русь" у мемуарнай, навуковай, публіцыстычнай і мастацкай літаратуры.

2. Развіццё беларусазнаўства на рубяжы XIX — XX стст.

3. Праблемы развіцця беларусазнаўства ў наш час.

4. Адлюстраванне ў працах па беларусазнаўству пытанняў развіцця (або гісторыі, этнаграфіі, археалогіі, фальклору і г.д.) свайго краю (вёскі, горада, мясцовасці).

## ЛІТАРАТУРА

### Асноўная

Агеева Р. А. Страны и народы: Происхождение названий. М., 1990.

Бандарчык В. К. Гісторыя беларускай савецкай этнаграфіі. Мн., 1972.

Бандарчык В. К. Гісторыя беларускай этнаграфіі: Пачатак XX ст. Мн., 1970.

Беларусазнаўства // Шыбека З. В. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 1. Мн., 1993. С. 346—348; Беларусь: Энцыкл. даведнік. Мн., 1995. С. 82.

Беларусазнаўства // Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1989. С. 55—56.

Иванов В. В. Цветовая символика в географических названиях в свете данных типологии: К названию Белоруссии // Балтославянские исследования. М., 1981. С. 163—171.

Историческое краеведение Белоруссии. Мн., 1980.

Казлоў Л., Цітоў А. Беларусь на сямі рубяжах. Мн., 1993.

Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Мн., 1994—1995.

Пилипенко М. Ф. Возникновение Белоруссии: Новая концепция. Мн., 1991.

Пилипенко М. Ф. Этнография Белоруссии. Мн., 1981.

Рагалёў А. Ля вытокаў Белай Русі // Літ. і мастацтва. 1988. 18 сак.

Рагалёў А. Што такое Чорная Русь? // Роднае слова. 1992. № 4.

Русь вольная — Белая Русь: Інтэрв'ю//Бел. мінуўшчына. 1993. № 2. С. 12—16.

Трубачоў А. Не ад белай адзёжы і светлых вачэй: Погляд на этнагенез беларусаў // Бел. мінуўшчына. 1993. № 1.

Шапошников В. Н. Историческая этнонимика: Учебное пособие. СПб., 1992.

Ширяев Е. Е. Беларусь: Русь Белая, Русь Чёрная и Литва в картах. Мн., 1991.

Шумейка М. Русь вольная — Белая Русь // Бел. мінуўшчына. 1993. № 2.

Этнаграфія беларусаў: Гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя. Мн., 1985.

Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1989.

### Дадатковая

Багдановіч А. Б. Да пытання аб ужыванні назвы "Русь" на тэрыторыі Беларусі ў XIV—XVI стст. // Веснік БДУ. Сер. 3. 1996. № 1. С. 3—5.

Беларусіка — Albaruthenica. Кн. 1—4. Мн., 1993—1995.

Бромлей Ю. В., Подольный Р. П. Человечество — это народы. М., 1990.

Бромлей Ю. В. Современные проблемы этнографии. М., 1981.

Гісторыі таемныя радкі: Бібліяграфічны агляд // Новыя кнігі Беларусі. 1994. № 1. Дадатак.

Гринблат М. Е. Белорусы: Очерки происхождения и этнической истории. Мн., 1968.

Загорульский Э. Древняя история Белоруссии. Мн., 1977.

Іофэ Э. Час пісаць сапраўдную гісторыю // Беларусь. 1991. № 1. С. 16—17.

Итс Р. Ф. Введение в этнографию. Л., 1991.

Кахановўскі Г. А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI — XIX стст. Мн., 1984.

Краязнаўчыя матэрыялы на старонках друку Беларусі (пачатак XX ст. — 20-я гг. XX ст.) : Рэкаменд. бібліяграф. спіс // Новыя кнігі Беларусі. 1994. № 5. Дадатак.

Піліпенка М., Трубачоў А., Побаль Л. "Дзе зямля наша будзе, дзе Айчына ў нас..." // Бел. мінуўшчына. 1993. № 1. С. 5—10.

Постаці беларускага Адраджэння: Рэкаменд. бібліяграф. спіс // Новыя кнігі Беларусі. 1994. № 2. Дадатак; № 3. С. 25—42.

100 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі / Уклад. І. Саверчанка, Зм. Санько. Мн., 1993.

Шпилевский П. М. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю. Мн., 1992.

Этнография: Учеб. / Под ред. Ю. В. Бромлея и др. М., 1982.

# Тэма 1

# БЕЛАРУСЫ. МІЖНАЦЫЯНАЛЬНЫЯ АДНОСІНЫ НА БЕЛАРУСІ

Адной з найбольш значных, вузлавых праблем гісторыі Бацькаўшчыны і курса "Беларусазнаўства" з'яўляецца праблема паходжання беларусаў.

Раскрыццё пытанняў этнагенезу беларусаў, як і іншых гістарычных праблем, патрабуе ад выкладчыка ведання розных сучасных навуковых падыходаў, якія трэба параўноўваць, спасылаючыся на розныя крыніцы. Выкладчык мае магчымасць знайсці абагульняючыя звесткі аб гістарычнай літаратуры ў выданні "Гісторыі таемныя радкі: Бібліяграфічны агляд" (Новыя кнігі Беларусі. 1994. № 1. Дадатак), якое падрыхтавана Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі.

У працэсе раскрыцця зместу тэмы выкладчыку рэкамендуецца звярнуць увагу слухачоў на продкаў сучасных беларусаў (старажытных людзей, усходніх славян і сумежных народаў; адзначыць тэрыторыю іх пражывання на карце) і этапы фарміравання беларускай народнасці і нацыі.

У якасці высноў могуць быць адзначаны наступныя:

1) беларусы з'яўляюцца карэнным насельніцтвам нашай зямлі;

2) этнічныя межы рассялення беларусаў не поўнасцю супадаюць з сучаснымі палітычнымі межамі; частка беларусаў як карэннага насельніцтва знаходзіцца на сваёй этнічнай зямлі, але па другі бок сучаснай дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь — на тэрыторыі Расіі, Польшчы, Літвы, Латвіі. Гэтага магло і не быць, калі б размежаванне зыходзіла з этнічных прыкмет. Але ў гісторыі граніц аж да апошняга часу дамінавалі палітычныя, нават ваенна-палітычныя матывы;

3) у працэсе гістарычнага развіцця беларускі этнас набыў свае асаблівасці, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне і існуюць у такіх адносна ўстойлівых формах, як мова, традыцыі, абрад, народная творчасць, этнічная самасвядомасць, тапаніміка, культура, лад паўсядзённага жыцця і г.д. Гэтыя рысы, як і паходжанне, адрозніваюць беларусаў ад іншых народаў, якія з часоў сярэднявечча жывуць побач з беларусамі, на этнічнабеларускай зямлі.

Адзначаныя высновы могуць быць своеасаблівым пераходам да пытання аб дэмаграфічным развіцці і агульнай характарыстыцы тых нацыянальных груп насельніцтва, якія жывуць на Беларусі.

Па ацэначных даных, звестках рэвізій (улікаў насельніцтва, якое плаціла падаткі і адбывала рэкруцкую павіннасць), выніках перапісаў агульная колькасць насельніцтва на тэрыторыі сучаснай Беларусі характарызуецца наступнымі лічбамі.

**Т а б л і ц а 1.1. Агульная колькасць насельніцтва Беларусі**

| Гады | Колькасць насельніцтва (тыс. чал., у сучасных межах) |
|---|---|
| 1650[1] | 2900 |
| 1667 | 1400 |
| канец XVII ст. | 2200 |
| 1721 | 1400 |
| 1811[2] | 5037 |
| 1838 | 4956,6 |
| 1851 | 4974,0 |
| 1863 | 5549,5 |
| 1897 | 6380,0 |
| 1914 | 7515,1 |
| 1921 | 6693,7 |
| 1939 | 8908,6 |
| 1941 | 9183,4 |
| 1945 | 6264,8 |
| 1950 | 7709,0 |
| 1959 | 8046,5 |
| 1970[3] | 9002 |
| 1979 | 9560 |
| 1989 | 10200 |
| 1992 | 10281 |
| 1995[4] | 10345 |

[1] Голубеў В. Ф. і інш. Ці ведаеце вы гісторыю сваёй краіны? Мн., 1994. С.44.

[2] БелСЭ. Т. 12. Мн., 1975. С. 55—57.

[3] Народное хозяйство Республики Беларусь в 1991 г. Мн., 1993. С. 35.

[4] Беларусь: Энцыкл. даведнік. Мн., 1995. С. 525.

У якасці галоўных прычын, якія абумовілі памяншэнне агульнай колькасці і тэмпаў прыросту насельніцтва Беларусі ў асобныя перыяды, магчыма адзначыць наступныя:

**войны**, якія пракаціліся па тэрыторыі Беларусі ў розныя

стагоддзі, голад і эпідэміі пасля войнаў (так, у часы войнаў Рэчы Паспалітай у 1654—1667 гг. з Рускай дзяржавай і Швецыяй колькасць насельніцтва скарацілася амаль на 50%; у часы Паўночнай вайны 1700—1721 гг. Беларусь страціла каля 700 тыс. насельніцтва; у гады першай сусветнай вайны загінула на франтах 107 тыс. чалавек, за кошт павышанай смяротнасці — 445 тыс. чалавек; у гады Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг. загінула больш за 2,2 млн чалавек, некаторыя вёскі і мястэчкі абязлюдзелі. Напрыклад, у Гомельскай вобласці засталося менш за 18 % даваенных жыхароў, у Магілёўскай — 35, Віцебскай — 27, Палескай — 29, у Мінску — 40 % (Гісторыя БССР. Т. 5. Мн., 1975. С. 21);

**масавы адыход** беззямельных сялян у канцы XIX — пачатку XX ст. на заробкі ў іншыя губерні Расіі, перасяленне ў Сібір і на Дальні Усход ("так, за 1897—1917 гг. з тэрыторыі Беларусі перасялілася 520 тыс. сялян ва ўсходнія раёны Расіі", — адзначала даследчыца А. Н. Пяшкова // Вестник МГУ. География. 1968. № 3. С.150);

**эміграцыя** ў краіны Заходняй Еўропы і Амерыкі (так, у перыяд 1895—1914 гг. з тэрыторыі Беларусі накіравалася за мяжу амаль 100 тыс. чалавек, з іх прыкладна 80 тыс. яўрэяў (гл. працу А. Н. Пяшковай), у гады першай сусветнай і грамадзянскай войнаў — 122 тыс. чалавек);

**бежанцы** і эвакуіраваныя, якія не вярталіся на радзіму (прыкладна 246 тыс. у 1914—1922 гг.; у 1941—1944 гг. знаходзілася ў эвакуацыі звыш 1 млн чалавек з Беларусі, частка з іх заставалася ва ўсходніх рэгіёнах Савецкага Саюза);

**дэпартацыі** насельніцтва акупантамі (так, у 1941—1944 гг. фашысцкія акупанты вывезлі на працу ў Германію больш чым 377 тыс. чалавек, з іх 260 тыс. на Радзіму не вярнуліся, у сваёй большасці загінулі // Сов. Белоруссия. 1988. 27 сент.);

**выезд часткі насельніцтва** Беларусі на засваенне новых раёнаў былога СССР (у 50—60-я гады на новабудоўлі і асваенне цалінных зямель Сібіры, Казахстана выехалі каля 900 тыс. чалавек);

**змяненне дзяржаўных межаў** і перадача часткі тэрыторыі Беларусі ў склад іншых дзяржаў — Літвы, Польшчы;

**палітыка** паланізацыі і русіфікацыі з боку дзяржаўных улад;

**рэпрэсіі** савецкіх часоў. Так, у 1930 г., калі разгортвалася калектывізацыя, з тэрыторыі Беларусі было выселена 44 083 чалавекі (Военно-исторический журнал. 1991. № 7. С. 71—72); па стану на 1 студзеня 1939 г. сярод зняволеных ГУЛАГа знаходзілася 44 785 беларусаў (АиФ. 1990. № 35. С. 4). На 1 студзеня 1990 г. у БССР былі рэабілітаваны 53 513 грамадзян (Реабилитация: Политические процессы 30—50-х годов / Под ред. А. Н. Яковлева. М., 1991. С. 329).

Пасля раскрыцця адзначаных вышэй пытанняў выкладчыку рэкамендуецца звярнуць увагу навучэнцаў (студэнтаў) на характарыстыку розных нацыянальных груп на Беларусі:

рускіх, украінцаў, палякаў, літоўцаў, латышоў, яўрэяў, татараў і інш., а таксама на міжнацыянальныя адносіны. На Беларусі жывуць прадстаўнікі больш чым 100 нацый і нацыянальнасцей. Дынаміку найбольшых нацыянальнасцей Беларусі за перыяд з 1897 г. магчыма прааналізаваць па табліцах 1.2 і 1.3. Беларусы складалі і складаюць асноўную частку насельніцтва рэспублікі — амаль усё сельскае насельніцтва і большую частку гарадскога. Удзельная вага іншых нацыянальнасцей змянілася. Рускія на Беларусі складаюць другую па колькасці групу насельніцтва. Значны працэнт палякаў у паўночна-заходніх раёнах рэспублікі. Украінцаў больш на поўдні рэспублікі, жывуць пераважна, як і рускія, у гарадах. "Павелічэнне колькасці рускіх і ўкраінцаў адбылося інтэнсіўна ў сувязі з прыездам кваліфікаваных спецыялістаў у перыяд індустрыялізацыі і НТР, калі ствараліся новыя галіны вытворчасці", — адзначаў даследчык А. А. Ракаў (БелСЭ. Т. 12. С. 61). Іншыя характарыстыкі этнічных і дэмаграфічных працэсаў змешчаны ў навукова-папулярным выданні "100 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі" (Мн., 1993. С. 5, 17—19, 48—49, 54—55, 71, 73), у энцыклапедыі "Этнаграфія Беларусі" (Мн., 1989. С. 59, 292, 381, 434, 492, 504, 522), у шэрагу артыкулаў, якія магчыма рэкамендаваць выкладчыкам і навучэнцам.

У заключнай частцы лекцыі або семінара рэкамендуецца падкрэсліць тыя палажэнні, якія характарызуюць паходжанне і этапы развіцця беларускага этнасу, узаемаадносіны з іншымі народамі.

У мэтах замацавання вывучанага матэрыялу будзе мэтазгодным прапанаваць навучэнцам кантрольныя пытанні, падрыхтоўку рэфератаў і выкананне практычных заданняў.

## Кантрольныя пытанні:

1. Як Вы разумееце паняцці "этнас", "этнагенез", "этнічныя працэсы", "этнонімы"?
2. Як сучасная навука характарызуе паходжанне беларусаў?
3. Калі на тэрыторыі сучаснай Беларусі пасяліліся старажытныя людзі? Дзе знойдзены археолагамі месцы стаянак і селішчаў старажытных людзей?
4. Як і калі адбывалася рассяленне славян?
5. Якія ўсходнеславянскія плямёны жылі на тэрыторыі Беларусі? Што абазначаюць іх назвы?
6. Калі сфарміравалася беларуская народнасць? Якія адметнасці яна мела?
7. Што абазначаюць, на Ваш погляд, наступныя назвы: "ліцвін", "беларусец", "русіч, беларускага племені", "ліцвін-русін Віцебскай Русі", "беларусін, польскай веры"?
8. Калі сфарміравалася беларуская нацыя?
9. Якія адметнасці мае сучасны беларускі этнас?
10. У чым сутнасць нацыянальнай тапанімікі?

11. Калі і чаму на тэрыторыі Беларусі пасяліліся іншыя народы: рускія, палякі, татары, яўрэі?

### Тэматыка рэфератаў:

1. Этнічныя адметнасці беларусаў.
2. Беларускія геаграфічныя назвы.
3. Нацыянальная тапаніміка.
4. Гісторыя паходжання ўласных імён і прозвішчаў беларусаў.
5. Асаблівасці нацыянальных імён і прозвішчаў розных этнасаў Беларусі.
6. Рускае насельніцтва на Беларусі і яго ўплыў на жыццё беларусаў.
7. Татары на Беларусі: мінулае і сучаснасць.
8. Яўрэі на Беларусі.
9. Палякі на Беларусі.
10. Крывічы, радзімічы, дрыгавічы: гісторыя паходжання назваў народаў.

### Практычныя заданні:

1. Выяўленне гісторыі ўзнікнення назвы горада, вёскі, ракі, возера (апісанне паходжання мясцовых тапонімаў).
2. Гісторыя майго прозвішча і імя.
3. Напісанне гісторыі свайго роду, сям'і.
4. Сведкі мінуўшчыны на нашай зямлі.
5. Калі і чаму з'явіліся на зямлі Беларусі − у Вашай мясцовасці — рускія, палякі, украінцы, літоўцы, татары, яўрэі?
6. Правядзенне параўнальнага аналізу асаблівасцей некалькіх некарэнных этнасаў на Беларусі.
7. Прааналізуйце па даведачнай літаратуры: ці маюцца ў Вашым раёне старажытныя паселішчы, курганы і якія легенды з імі звязаны?

## ЛІТАРАТУРА

### Асноўная

Аляксееў В. П., Вітаў М. У., Цягака Л. І. Расавая геаграфія беларусаў і праблемы этнагенезу. Мн., 1994.

Бандарчык В. Адкуль мы?: Да пытання аб этнагенезе беларусаў // Бел. думка. 1994. № 2.

Грынблат М. Я. Беларусы: Нарысы паходжання і этнічнай гісторыі. Мн., 1968.

Ермаловіч М. Па слядах аднаго міфа. Мн., 1989.

Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. Мн., 1990.

Зайкоўскі Э.М. Першабытныя помнікі паўночнай Беларусі. Мн., 1990.

Зам А. Белорусы — опыт самоидентификации / Пер. с нем. // Неман. 1995. № 5. С.136—147.

Калачиц Е. Г. Первоначальное заселение территории Белоруссии. Мн., 1994.

Калубович А. Восемь волн белорусской эмиграции// Неман. 1992. № 2.
Карскі Я. Беларусы // Наша слова. 1991. № 1.
Каспяровіч Г. І. Этнадэмаграфічныя працэсы і міжнацыянальныя адносіны ў БССР // Весці АН БССР. Серыя грамад. навук. 1990. № 5. С. 78—85.
Крыванос Х. З варагаў пайшлі суровыя мужы: Этнічнае паходжанне князёў усходніх славян // Бел. мінуўшчына. 1993. № 2. С. 16—19.
Мікуліч Т. Этнагенез беларусаў — погляд антраполага// Літ. і мастацтва. 1995. № 22. С. 13.
Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Ч. 1. Мн., 1994.
Побаль Л. Славяне — нашы продкі: Археалогія і гісторыя беларускай нацыі // Бел. мінуўшчына. 1993. № 1.
Раков А. Население БССР. Мн., 1969.
Салівон І. І. Фізічны тып беларусаў. Мн., 1994.
Седов В. В. Еще раз о происхождении белорусов// Сов. этнография. 1969. № 1.
Седов В.В. К происхождению белорусов: Проблема балтского субстрата в этногенезе белорусов // Сов. этнография. 1967. № 2.
Сувалаў А. Вытокі этнагенезу беларусаў // Бел. мінуўшчына. 1993. № 3—4.
Тарасевич М.И. Национально-культурный состав коренного народа Белоруссии. Мн., 1994.
Ширяев Е. Белорусы: история и территория// Неман. 1991. № 7.
Штыхаў Г. Вытокі беларускай народнасці // Бел. мінуўшчына. 1993. № 2.
Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя. Мн., 1985.
Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1989.

## Дадатковая

Бацкалевіч У., Канапацкі І. Аб татарах на Беларусі// Беларусь. 1993. № 9. С. 2—4, 5—8.
Войніч Я. Пад знакам Віціса — Пагоні: Літоўцы — нашы суайчыннікі// Звязда. 1993. 14 крас.
Галоцян А. Армянская дыяспара на Беларусі// Культура. 1994. № 22. С. 14.
Грыцкевіч А. Беларуска-рускія перасяленні ў XIV — XVIII стст. // Спадчына. 1993. № 3.
Гушча У. Немцы-палешукі // Звязда. 1993. 26 лют.
Даўгяла З. І. Цыганы на Беларусі // Спадчына. 1992. № 4. С. 54—67.
Думін С. У., Канапацкі І. В. Беларускія татары: Мінулае і сучаснасць. Мн., 1993.
Зайкоўскі Э. Беларусы старажытнай Вільні // Спадчына. 1993. № 1.
Зайкоўскі Э. Крывіцкая Вільня // Бел. гістар. часоп. 1994. № 1.
Замужны У. Астравок любві і веры: літоўцы ў Гервятах // Беларусь. 1994. № 5. С. 4—5.
З'езд беларусаў свету 8—10 ліпеня 1993 г. // Бел. мінуўшчына. 1993. № 3—4.
Іофэ Э. Яўрэі на Беларусі // Бел. гістар. часоп. 1996. № 1. С. 43—51.
Карнялюк К. Клуб цыганскай культуры // Культура. 1994. № 22. С. 14.
Купрэева Г. Мінскае гета: Схаваная праўда // Бел. мінуўшчына. 1993. № 2. С. 46—52.
Лукін В. Народы Прыбалтыкі на тэрыторыі Беларусі // Бел. гістар. часоп. 1994. № 4; 1995. № 2.
Маліноўскі М. Дзеці ветру: Цыганы на Беларусі // Бел. думка. 1993. № 6. С. 73—77.
На зямлі беларускай у згодзе: Рэкаменд. бібліяграф. спіс // Новыя кнігі Беларусі. 1994. № 9. Дадатак.
Рагалёў А. Гістарычная Літва на беларускіх землях // Бел. думка. 1993. № 6.
Скир А. Еврейская духовная культура в Беларуси: Историко-литературный очерк. Мн., 1995.

Славяне: адзінства і мнагастайнасць: Міжнародная канферэнцыя. Мн., 1990.

Сосіс І. Яўрэі на Беларусі // Спадчына. 1992. № 2. С. 75—81.

Станкевіч Я. Беларускія мусульмане і беларуская літаратура арабскім пісьмом // Спадчына. 1992. № 3. С. 90—95.

Тарасевіч Т. Палякі на Беларусі // Культура. 1994. 16 сак.

Терешкович П. Русские в Белоруссии // Неман. 1992. № 6. С. 164—176.

Хармут Л. Жизненное пространство на Востоке: Немцы в Белоруссии. 1941—1944 гг. // Неман. 1993. № 5.

Этнічныя працэсы і лад жыцця (па матэрыялах даследавання насельніцтва гарадоў БССР). Мн., 1980.

**Т а б л і ц а 1.2. Нацыянальны склад насельніцтва Беларусі (у %, паводле перапісаў)**[1]

| | 1897 г. | 1926 г. | 1959 г. | 1970 г. | 1979 г. | 1989 г.[2] |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | БССР у межах да 17.09.1939 г. | | | | | |
| Беларусы | 78,2 | 80,6 | 81,1 | 81,0 | 79,4 | 77,9 |
| Рускія | 4,9* | 7,7 | 8,2 | 10,4 | 11,9 | 13,2 |
| Палякі | 2,3 | 2,0 | 6,7 | 4,3 | 4,2 | 4,1 |
| Украінцы | ... | 0,6 | 1,7 | 2,1 | 2,4 | 2,9 |
| Яўрэі | 13,7 | 8,2 | 1,9 | 1,6 | 1,4 | 1,1 |
| Іншыя | 0,9 | 0,9 | 0,4 | 0,6 | 0,7 | 0,8 |

[1] БССР: Кароткая энцыклапедыя. Т. 4. Мн., 1981. С. 8.

[2] Народное хозяйство Республики Беларусь в 1991 г.: Стат. сб. Мн., 1995. С. 50.

* Рускія і ўкраінцы палічаны разам.

**Т а б л і ц а 1.3. Нацыянальны склад насельніцтва Беларусі (даныя перапісу насельніцтва ў 1989 г.)**[1]

| | тыс. чал. | у % да выніку |
|---|---|---|
| Усё насельніцтва | 10152 | 100 |
| Беларусы | 7905 | 77,9 |
| Рускія | 1342 | 13,2 |
| Палякі | 418 | 4,1 |
| Украінцы | 291 | 2,9 |
| Яўрэі | 112 | 1,1 |
| Іншыя | 84 | 0,8 |

[1] БССР в цифрах. 1989 г.: Крат. стат. сб. Мн., 1989. С. 5.

# Тэма 2

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ САМАСВЯДОМАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ

З гэтай тэмы пачынаецца паслядоўная і глыбокая характарыстыка рыс беларускага этнасу. Выкладчык, спасылаючыся на высновы па першай тэме, павінен растлумачыць этнічныя прыкметы большай часткі насельніцтва Беларусі, якія фарміраваліся на працягу жыцця некалькіх пакаленняў нашых суайчыннікаў; абагульніць веды навучэнцаў аб шляхах гістарычнага развіцця народаў, звяртаючы асаблівую ўвагу на фарміраванне беларускай нацыі, рысы яе самасвядомасці, шляхі ўдасканалення нацыянальнай свядомасці і самасвядомасці сучасных маладых грамадзян Беларусі.

Зыходзячы з адзначаных вышэй мэтаў, пажадана прадугледзець на вывучэнне гэтай тэмы 4 гадзіны, па дзве гадзіны на лекцыю і семінар. У лекцыі раім адзначыць наступныя пытанні:

1. Сутнасць нацыянальнай самасвядомасці і яе кампаненты.
2. З гісторыі станаўлення і развіцця беларускай мовы.
3. Нацыянальная самасвядомасць і праблемы сучаснага этапу нацыянальнага адраджэння.

Ажыццяўляючы ўласную падрыхтоўку да заняткаў па гэтай тэме, а таксама ва ўводзінах у лекцыю раім выкладчыку адзначыць, што праблема нацыянальнай самасвядомасці належыць да адной з найскладанейшых у сучаснай гуманітарнай навуцы.

Складанасць раскрыцця зместу тэмы для выкладчыка ў тым, што, па-першае, трэба спалучыць агульнафіласофскія падыходы з канкрэтнымі этналагічнымі, гістарычнымі, лінгвістычнымі і іншымі матэрыяламі аб фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў; па-другое, неабходна падмацаваць бытавыя падыходы навучэнцаў (пачуццё роднай беларускай зямлі, бацькоўскага дома, мовы, традыцый, абрадаў і інш.) на ўзроўні тэарэтычнага абагульнення ў выглядзе ведаў; па-трэцяе, паказаць праблемы новага пакалення людзей, звяртаючы асаблівую ўвагу на наш час.

Раскрыццё зместу лекцыі патрабуе даць азначэнне тым паняццям, што з'яўляюцца вузлавымі: свядомасць, самасвядо-

масць, нацыя, прыкметы (асаблівасці) этнасу, мова, яе функцыі і інш. Сутнасць гэтых і іншых паняццяў магла разглядацца на занятках па філасофіі, паліталогіі, сацыялогіі, таму пажадана ўлічваць міжпрадметныя сувязі ў прымяненні да канкрэтнай навучальнай установы.

Характарызуючы першы пункт лекцыі, раім выкладчыку адзначыць, што ў працэсе развіцця грамадства склалася структура групавой іерархіі, якая тлумачыцца патрэбнасцю людзей да выжывання, самавызначэння і спробай знайсці сваё месца ў шматлікім чалавечым калектыве. Чалавечыя групы магчыма вызначыць як на падставе біялагічных фактараў (расы, папуляцыі), так і на падставе сацыяльных (класы, прафесійныя групы, таварыствы па інтарэсах, этнічныя групы і г.д.). Фактычна для вылучэння асобных груп неабходны аб'ектыўныя прычыны, калі сярод людзей на падставе параўнальнага аналізу фарміравалася грамадскае супрацьпастаўленне «мы — яны», у тым ліку і адносіны этнічнага (нацыянальнага) характару.

Што ўяўляюць сабой паняцці «этнас» і «нацыя»?

**Этнас** (ад грэч. ethnos — племя, народ) — устойлівая супольнасць людзей, якая склалася гістарычна на пэўнай тэрыторыі і характарызуецца агульнасцю мовы, побыту, культуры, рысаў псіхікі і самасвядомасці, адлюстраванай у адзінай назве і ўяўленні пра агульнасць паходжання. Асноўнымі гістарычнымі формамі этнасу з'яўляюцца племя, народнасць, нацыя. Так, беларускі этнас у форме феадальнай народнасці сфарміраваўся ў XIV—XVI стст. (Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. Мн., 1989. С. 547).

**Нацыя** (ад лац. natio — племя, народ) — вышэйшая ступень самаарганізацыі этнасу, заканамерны вынік развіцця кансалідацыйных працэсаў. Выяўляецца ў кадыфікацыі мовы, стварэнні прафесійнай мастацкай культуры, сродкаў масавай інфармацыі, пашырэнні пісьменства на масавым узроўні, выпрацоўцы агульнаэтнічнай (нацыянальнай ) самасвядомасці, яе шырокім распаўсюджанні і засваенні. Працэсы кансалідацыі беларускай народнасці ў нацыю пачаліся ў XVI — пачатку XVII ст., актывізаваліся ў XIX ст. і дасягнулі найвышэйшага ўздыму ў 1910 — 1920-я гг. (Беларусь: Энцыкл. даведнік. Мн., 1995. С. 529). «Нацыяй можа называцца народ, прасякнуты сістэмай нацыянальных поглядаў і імкненняў, які ўсвядоміў сябе роўным з іншымі народамі і ўнёс значны ўклад у развіццё агульначалавечай культуры, цывілізацыі», — адзначала даследчыца Т. М. Мікуліч у кнізе «Мова і этнічная самасвядомасць» (Мн., 1996. С. 46).

У адзначаных дэфініцыях ёсць агульныя рысы, у тым ліку і паняцце этнічнай самасвядомасці. **Этнічная самасвядомасць** можа разглядацца як разнавіднасць самасвядомасці наогул. "Самасвядомасць — гэта яснае разуменне сваёй сутнасці, сваіх адметных уласцівасцей, сваёй ролі ў жыцці, грамадстве", адзначаецца ў Тлумачальным слоўніку беларускай мовы (Т. 5. Кн. 1. Мн., 1982. С. 44). Фактычна этнічная самасвядомасць уяўляе

сабой сістэму поглядаў, на падставе якіх адбываецца вылучэнне этнасам сябе з этнічнага свету (сукупнасці этнічных супольнасцей рознага парадку), усведамленне асноўных рыс і асаблівасцей свайго і іншых этнасаў.

Этнічную самасвядомасць прадстаўнікоў нацыі прынята называць **нацыянальнай самасвядомасцю**, якая структурна і змястоўна больш складаная за папярэднія тыпы этнічнай самасвядомасці (плямёнаў, народнасцей). Яна ўключае, па характарыстыцы акадэміка Ю. В. Брамлея, наступныя асноўныя кампаненты:

1) этнічную самаідэнтыфікацыю, выяўленую ў этноніме;

2) уяўленне аб агульнасці паходжання членаў этнасу, адзіным гістарычным мінулым;

3) уяўленне аб тыповых рысах сваёй супольнасці, яе ўласцівасцях і дасягненнях як цэлага;

4) усведамленне этнічных інтарэсаў (Бромлей Ю. В. Очерки теории этноса. М., 1983. С. 176, 183, 186).

Нацыянальная самасвядомасць існуе разам з іншымі відамі групавой самасвядомасці (полаўзроставай, рэлігійнай, прафесійнай, класавай і г.д.) і на некалькіх узроўнях: індывідуальным, калектыўным, грамадскім, бытавым, навуковым. Кожнае новае пакаленне, як сведчыць грамадская практыка, нанава пераасэнсоўвае асаблівасці сваёй супольнасці, фарміруе нацыянальную самасвядомасць у адпаведнасці з існуючай рэальнай сітуацыяй. У працэсе развіцця нацыі ўзбагачаецца яе свядомасць, павышаецца ўзровень самаарганізацыі, вызначаюцца лідэры, якія ўзначальваюць барацьбу за рэалізацыю нацыянальных інтарэсаў праз стварэнне незалежнай дзяржавы. Так, дзяржава беларускай нацыі была створана ў 20-я гады XX ст. і прайшла праз своеасаблівыя ступені БНР, БССР, Літоўска-Беларускай рэспублікі, БССР у складзе СССР да незалежнай Рэспублікі Беларусь.

Працэс развіцця этнасаў, у тым ліку і беларускага, суправаджаецца міграцыямі, актыўнымі міжэтнічнымі кантактамі і фарміраваннем у выніку новых этнічных утварэнняў, што робіць практычна немагчымым захаванне адназначнай (аднаўзроўневай) этнічнай самасвядомасці сярод усіх грамадзян сучаснай Беларускай дзяржавы.

Напэўна, гэту асаблівасць фарміравання нацыянальнай свядомасці і цяжкасць перадачы прыкмет свядомасці ад аднаго пакалення да другога адзначыў Я. Колас:

> ...Мой родны кут, лугі, крыніца!
> Цяпер для вас я — чужаніца.
> Той самы лес, палеткі тыя,
> Ды людзі там жывуць другія...*

* Колас Я. Новая зямля. Сымон-музыка: Паэмы. Мн., 1986. С. 9.

І таму вельмі важную ролю ў фарміраванні свядомасці беларусаў павінна выконваць нацыянальная дзяржава і яе інстытуты: адукацыйная сістэма, сродкі масавай інфармацыі, установы культуры і выхавання, а таксама сям'я, грамадскія арганізацыі, творчыя саюзы і інш. Адначасова дзяржава звяртае ўвагу на роўныя ўмовы для развіцця розных этнічных груп, што пражываюць на тэрыторыі рэспублікі сярод і разам з беларускай нацыяй.

Ва ўмовах сучаснага этапу развіцця сусветнага і еўрапейскага грамадства, калі сфарміраваліся транснацыянальныя карпарацыі, уніфікавалася матэрыяльная культура, распаўсюджваецца шмат у чым інтэрнацыянальная духоўная культура, галоўнае ў сістэме нацыянальнай самасвядомасці прыпадае на ўсведамленне нацыянальных інтарэсаў і арыентацыю на выпрацаваныя нацыяй нормы паводзін. Агульнанацыянальныя інтарэсы беларусаў, як і ўсёй Беларусі наогул, у значнай ступені могуць рэалізоўвацца праз дзяржаўную палітыку ўнутраную і знешнюю, забяспечваючы ўмовы паўнацэннага жыцця ўсяго беларускага грамадства, добрасуседскага суіснавання з іншымі народамі і дзяржавамі.

Такім чынам, магчыма падкрэсліць, што нацыянальная самасвядомасць уяўляе сабой складанае ўтварэнне, у якім сканцэнтраваны характэрныя асаблівасці этнасу: этнонім (саманазва), мова, культура, антрапалагічныя рысы (знешні выгляд, псіхіка), блізкасць гістарычнага мінулага, тэрыторыя пражывання і інш.

Адзначаныя вышэй асаблівасці трэба абавязкова растлумачыць на прыкладах развіцця беларускай нацыі: а) саманазва «беларусы» была прынята большасцю насельніцтва нашай Бацькаўшчыны на рубяжы XIX — XX стст., аб чым сведчаць вынікі перапісу насельніцтва 1897 г.; б) сучасная беларуская мова набыла літаратурную форму ў пачатку XX ст. (больш падрабязна пытанне аб мове разглядаецца па другому пункту лекцыі); в) па антрапалагічных рысах беларусы належаць да ўсходнееўрапейскага тыпу сярэднееўрапейскай расы (у межах вялікай еўрапеоіднай расы); антраполагі сведчаць аб пераемнасці фізічнага тыпу ў розных пакаленнях насельніцтва Беларусі, аб падабенстве антрапалагічнага тыпу беларусаў з рускімі, украінцамі, літоўцамі і латышамі ў сумежных з адпаведнымі дзяржавамі раёнах, што абумоўлена этнічнымі і генетычнымі сувязямі ў кантактных зонах (Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. Мн., 1989. С. 32); г) тэрыторыя пражывання беларусаў фарміравалася на працягу некалькіх стагоддзяў; этнічная тэрыторыя беларусаў больш за сучасную тэрыторыю Беларусі; на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь пражываюць, як адзначалася на занятках па першай тэме, не толькі беларусы, але і розныя этнічныя групы; д) асаблівасці нацыянальнай культуры адлюстраваліся ў народным і прафесійным мастацтве, традыцыйных абрадах, святах, фальклоры і інш.; е) агульнасць да-

лёкага і блізкага гістарычнага мінулага, калі беларускае насельніцтва супрацьстаяла палітыцы паланізацыі і русіфікацыі, зберагала свае карані ў гады войнаў і акупацый, адстойвала сумесна з іншымі народамі рэспублікі і былога СССР сваю свабоду ад фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны; таксама магчыма спаслацца і на іншыя прыклады-абагульненні.

У цяперашні час некаторыя этнографы адзначаюць, спасылаючыся на еўрапейскія падыходы, што для выяўлення этнічнай прыналежнасці індывіда прызнаецца дастатковым самаідэнтыфікацыя, адлюстраваная ў этноніме (іншыя прыкметы нават могуць адсутнічаць) або магчыма выкарыстанне толькі некаторых асноўных прыкмет, якія ў іншых часавых умовах могуць не з'яўляцца галоўнымі.

Па якіх жа прыкметах асоба мае магчымасць здзейсніць этнічную самаідэнтыфікацыю? Такое пытанне выкладчык можа задаць на лекцыі або на семінары. Асноўны пералік прыкмет (адначасова з саманазвай) прыкладна наступны: паходжанне, этнічная радзіма, знешні выгляд, мова; комплекс асаблівасцей культуры, побыту, традыцый, абрадаў; спецыфіка псіхічнага ўспрыняцця рэчаіснасці; агульнасць гістарычнага мінулага; агульнасць этнічных інтарэсаў з іншымі членамі этнічнай супольнасці і г.д.

Пажадана, каб у працэсе гутаркі з навучэнцамі выкладчык адзначыў, што прыкметы, на падставе якіх здзяйсняецца этнічная самаідэнтыфікацыя, не з'яўляюцца нязменнай сістэмай. Так, для кожнага асобнага слоя або сацыяльнай групы рашаючае значэнне могуць мець розныя прыкметы. Напрыклад, некаторыя прадстаўнікі беларускай літаратуры і культуры, удзельнікі палітычных нацыянальна-патрыятычных рухаў часта падкрэсліваюць важнейшае месца мовы сярод комплексу прыкмет, характарызуючых этнас. Але гэтае меркаванне выказваецца без уліку як сусветных тэндэнцый у развіцці моў, так і тых моў, што з'яўляюцца блізкароднаснымі.

Як магчыма зрабіць сувымярэнне, параўнанне нацыянальнай свядомасці беларусаў у розныя перыяды развіцця грамадства? На наш погляд, трэба прааналізаваць розныя тэндэнцыі развіцця нашага грамадства і іх уплыў на нацыянальную свядомасць, а таксама выкарыстаць звесткі сацыяльнай статыстыкі ў дынаміцы (аб нацыянальным складзе насельніцтва, суадносінах вясковых і гарадскіх жыхароў, выданні літаратуры і перыядычнага друку на розных мовах, выніках рэферэндумаў і г.д.).

У адносна маладой беларускай нацыі, якая сфарміравалася на рубяжы XIX — XX стст., працэсы складвання нацыянальнай свядомасці і самасвядомасці ажыццяўляліся ў вельмі складаных умовах. Так, неаднаразова змяняліся дзяржаўныя межы рэспублікі, калі ў склад БССР увайшлі ўсходнебеларускія землі і Заходняя Беларусь; палітыка беларусізацыі 20-х гадоў як па-

літыка нацыянальнага адраджэння адмаўлялася далейшым наступам таталітарнай сістэмы; адбыліся змены ў нацыянальным і сацыяльным складзе насельніцтва ў сувязі з войнамі, міграцыяй, рэпрэсіямі; працэс урбанізацыі як агульнасусветны закрануў амаль увесь беларускі этнас, і гарадское насельніцтва хутка перавысіла сельскае; змянілася роля сям'і ў перадачы этнічнага вопыту, роднай мовы; дзяржаўныя ўстановы адукацыі, культуры, інфармацыі не змаглі забяспечыць паўнавартасную трансляцыю міжпакаленнай этнакультурнай інфармацыі.

Нягледзячы на складаныя ўмовы развіцця і змяненні ў дзяржаўнай палітыцы на Беларусі ў часы існавання СССР, частка карэннага насельніцтва, у тым ліку і нацыянальнай інтэлігенцыі, працягвала працу па выхаванні нацыянальна-свядомых беларусаў праз вучэбныя заняткі, творчую дзейнасць народных і прафесійных мастацкіх калектываў, музеяў, сродкаў масавай інфармацыі, праз аднаўленне і зберажэнне культурнай і гістарычнай спадчыны, а таксама ў сем'ях. Гэта станоўча ўплывала на свядомасць часткі маладога пакалення беларусаў, што яскрава праявілася ў часы крызісу СССР і палітыкі КПСС.

Адносная самастойнасць асабістай нацыянальнай самасвядомасці прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі і моладзі праявілася ва ўмовах 80-х гадоў, калі лідэры КПСС абвясцілі спробу перабудовы савецкага грамадства. На Беларусі з мэтай пераадолення нацыянальна-культурнага заняпаду карэннага этнасу, адраджэння беларускай мовы і народнай культуры, аховы прыроды і гістарычных помнікаў утварыліся новыя нацыянальныя згуртаванні «Талака», «Паходня», «Мартыралог Беларусі», «Беларускі народны фронт», Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны, Экалагічны саюз і іншыя аб'яднанні, якія сваёй дзейнасцю прадоўжылі лепшыя традыцыі беларускага нацыянальнага руху. Адначасова на Беларусі ўзніклі і пачалі дзейнічаць нацыянальна-культурныя таварыствы розных нацыянальных груп: рускіх, украінцаў, татараў, літоўцаў, яўрэяў і інш.

Дзейнасць новых нацыянальных аб'яднанняў, некаторыя пазітыўныя змены ў накірунках і метадах работы дзяржаўна-партыйных структур, маладзёжных і грамадскіх фарміраванняў садзейнічалі палітычным зменам — прыняццю Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР (1990), скасаванню Дагавора аб утварэнні СССР, заснаванню Садружнасці Незалежных Дзяржаў (1991). У далейшым была прынята новая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (1994), ствараліся больш спрыяльныя ўмовы для развіцця беларускай мовы, вывучэння нацыянальнай гісторыі, літаратуры, мастацтва. Усё гэта станоўча ўплывала на складванне нацыянальнай свядомасці беларусаў і прадстаўнікоў іншых этнасаў.

Але ў фарміраванні нацыянальнай свядомасці і самасвядомасці беларусаў як часткі працэсу нацыянальнага адраджэн-

ня былі і ёсць свае ўздымы і спады. Так, значнае несупадзенне поглядаў нацыянальна свядомай часткі беларускага грамадства і асноўнай часткі насельніцтва выявілася на рэспубліканскіх рэферэндумах 1995 — 1996 гг. у адносінах да пытанняў аб мовах, дзяржаўнай сімволіцы і інш.

Падводзячы вынікі разгляду першага пытання лекцыі, выкладчык павінен падкрэсліць, што фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў з'яўляецца вынікам аб'яднальных этнаўтваральных працэсаў. Адзначаныя вышэй тэарэтычныя кампаненты нацыянальнай свядомасці ў наш час маюць патрэбу ў практычнай рэалізацыі. Шляхі і сродкі рэалізацыі гэтай праблемы ў час нацыянальнага адраджэння раскрывае выкладчык, звяртаючы ўвагу навучэнцаў на развіццё беларускай дзяржаўнасці, эканомікі, рэформу адукацыйнай сістэмы, аднаўленне нацыянальных культур, гістарычнай спадчыны, тапанімікі, моўную палітыку і інш.

Раім выкладчыку звярнуць увагу навучэнцаў (студэнтаў) на неабходнасць ведання і разумення таго, што нацыянальная свядомасць беларусаў прайшла ў сваім развіцці як этапы дэградацыі, так і адраджэння; «нацыянальная свядомасць большасці насельніцтва не была згублена пад уплывам ні прымусовых, ні натуральных асіміляцыйных працэсаў толькі дзякуючы таму, што самі народныя масы моцна трымаліся сваіх гістарычных каранёў, развівалі як маглі сваю духоўную спадчыну, свядома імкнуліся ад пакалення да пакалення размаўляць на мове бацькоў», — адзначыў Леанід Лыч у сваёй кнізе «Беларуская нацыя і мова» (Мн., 1994. С.25).

Гэта цытата дапаможа перайсці да разгляду пытання аб гісторыі беларускай мовы і яе сучасным стане.

Разглядаючы пытанне аб беларускай мове і яе асаблівасцях, выкладчык падкрэслівае значную ролю мовы як грамадскай з'явы, функцыі мовы, затым тлумачыць сутнасць беларускай мовы, асноўныя гістарычныя этапы яе развіцця, асаблівасці, узроўні, сучаснае становішча. Карысны матэрыял па гэтай праблематыцы змешчаны ў энцыклапедыі «Беларуская мова» (Мн., 1994), новай кнізе Н. Б. Мячкоўскай «Сацыяльная лінгвістыка» (Мн., 1996) і іншых выданнях па філалогіі.

Беларуская мова — гэта мова беларускага народа, які пераважна жыве на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Беларуская мова належыць да індаеўрапейскай моўнай сям'і і славянскай групы моў — да ўсходнеславянскай падгрупы (у якую таксама ўваходзяць руская і ўкраінская мовы); з'яўляецца блізкай да ўсіх славянскіх моў, якія склаліся гістарычна.

Паводле меркаванняў мовазнаўцаў, крыніцамі сучаснай беларускай мовы з'явіліся:

а) агульнаславянская мова — аснова, якая існавала прыкладна да VI — VII стст. і была агульнай для ўсіх славян;

б) старажытнаруская (усходнеславянская) мова, якая пачала фарміравацца ў VI ст. і ў далейшым (X — XII стст.) стала

дзяржаўнай у Кіеўскай Русі; на гэтай мове былі закладзены асновы пісьменнасці і створаны выдатныя помнікі літаратуры — «Слова аб палку Ігаравым», «Аповесць мінулых гадоў» і інш. Паводле меркавання расійскіх навукоўцаў, адзіная ўсходнеславянская мова — старажытнаруская існавала да XIV стагоддзя» (Филин Ф. П. Русский язык // БСЭ. Т. 22. М., 1975. С. 410);

в) мясцовыя гаворкі і дыялекты, якія фарміраваліся ў межах княстваў — Полацкага, Турава-Пінскага і інш. — на тэрыторыі будучай Белай Русі;

г) старажытная беларуская (старабеларуская) мова, якая ў XIII — XVI стст. выконвала ролю дзяржаўнай у Вялікім княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім і была мовай беларускай народнасці. У XIV ст. мова мела ўсе асноўныя рысы, характэрныя і для сучаснай беларускай мовы.

На гэтай мове да канца XVII ст. вялі справаводства, пісалі дыпламатычныя дакументы, зборнікі законаў «Статуты ВКЛ», летапісы, мастацкія творы, рэлігійныя тэксты, вучэбныя кнігі, надрукаваў кнігі беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар Ф. Скарына.

У далейшым, калі дзяржаўную ролю на нашай тэрыторыі выконвалі польская (XVII — XVIII стст.) і руская (XIX — 20-я гады XX ст.) мовы, беларуская мова заставалася як народная. На этапе фарміравання беларускай нацыі (на рубяжы XIX — XX стст.) беларускую мову актыўна выкарыстоўвалі ў літаратурнай форме пісьменнікі, паэты, публіцысты (В. Дунін-Марцінкевіч, Ф. Багушэвіч, Э. Пашкевіч, М. Багдановіч, Я. Купала, Я. Колас і інш.), а таксама даследавалі вучоныя-мовазнаўцы (Я. Карскі, Б. Тарашкевіч, К. Каганец і інш.). Кожны пісьменнік абапіраўся на сваю родную гаворку, у якой сустракаліся шматлікія дыялектныя асаблівасці (фанетычныя, граматычныя, лексічныя).

Сучасная беларуская літаратурная мова — гэта ўпрацаваная, унармаваная мова, якая абслугоўвае ўсе формы дзейнасці людзей — культурнае і грамадскае жыццё. Гэта мова мастацкай літаратуры, навукі, публіцыстыкі, навучальных устаноў, сродкаў масавай інфармацыі. Літаратурная мова мае дзве формы — вусную і пісьмовую.

Нормы сучаснай літаратурнай мовы грунтуюцца на заканамернасцях развіцця роднай мовы і пачалі выпрацоўвацца стыхійна. Першую граматыку падрыхтаваў і выдаў у 1918 г. вядомы вучоны-філолаг, пісьменнік, грамадскі дзеяч Б.Тарашкевіч. «Граматыка для школ» Б. Тарашкевіча заклала асновы норм сучаснай беларускай мовы.

Беларуская мова існуе як на літаратурным узроўні, так і на дыялектным. Дыялектная мова мае асаблівасці: выкарыстоўваецца насельніцтвам пэўнай тэрыторыі (адной вёскі ці некалькіх населеных пунктаў), як бытавая мова (сям'і, аднавяскоўцаў), існуе ў вуснай форме. На Беларусі вызначаюцца два

дыялекты: паўночна-ўсходні і паўднёва-заходні, а паміж імі — сярэднебеларускія гаворкі, якія найбольш блізкія да сучаснай беларускай мовы.

Літаратурная мова і дыялекты цесна звязаны паміж сабой і аказваюць узаемнае ўздзеянне (напрыклад, на напаўненне слоўніка і норм літаратурнай мовы).

Выкладчыку рэкамендуецца падкрэсліць, што больш за 200 гадоў (XVIII — XIXстст., частка XX ст.) беларусы мелі вельмі абмежаваныя магчымасці для развіцця роднай мовы. Выказваючы крытычныя заўвагі адносна палітыкі царызму на Беларусі, пажадана адзначыць тыя прыклады, якія сведчаць і аб уліку ўладамі нацыянальных асаблівасцей. Так, некаторы час існавалі Беларуская губерня і Беларуская епархія, беларускія палкі ў расійскай арміі; дзейнічалі беларускія выдавецтвы ("Загляне сонца і ў наша аконца", "Наша Ніва"), друкавалася беларускамоўная літаратура (у 1908 — 1914 гг. выйшла ў свет 77 беларускіх кніжак агульным тыражом 227 тыс. экземпляраў); вяліся навуковыя даследаванні па беларускай мове, этнаграфіі, фальклору (напрыклад, з 1903 г. пачала друкавацца вялікая праца Я.Карскага "Беларусы", у 1916 г. ён быў абраны членам-карэспандэнтам Пецярбургскай Акадэміі навук). Такі падыход "дасць магчымасць больш аб'ектыўна асэнсаваць і нашу нацыянальную гісторыю", — адзначаў член-карэспандэнт Акадэміі навук Беларусі П. Петрыкаў (Настаўніцкая газета. 1995. 29 сак. С. 3).

Вельмі сур'ёзны непакой за будучае беларускага народа, яго культуры і мовы выказаны ў 1891 г. Францішкам Багушэвічам у словах прадмовы да зборніка вершаў "Дудка беларуская": "Шмат было такіх народаў, што страцілі наперш мову сваю, так як той чалавек прад скананнем, катораму мову займе, а потым і зусім замерлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмерлі!" (Багушэвіч Ф. Творы. Мн., 1991. С. 17).

У 20-я гады XX ст. — пасля рэвалюцыйных падзей 1917 г. — пачалося ажыўленне беларускіх палітычных рухаў, сфарміравалася нацыянальная дзяржаўнасць, беларуская мова стала дзяржаўнай і быў узяты курс на беларусізацыю — нацыянальнае адраджэнне. У часы адраджэння савецкай уладай на падставе нацыянальнай палітыкі КПБ былі створаны ўмовы для развіцця беларускай мовы, на якой працавалі дзяржаўныя ўстановы і грамадскія арганізацыі, сістэма адукацыі і друк, выдаваліся мастацкія і навуковыя творы.

Але ўжо ў 30-я гады — часы сталінскага тэрору — ажыўленне беларускай культуры было спынена. Цэнтральныя ўлады аўтарытарна-таталітарнага рэжыму знішчалі на Беларусі нацыянальна-свядомых палітычных і грамадскіх дзеячаў, работнікаў культуры і асветы, многіх простых людзей; змяншалася выкарыстанне беларускай мовы ў органах улады, культурна-асветніцкіх установах, у гарадскім асяроддзі; значна скарачалася выданне літаратуры і перыёдыкі на беларускай мове.

Некаторае ажыўленне ў развіцці і выкарыстанні беларускай мовы адбылося пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР, у гады Вялікай Айчыннай вайны і пасля яе заканчэння. Але ў далейшым (у 50—70-я гады) з'явіліся некаторыя супярэчнасці нацыянальна-культурнага развіцця, і выкарыстанне беларускай мовы значна скарачалася — яе перасталі ўжываць у партыйна-дзяржаўных структурах, вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, значна зменшылася колькасць беларускіх школ (так, у Мінску ў 1945/46 навучальным годзе з 28 школ 14 былі беларускамоўнымі, а ўжо ў 1952/53 навучальным годзе з 46 школ толькі 9 былі беларускамоўнымі; 29 раённых цэнтраў Заходняй Беларусі не мелі ў 1952/53 навучальным годзе беларускамоўных школ // Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 2. С. 362).

Значныя перамены ў саюзным і беларускім грамадстве на рубяжы 80—90-х гадоў, неабходнасць нацыянальнага адраджэння прывялі да гістарычнай падзеі ў жыцці беларускага народа, калі 26 студзеня 1990 г. быў прыняты Закон "Аб мовах у Беларускай ССР". У адпаведнасці з ім беларуская мова зноў стала дзяржаўнай. У законе падкрэслівалася, што Беларусь забяспечвае права свабоднага карыстання рускай мовай як мовай міжнацыянальных зносін; адзначалася, што, забяспечваючы ўсебаковае развіццё і функцыяніраванне беларускай мовы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, рэспубліка праяўляе дзяржаўны клопат аб свабодным развіцці і ўжыванні ўсіх нацыянальных моў, якімі карыстаецца насельніцтва Беларусі (Закон БССР «Аб мовах у Беларускай ССР». Мн., 1990. С. 5).

Некаторыя зрухі ў адраджэнні беларускай мовы адбыліся на падставе рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў, што была прынята Урадам БССР 20 верасня 1990 г. Так, некалькі пашырылася сфера ўжывання беларускай мовы ў службовым справаводстве органаў улады, на прадпрыемствах і ва ўстановах; у навучальных установах створаны беларускамоўныя класы, групы; быў павялічаны аб'ём гадзін на вывучэнне беларускай мовы, літаратуры, гісторыі і г. д. Але адраджэнне беларускай мовы як мовы большасці насельніцтва рэспублікі праходзіць даволі марудна, што тлумачыцца шэрагам прычын палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, культурнага характару. Не стымулююць стварэнне беларускамоўнага асяроддзя і вынікі рэспубліканскага рэферэндуму 14 мая 1995 г., калі большасць насельніцтва выказалася за роўны, аднолькавы статус беларускай і рускай моў.

Асноўныя аспекты сучаснай моўнай палітыкі былі прапанаваны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкам у выглядзе змяненняў і дапаўненняў да Канстытуцыі РБ 1994 г. і зацверджаны на рэферэндуме 24 лістапада 1996 г. Так, у артыкуле 17 Канстытуцыі РБ адзначаецца: «Дзяржаўнымі мовамі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца беларуская і руская мовы» (Сов. Белоруссия. 1996. № 217. С. 2).

Беларуска-рускае двухмоўе з перавагай рускай мовы ў большасці насельніцтва характарызуюць асаблівасць сучаснага этапу развіцця нашага грамадства, калі сутыкнуліся ў часе працэсы нацыянальнага адраджэння і інтэрнацыянальных умоў выжывання і прагрэсу. Садзейнічаць далейшаму пашырэнню выкарыстання беларускай мовы і нацыянальнаму адраджэнню змогуць новыя пакаленні і шырокія народныя масы, якія праз нейкі гістарычны час вернуцца да сваіх духоўных і культурных традыцый ва ўмовах паляпшэння жыцця, пераадолення крызісных з'яў.

Абагульняючы разгляд пытанняў па гэтай тэме, выкладчык павінен падкрэсліць, што адзначаныя элементы нацыянальнай самасвядомасці, якія ў значнай ступені фарміруюцца ў наш час, абавязкова трэба спалучаць з агульначалавечымі каштоўнасцямі, з філасофіяй мірнага суіснавання і сумеснага выжывання. У адваротным выпадку шляхі нацыянальнага адраджэння могуць прывесці да нацыянальнай замкнёнасці, этнаэгаізму, варожых адносін да іншых этнічных супольнасцей. Такім чынам, пажадана ўлічваць гэтыя аспекты ў сацыяльнай практыцы — да такой высновы выкладчыку трэба падвесці навучэнцаў.

У мэтах завяршэння вывучэння тэмы раім прапанаваць навучэнцам кантрольныя пытанні і рэфераты да семінара. У працэсе падрыхтоўкі да семінара маецца магчымасць выкарыстаць рэкамендацыйныя бібліяграфічныя спісы «Постаці беларускага Адраджэння» (Новыя кнігі Беларусі. 1994. № 2, 3) і "Наша родная мова" (Новыя кнігі БССР. 1991. № 6), якія падрыхтаваны і выдадзены Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі.

## Кантрольныя пытанні:

1. Як Вы разумееце паняцце "нацыянальная самасвядомасць"?
2. Якія абавязковыя кампаненты характарызуюць нацыянальную самасвядомасць беларусаў?
3. Якімі сродкамі (шляхамі) можа фарміравацца і ўдасканальвацца нацыянальная самасвядомасць беларусаў?
4. Калі і на якой падставе (аснове) сфарміравалася сучасная беларуская мова?
5. Каго з дзеячаў беларускай культуры і чаму называюць заснавальнікамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы?
6. У чым сутнасць палітыкі беларусізацыі 20—30-х гадоў?
7. Якія накірункі мае сучасны этап нацыянальнага адраджэння?
8. Якія праблемы існуюць, на Ваш погляд, у працэсе фарміравання нацыянальнай свядомасці беларусаў у сучасных умовах?

## Тэматыка рэфератаў:

1. Фанетычныя (лексічныя) асаблівасці беларускай мовы.
2. З гісторыі выдання беларускага «Буквара».
3. Зараджэнне беларускай літаратуры і яе ўплыў на фарміраванне нацыянальнай свядомасці.
4. Газета «Наша Ніва» і яе роля ў нацыянальным адраджэнні ў пачатку XX ст.
5. Дзеячы нацыянальнага адраджэння: В. Ластоўскі, У. Ігнатоўскі, Б. Тарашкевіч, Я. Карскі, І. Буйніцкі, А. і І. Луцкевічы, М. Гарэцкі, А. і М. Багдановічы, Я. Купала, Я. Колас і інш.
6. «Беларусы» Я.Карскага — выдатная праца беларускага філолага і этнографа.
7. Рэформа беларускага правапісу 1933 г.: накіраванасць, змены, вынікі.
8. Праблемы фарміравання нацыянальнай свядомасці беларусаў і шляхі іх вырашэння ў сучасных ўмовах (па артыкулах і публіцыстыцы В. Быкава, Н. Гілевіча, Л. Лыча і інш.).
9. Беларуская тапаніміка (гідраніміка).

## Практычныя заданні:

1. Мой горад (вёска, раён, край) у казках, паданнях, гісторыі.
2. Дыялектычныя асаблівасці беларускай мовы ў месцах пастаяннага жыхарства навучэнцаў, студэнтаў.
3. Фальклорныя запісы: песні, казкі, легенды, паданні, калыханкі, забаўлянкі, лічылкі, дражнілкі, анекдоты, жарты і г.д. (па месцы жыхарства студэнтаў).
4. Скласці разгорнутую карціну нацыянальнага характару беларуса (па літаратурных творах У.Караткевіча "Зямля пад белымі крыламі", Я. Коласа "Новая зямля", В.Быкава, І.Мележа, І.Чыгрынава).
5. Як і калі ўтварылася мая вёска (горад, мястэчка і г.д.)? Як мясцовыя жыхары тлумачаць паходжанне назвы?
6. Даследчыцкая работа па карце Беларусі, тлумачэнне ўзнікнення назваў мясцовасці.

## ЛІТАРАТУРА:

### Асноўная


Абабурка М. В. Культура беларускай мовы. Мн., 1994.

Акулов В. Можно ли приватизировать патриотизм? // Нар. газ. 1994. 15 крас. С. 2.

Аповесць мінулых гадоў / Пер. са старажытнарускай мовы У. Кароткага // Беларусь. 1991. № 8. С. 30—32.

Белорусизация: 20—30-е годы // Сов.Белоруссия. 1989. 27 марта. С. 2.

Беларуская мова: Энцыклапедыя / Пад рэд. А. Я. Міхневіча. Мн., 1994.

Бірыла М. В. Беларуская антрапанімія. Мн., 1982.

Гілевіч Н. С. Любоў прасветлая: Роздумы ў вершах і прозе аб роднай мове. Мн., 1996.

Грыцкевіч В. Гісторыя, самасвядомасць, этнас // Маладосць. 1994. № 3—4.

Дубянецкі Э. С. Беларускі нацыянальны характар: спробы даследавання // Адукацыя і выхаванне. 1995. № 5. С. 29—39.

Жураўлёў В. П. На шляху духоўнага самасцвярджэння. Мн., 1995.

Жучкевич В. А. Общая топонимика. 3-е изд. Мн., 1980.

Запрудский С. Человек из прошлого или почему трудно стирать «белые пятна» в истории белорусского языкознания // Неман. 1991. № 6.

Казакова І. В. Этнічныя традыцыі ў духоўнай культуры беларусаў. Мн., 1995.

Конан У. Беларускае нацыянальнае Адраджэнне: Аналіз паняцця // Звязда. 1992. 6 лют.

Кулажэнка Л. Я. Краязнаўства ў выхаванні нацыянальнай самасвядомасці студэнтаў // Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці студэнтаў. Мн., 1993. С. 11—12.

Культурная спадчына ў фарміраванні нацыянальнай свядомасці народа: Матэрыялы да навукова-тэарэтычнай канферэнцыі. Мн., 1994.

Лексічны атлас беларускіх народных гаворак: У 5 т. / Пад рэд. М. В. Бірылы і Ю. Ф. Мацкевіч. Т. 1. Мн., 1993; Т. 2. Мн., 1994.

Лозка А. Беларусафобія — гэта хвароба, якую трэба лячыць // Нар. газ. 1994. 14—16 мая. С. 2.

Лукашанец А. Мова Купалы — жывая мова // Бел. думка. 1994. № 4.

Лыч Л. Беларуская нацыя і мова: Літаратурна-гістарычныя нарысы. Мн., 1994.

Лыч Л. М. Назвы зямлі беларускай. Мн., 1994.

Лыч Л. М. Нацыянальная самасвядомасць беларусаў: дэградацыя і адраджэнне // Літ. і мастацтва. 1990. № 15—17.

Мартынаў В. К. У мовы роднай моцнае карэнне: Беларуская мова сярод іншых славянскіх і неславянскіх моваў // Роднае слова. 1993. № 1—2.

Мікуліч Т. М. Мова і этнічная самасвядомасць. Мн., 1996.

Мова — важнейшы атрыбут дзяржаўнасці: Гутарка дырэктара Інстытута мовазнаўства А. І. Падлужнага і кар. газеты А. Зэкава // Добры вечар. 1992. 11 жн. С. 2.

Мяльгуй А. Фальклор, рок і нацыянальная свядомасць// Беларусь. 1992. № 12. С. 16—17.

Падлужны А. Хто стварае моўны хаос? // Бел. думка. 1996. № 8. С. 181—184.

Салееў В. А. Нацыянальная самасвядомасць і мастацкая культура. Мн., 1990.

Филин Э. Происхождение русского, украинского и белорусского языков: Историко-диалектологический очерк. Л., 1972.

Філякоў У. Нацыянальная інтэлігенцыя і самасвядомасць беларусаў: канец XIX — пачатак XX ст. // Мастацтва. 1994. № 2. С. 2—4.

Шамякіна Т. Вытокі нашай самасвядомасці // Роднае слова. 1993. № 8.

Што трэба ведаць кожнаму беларусу? / Зб. артыкулаў М. Міцкевіча, Я. Лёсіка, В. Ластоўскага і інш. Мн., 1918—1992.

Шур В. З гісторыі ўласных імёнаў. Мн., 1993.

Яшкін І. Мова дыялектная — мова родная! // Роднае слова. 1992. № 3.

Янкоўскі Ф.М. Гістарычная граматыка беларускай мовы. Мн., 1989.

## Дадатковая

Адраджэнне: Гістарычны альманах. Вып. 1. Мн., 1995.

Беларуская мова: Вучэбны дапаможнік для педагагічных ВНУ/ Пад рэд. Л. М. Грыгор'евай. Мн., 1994.

Воўк-Левановіч О. В. Лекцыі па гісторыі беларускай мовы. Мн., 1994.
Жучкевіч В. А. Чаму так названа? (Аб геаграфічных назвах). Мн., 1969.
Запрудский С. Языковая гармония: белорусский вариант // Неман. 1996. № 8. С. 192—210.
Казбярук У. Прарок беларускага адраджэння: Аб Я.Купале // Полымя. 1993. № 10.
Каўрук А. Пяром душа вадзіла: Якуб Колас і беларуская літаратурная мова // Роднае слова. 1992. № 1—2.
Лакотка А. Напісанае застаецца, або Пра тое, дзе бяруць пачатак нацыянальныя хронікі і летапісы // Беларусь. 1991. № 10. С. 14—15.
Лыч Л. Беларусізацыя: 20—30-я гады // Маладосць. 1995. № 11. С. 187—211; № 12. С. 197—207.
Лыч Л. З нацыянальнага жыцця Беларусі (верасень 1943 — май 1945 гадоў) // Полымя. 1994. № 8. С. 198—214.
Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. Мн., 1996.
Маліноўскі М. Версіі назваў Мінска // Наст. газ. 1994. 23 крас. С. 4.
Наркевіч А. Карыфей славістыкі: Аб Я.Ф.Карскім // Беларусь. 1993. № 2. С. 24—25.
Станкевіч С. Русіфікацыя беларускай мовы ў БССР і супраціў русіфікацыйнаму працэсу / Уклад. Зм. Санько. Мн., 1994.
Сяльвёрстава С. Я. Ад паланізацыі – да русіфікацыі: Старонкі гісторыі моўнай сітуацыі ў 30—60-х гг. XIX ст. // Адукацыя і выхаванне. 1995. № 1. С. 88.
Хабургаев Г. Этнонимика "Повести временных лет". Мн., 1979.
Шавыркін М. Мова – душа народа // Роднае слова. 1993. № 11.
Шакун Л. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы. Мн., 1994.
Шакун Л. М. Гісторыя беларускага мовазнаўства. Мн., 1995.
Шаруха І. Беларускія назвы ў Антарктыдзе // Спадчына. 1994. № 2.
Шкраба Р. Энергія слова: Літаратурна-крытычныя артыкулы. Мн., 1988.

# Тэма 3

# СУВЯЗІ БЕЛАРУСАЎ З СУСЕДНІМІ КРАІНАМІ. БЕЛАРУСЫ ЗА МЯЖОЮ

У гэтай тэме выкладчык завяршае тлумачэнне вывадаў першай тэмы аб этнагенезе беларусаў і фарміраванні іх этнічных зямель.

Матэрыял гэтай тэмы даволі значны па зместу і аб'ёму, таму трэба звярнуць асаблівую ўвагу на некалькі наступных пытанняў:

1. Суадносіны этнічных зямель беларусаў і дзяржаўнай тэрыторыі (БНР, Літ.-Бел. ССР, БССР, РБ).

2. Беларуская дыяспара і яе сувязь з Радзімай. Эміграцыя з Беларусі: прычыны, накірункі, хвалі.

Раскрыццё першага пытання патрабуе не толькі гісторыка-этнаграфічнага і палітычнага аналізу, але і добрага ведання карты, па якой трэба будзе параўноўваць этнічныя межы беларусаў і тых дзяржаў, якія зараз існуюць на гэтай зямлі. Далёка не кожны з навучэнцаў ведае, як праводзіліся гэтыя межы на працягу больш чым тысячагадовай гісторыі нашай Радзімы. Таму рэкамендуецца падрыхтаваць карты-схемы на падставе тых матэрыялаў, якія фактычна ўпершыню змешчаны ў кнігах Я.Шыраева "Беларусь: Русь Белая, Русь Чёрная и Литва в картах" (Мн., 1991), Л. Казлова і А. Цітова "Беларусь на сямі рубяжах" (Мн., 1993).

Пры разглядзе другога пытання выкладчык звяртае ўвагу навучэнцаў на тое, што і за сучаснай дзяржаўнай мяжой Рэспублікі Беларусь — у блізкім і далёкім замежжы — пражываюць беларусы.

Разглядаючы змест пытання, выкладчыку пажадана растлумачыць наступныя паняцці: д ы я с п а р а (грэч. diaspora) — пражыванне народа за межамі сваёй этнічнай тэрыторыі; м і г р а ц ы я (лац. migratio — перамяшчэнне) — перасяленне, пераезд людзей на новае месца жыхарства ўнутры краіны або за яе межы; э м і г р а ц ы я (лац. emigratio) — перасяленне людзей з краіны, дзе яны жылі, у чужую краіну па палітычных, эканамічных, рэлігійных ці іншых прычынах і прабыванне там пасля перасялення (Булыка А. М. Слоўнік іншамоўных слоў. Мн., 1993. С.213, 388).

Праблемы міграцыі насельніцтва Беларусі ў межах былой Расіі і СССР у значнай ступені разглядаліся ў першай тэме як унутрыдзяржаўныя працэсы, таму пажадана праз гутарку з навучэнцамі нагадаць прычыны і накірункі выездаў насельніцтва. Гэта дапаможа ажыццявіць лагічны пераход да тлумачэння паняцця "эміграцыя", прычын эміграцыі, яе накірункаў. Рэкамендуецца адзначыць, што ў розныя гістарычныя перыяды па эканамічных, палітычных, рэлігійных, ваенных і іншых прычынах насельніцтва беларускіх зямель перасялялася ў іншыя рэгіёны дзяржавы ці замежныя краіны.

Найбольшая колькасць нашых землякоў выехала за межы Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст. Гэта была ў асноўным эканамічная эміграцыя, і часткова — рэлігійная. На жаль, нацыянальная самасвядомасць гэтых беларусаў была не вельмі высокая і як вынік яны або асіміляваліся, або паводле рэлігійнай прыналежнасці далучыліся да рускіх ці палякаў.

Другая эміграцыйная хваля — паміж першай і другой сусветнымі войнамі — не была такой шматлікай, як у пачатку XX ст., але адрознівалася якасна — гэта была ў асноўным палітычная эміграцыя, калі актыўная частка дзеячаў былой БНР пачала арганізоўваць беларусаў у розных дзяржавах: ЗША, Чэхаславакіі, Аргенціне, Канадзе і г.д.

Абагульняючыя звесткі аб эміграцыі змешчаны ў табліцах 3.1 і 3.2, якія раім выкарыстаць на занятках па тэме.

У час лекцыі пажадана падкрэсліць, што не ўсе беларусы, якія пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь, з'яўляюцца эмігрантамі або мігрантамі. Так, значная частка беларусаў жыла і жыве зараз на сваіх этнічных землях, якія ў XX ст. (не ў першы раз!) апынуліся ў складзе іншых дзяржаў: Расіі, Польшчы, Літвы, Латвіі. Напрыклад, беларусы кампактна жывуць на памежжы суседніх дзяржаў — на Беласточчыне, Віленшчыне, Латгальшчыне, Пскоўшчыне, Смаленшчыне, Браншчыне. Варта адзначыць, што яны там не эмігранты, а спрадвечныя жыхары на сваёй этнічнай зямлі.

У пачатку 90-х гадоў XX ст. за межамі Рэспублікі Беларусь пражывала 3 — 3,5 млн беларусаў (Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 2. С. 503). Выкладчыку пажадана выдзеліць тыя прычыны, якія ўплываюць на пакіданне карэнным насельніцтвам сваёй Бацькаўшчыны, накірункі эміграцыі, яе этапы. Цікавыя звесткі па гэтых пытаннях змешчаны ў публікацыі Г. Сяргеевай "Бацькаўшчына і дыяспара: эвалюцыя ўзаемаадносінаў і сучасныя праблемы" (Беларуская думка. 1993. № 3. С.84—86), у брашурах Б.Сачанкі "Беларуская эміграцыя" (Мн., 1991) і Т. Антонавай "У землякоў за акіянам" (Мн., 1992), у зборніках "Культура беларускага замежжа" (Мн., 1993), у "Нарысах гісторыі Беларусі" (Ч. 2. Мн., 1995. С. 488—506). Гэтыя выданні могуць выкарыстаць як выкладчык, так і навучэнцы, студэнты. Свае погляды на эміграцыю насельніцтва з Беларусі выказваюць і былыя беларусы, якія ў наш час з'яўляюцца грамадзянамі іншых

краін — А. Калубовіч, В. Кіпель, М. Сяднёў і інш. (Творы, даследаванні, мемуары гэтых і іншых аўтараў-эмігрантаў адзначаны ў спісах літаратуры да тэм 3 і 6.)

Пра нашых суайчыннікаў за мяжой магчыма адзначыць некаторыя асаблівасці:

1) беларусы за мяжой вызначаюцца імкненнем да кампактнага рассялення (напрыклад, у ЗША у штаце Айова знаходзіцца горад Су-Сіці, 80% насельніцтва якога складаюць выхадцы з Капыля і Капыльскай воласці);

2) большая частка беларусаў жыве ў гарадах (ЗША — Нью-Йорк, Вашынгтон; Аргенціна — Буэнас-Айрэс, Санта-Фе; Польшча — Беласток і г.д.);

3) беларусы за мяжой больш хутка, чым іншыя славянскія народы, моўна і этнічна асімілююцца (у першую чаргу з палякамі і рускімі) — аб гэтым пісалі С. Польскі і С. Мацюнін (ЛіМ. 1989. 3 сак. С. 5, 12);

4) "Беларуская эміграцыя, — па словах палітолага Л. Лойкі, — не такая ўплывовая на Захадзе, як яўрэйская, не такая кансалідаваная, як армянская, не такая актыўная, як польская" (Бел. думка. 1993. № 3. С. 86).

Цікавасць беларусаў замежжа да Рэспублікі Беларусь узрастае асабліва ў апошнія гады, калі наша дзяржава стала самастойнай і незалежнай. Канкрэтнымі прыкладамі сувязей з'яўляецца наладжванне культурных і эканамічных адносін, стварэнне грамадскіх фарміраванняў — згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына", нацыянальна-культурных фондаў. Сведчаннем пазітыўных зрухаў у адносінах да беларускай дыяспары стала прыняцце дзяржаўнай праграмы "Беларусы ў свеце", правядзенне ў Мінску першага сходу беларусаў блізкага замежжа (1992) і першага з'езда беларусаў свету (1993). Пашырэнню дыялога і сувязей з беларускай дыяспарай павінны садзейнічаць кансалідацыі нацыі ў новых гістарычных умовах. Гэтымі вывадамі можна завяршыць заняткі па тэме.

У мэтах падрыхтоўкі студэнтаў да семінара раім прапанаваць кантрольныя пытанні, адзін-два рэфераты, практычныя заданні. Карысны спіс літаратуры "Беларусы на карце свету", надрукаваны ў дадатку да бюлетэня "Новыя кнігі Беларусі" (1995. №8).

### Кантрольныя пытанні:

1. Што ўяўляюць сабой этнічныя землі беларусаў?

2. Калі завяршыўся працэс фарміравання этнічнай тэрыторыі беларусаў?

3. Як суадносяцца паміж сабой этнічныя землі беларусаў і тыя тэрыторыі, якія ўваходзілі ў дзяржаўныя межы БНР, Літ.-Бел. ССР, БССР?

4. Як паўплывалі на лёс этнічных зямель беларусаў вынікі перагавораў у Брэсце (1918 г.), Рызе (1920—1921 гг.), Маскве (жнівень—верасень 1939 г.)?

5. Калі стабілізавалася дзяржаўная мяжа нашай рэспублікі?

6. У якіх міждзяржаўных і міжнародных дакументах адзначаецца непарушнасць межаў Рэспублікі Беларусь?

7. Якія прычыны прывялі частку беларусаў да лёсу эмігрантаў?

8. Дзе існуе беларуская дыяспара?

9. Якія асноўныя этапы (перыяды) адзначаюцца ў беларускай эміграцыі?

10. Як ажыццяўляюцца сувязі паміж беларускай эміграцыяй і Бацькаўшчынай?

11. Дзе за мяжой існуюць (і якія?) цэнтры дзейнасці эмігрантаў з Беларусі?

12. Хто Вам вядомы з дзеячаў беларускай эміграцыі?

13. У чым сутнасць дзейнасці згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына"?

14. Якія прыклады сведчаць аб сувязях Беларусі з беларусамі, якія жывуць у іншых дзяржавах?

15. Як, на Ваш погляд, паўплывалі змяненні дзяржаўнай мяжы Беларусі на нацыянальную самасвядомасць беларусаў?

## Тэматыка рэфератаў:

1. Параўнальны аналіз суадносін этнічных зямель беларусаў і сучаснай тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.
2. Гісторыя Беларусі і лёс Віленскага краю.
3. Беларуская дыяспара і свет.
4. Беларусы ў Польшчы.
5. Беларусы ў Расійскай Федэрацыі.
6. Беларуская эміграцыя: прычыны, накірункі.
7. Дзеячы беларускай эміграцыі.

## Практычныя заданні:

1. Скласці табліцу рассялення беларусаў у блізкім і далёкім замежжы, прааналізаваць лічбы за розныя гады, выдзеліць тэндэнцыі.
2. Намаляваць карту "Этнічныя землі беларусаў".
3. Правесці параўнальны аналіз этнічных зямель беларусаў і сучаснай тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.
4. Прааналізаваць па атласах этапы фарміравання тэрыторыі беларускай нацыянальнай дзяржавы — БНР, БССР, скласці карту-схему.
5. Выдзеліць і сістэматызаваць прычыны эміграцыі беларусаў са сваёй этнічнай зямлі.

# ЛІТАРАТУРА:

## Асноўная

Алехнік А. Кароткі нарыс аб беларусах у Аўстраліі // Беларусь. 1993. №6. С. 8—9.

Беларусы: Этнагеаграфія. Дэмаграфія. Дыяспара. Канфесіі: Атлас / Рэд. кал.: С. А. Польскі і інш. Мн., 1996.

Біч М. В. Нацыянальны склад прамысловага пралетарыяту Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст. // Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. 1972. №4.

Бушэнка М. Цвіце ў Эстоніі бэз: Аб беларусах у Эстоніі // Беларусь. 1993. № 6. С. 4—6, 11.

Васілеўскі Ю. Беларусы на абшарах Расіі. 1915—1918 гг. // Голас Радзімы. 1994. 28 ліп. С. 4.

Глагоўская Г. Беларусы ў Гданьску // Спадчына. 1995. № 4.

Дварчанін І. Беларусы на Пражскім універсітэце // Крыніца. 1995. № 3. С. 36—39.

Дубовец С. Белорусы возвращаются в Европу // Неман. 1992. № 10. С.156—160.

Зайкоўскі Э. Беларусы ў старажытнай Вільні // Спадчына. 1990. № 1.

Карлікевіч А. Беларусь за межамі Беларусі // Наст. газ. 1994. 20 ліп. С. 2.

Кіпель В. Беларусы ў ЗША. Мн., 1994.

Кипель В. С думой о Родине // Неман. 1993. № 8.

Кузнецов В. Н. Вывезены, расстреляны, забыты... // Неман. 1994. № 8. С. 146—165.

Культура беларускага замежжа / Пад рэд. А.Сабалеўскага. Мн., 1993.

Лешчанка Ф. Р. Беларусы — перасяленцы ў Сібіры (Канец XVI—XVII ст.) // Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. 1982. № 5.

Лыч Л. Беларусы свету // Беларусь. 1993. № 6. С.2—3, 24.

Лыч Л. Рээміграцыя // Голас Радзімы. 1996. № 16—20.

Малишкевич В. У. Русско-беларусские культурные связи второй половины XIX века. Мн., 1984.

Мацко А., Кабяк С. Акт исторической справедливости: К 50-летию воссоединения Западной Белоруссии с БССР // Сов. Белоруссия. 1989. 31 окт. С. 2.

Мацюнін С. Беларусы ў Польшчы // Бел. мова і літаратура ў школе. 1991. № 6.

Міжнародны кангрэс беларусістаў: Матэрыялы "Круглага стала" па тэме: Беларуская дыяспара // Беларусь. 1991. № 9. С. 20—23.

Мікалаевіч А. Бежанцы першай сусветнай вайны // Спадчына. 1994. № 3.

Пашкевіч А. А. Беларускі нацыянальны рух у Польшчы // Весці АН Беларусі. Серыя гуманіт. навук. 1994. № 1.

Першы з'езд беларусаў свету // Бел. гіст. часопіс. 1993. № 3. С. 3—10.

Польскі С., Мацюнін С. Беларусы: колькі і дзе? // Літ. і мастацтва. 1989. 3 сак. С. 5, 12.

Сакалоў М. Беларускае замежжа ў 20—30-я гады // Наст. газ. 1996. 17 лют. С. 2.

Сачанка Б. Беларуская эміграцыя. Мн., 1991.

Снапкоўскі У. Эміграцыя // Полымя. 1995. № 11. С. 196—221.

Сташкевіч А. Беларусы як нацыянальная меншасць у Польшчы // Бел. гіст. часопіс. 1995. № 2.

Сяргеева Г. Бацькаўшчына і дыяспара: эвалюцыя ўзаемаадносінаў і сучасныя праблемы // Бел. думка. 1993. № 3. С. 84—87.

Хацкевіч А. Арышты і дэпартацыі ў заходніх абласцях Беларусі (1939 — 1941 гг.) // Бел. гіст. часопіс. 1994. № 1—2.

Юхо А. Фармаванне тэрыторыі беларусаў // Спадчына. 1991. № 6.

## Дадатковая


Адамушка У. І. Палітычныя рэпрэсіі 20—50-х гадоў на Беларусі. Мн., 1994.

Антонава Т. Да нас прыехаў Данчык // Звязда. 1993. 1 сак. С. 3.

Арлоў У. Аб Наталлі Арсенневай // Беларусь. 1993. № 6. С. 22.

Арсеннева Н. Вершы // Беларусь. 1991. № 3. С. 10—11.

Аўгуліс А. "Шчаслівы той народ...": Размова з паслом Літвы // Беларусь. 1994. № 5. С. 2—3.

Беларусь — ЗША: Гутарка з паслом ЗША ў Беларусі // Беларусь. 1993. № 5. С. 30—31.

Белы С. Міхалава дрэва галіна: пра Міхася Міцкевіча — брата Я.Коласа // Наст. газ. 1994. 20 ліп. С. 4.

Бестужаў Д. За акіянам ведаюць наш голас: Пра спевака П.Конюха // Нар. газ. 1993. 13 кастр.

Вялічка У. Скарына — нашчадак Скарыны: Аб Станіславе Скарыне з Канады // Беларусь. 1991. № 8. С. 8.

Гениюш Л. Исповедь // Неман. 1992. № 4.

Геніюш Л. Лісты з Зельвы // Беларусь. 1991. № 3. С. 11—12.

Глобус А. Мінск — Лондан: Згадкі пра мастакоў-эмігрантаў // Беларусь. 1991. № 4. С. 26.

Грыцкевіч В. Іх змусілі аддаць свой талент іншым землям і народам // Беларусь. 1993. № 6. С. 32—33.

Дубавец С. Туга па Радзіме: Паэзія беларускай эміграцыі // Неман. 1993. № 8.

Казак Т. Ён быў запрошаны ў знакамітую міланскую "Ла-Скала": Пра спевака М. Забейду-Суміцкага // Нар. газ. 1994. 6 студз. С. 3.

Калубовіч А.Т. На крыжовай дарозе: Творы з эміграцыі. Мн., 1994.

Канус К. Мы не пасынкі твае, Беларусь: Першы сход беларусаў блізкага замежжа // Бел. мінуўшчына. 1993. № 1.

Карпей У. Кола фартуны: Беларускія студэнты ў Польшчы // Беларусь. 1993. № 11. С. 4—5.

Кляшчук А. Спадарыня Зора // Беларусь. 1991. № 10. С. 23.

Кравченко П. "До сих пор помню номер минского телефона..." О художнике А.Ахола-Вало // Сов. Белоруссия. 1992. 11 апр. С. 3.

Кузняцоў І. Драма народа // Полымя. 1996. № 6. С. 158—188.

Лёцка Е. "Я, Барыс Кіт — беларус з Навагрудчыны..." // Беларусь. 1993. № 6. С. 16—18.

Ліпень Л. Княгіня Радзівіл на Бацькаўшчыне // Добры вечар. 1992. 24 верас.

Лыч Л. "Полацк" набірае сілу: Агляд матэрыялаў беларускага часопіса з ЗША // Літ. і мастацтва. 1994. № 30. С. 13.

На суд гісторыі: Успаміны, дыялогі / Уклад. Б. І. Сачанка. Мн., 1994.

Нашы аўстралійцы // Бел. мінуўшчына. 1994. № 4. С. 55—57.

Панасюк М. На мяжы трох славянскіх народаў // Бел. думка. 1993. № 4. С. 51—52.

Пранчак Л. І. Беларуская Амерыка. Мн., 1994.

Прыбытка Г. Беларускія слабоды ў Маскве // Бел. мінуўшчына. 1993. № 3—4.

Сурмач Г. Беларускі загранічны архіў // Бел. мінуўшчына. 1993. № 1. С. 10—11.

Тозик А. Радуга этнического многоцветия // Бел. думка. 1994. № 7.

Туга па Радзіме: Паэзія беларускай эміграцыі / Уклад., прадм. і біяграф. даведкі Б. Сачанкі. Мн., 1992.

Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй / Пер. з польск. Мн., 1993.

Языковіч Л. Рэлігійнае жыццё Беларускай эміграцыі // Навіны Бел. акадэміі. 1992. 10, 24 крас.; 1993. 1, 15 студз.

Якавенка В. Ад берага да берага // Звязда. 1991. 12 кастр.

**Т а б л і ц а 3.1. Размеркаванне беларусаў па тэрыторыі іх пражывання (у межах былога Саюза ССР)**[1]

| | Тыс. чал. | | | У % да выніку | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1970 г. | 1979 г. | 1989 г. | 1970 г. | 1979 г. | 1989 г. |
| Усяго беларусаў | 9051,8 | 9462,7 | 10036,3 | 100 | 100 | 100 |
| З іх пражывалі на тэрыторыі: | | | | | | |
| Беларусі | 7289,6 | 7568,0 | 7904,6 | 80,5 | 80,0 | 78,76 |
| Расіі | 964,1 | 1051,9 | 1206,2 | 10,7 | 11,1 | 12,0 |
| Украіны | 385,9 | 406,1 | 440,1 | 4,3 | 4,3 | 4,4 |
| Літвы | 45,4 | 57,6 | 63,2 | 0,5 | 0,6 | 0,6 |
| Латвіі | 94,9 | 111,5 | 119,7 | 1,0 | 1,2 | 1,2 |
| Казахстана | 198,3 | 181,5 | 182,6 | 2,2 | 1,9 | 1,8 |
| іншых рэспублік Саюза ССР[2] | 73,6 | 86,1 | 119,9 | 0,8 | 0,9 | 1,24 |

[1] Народное хозяйство Республики Беларусь в 1991 г.: Стат. сб. Мн., 1993. С. 51.

[2] Падлічана аўтарам па звестках табліцы 3.1.

**Т а б л і ц а 3.2. Асноўныя накірункі эміграцыі беларусаў і насельніцтва Беларусі**[1]

| Перыяды эміграцыі | Гады | Галоўныя краіны пасялення | Прыкладная колькасць эмігрантаў з Беларусі | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 80-я XIX ст. – 1913 | ЗША<br>Канада<br>Бразілія<br>Аргенціна | ад 500 да 800 тыс. чал. | |
| 2 | 1914–1939 | Літва<br>Латвія<br>Эстонія<br>Чэхаславакія<br>Фінляндыя<br>Турцыя<br>Германія | 122 тыс. чал. | |
| | | Францыя | 50 тыс. чал. | |
| | | ЗША | 100 тыс. чал. | З улікам папярэдняй хвалі |

| Перыяды эміграцыі | Гады | Галоўныя краіны пасялення | Прыкладная колькасць эмігрантаў з Беларусі | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|
| | | Аргенціна<br>Бразілія<br>Уругвай<br>Парагвай<br>Чылі | 350 тыс. чал. | » |
| | | Канада | 30 тыс. чал. | з тэр. Заходняй Беларусі |
| 3 | 1939–1945 | ? | ? | Дакладныя звесткі адсутнічаюць |
| | 1945–1946 | Заходняя Германія<br>Аўстрыя | 75–100 тыс. чал. | Лагер перамешчаных асоб |
| 4 | 1946–наш час | Францыя | | 500 тыс. чал.* з улікам папярэдняй хвалі |
| | | Бельгія | 50 тыс. чал. | |
| | | ЗША | | |
| | | Канада | » | |
| | | Вялікабрытанія | 3 тыс. чал.* | |
| | | Аўстралія | 9–10 тыс. чал.** | |
| | | ФРГ | 1,1 тыс. чал.* | |
| | | Польшча | 274 тыс. чал. | рэпатрыянты |
| | | Паўднёвая Амерыка | 80 тыс. чал.* | |
| | 3 1991 г. | Дзяржавы СНД<br>ЗША<br>Ізраіль | ? | Дакладныя звесткі адсутнічаюць*** |

[1] Статыстычныя звесткі аб колькасці эмігрантаў, перыядах і накірунках эміграцыі з Беларусі вылучаны з навуковых прац Г. Сяргеевай "Беларуская дыяспара: гісторыя і сучаснасць" (Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 2. Мн., 1995. С. 488–506), "Бацькаўшчына і дыяспара: эвалюцыя ўзаемаадносінаў і сучасныя праблемы" (Бел. думка. 1993. № 3. С. 84–86), "Беларуская дыяспара" (Беларусь: Энцыкл. даведнік. Мн., 1995. С. 293).

* Па стану на 60-я гады. // Мой родны кут. Беласток, 1963. С. 173.

** Беларусь. 1993. № 6. С. 8.

*** Параўнальныя матэрыялы з адлюстраваннем этапаў і накірункаў эміграцыі, а таксама карта-схема "Рассяленне беларусаў у свеце. XVIII–XX стст. (па А.Калубовічу)" надрукаваны ў атласе "Беларусы" (Мн., 1996. С. 23, 26–27).

# Тэма 4

# СВОЕАСАБЛІВАСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПОБЫТУ

У гэтай тэме разглядаюцца пытанні матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў праз прызму своеасаблівасцей нацыянальнага побыту, якія фарміраваліся на працягу многіх стагоддзяў. Асноўная ўвага звяртаецца выкладчыкам на разгляд традыцыйных аспектаў побыту і культуры беларускага народа, што павінна садзейнічаць нацыянальнаму адраджэнню. Гэты аспект тэмы з'яўляецца галоўным і заняткі спрыяюць пашырэнню ведаў моладзі аб традыцыях і вобразе жыцця мінулых пакаленняў, выхаванню навучэнцаў (студэнтаў) на традыцыях беларускага народа.

Зыходзячы з адзначаных вышэй мэтаў, раім разгледзець на лекцыі наступныя вучэбныя пытанні: а) Традыцыйныя рамёствы і промыслы; б) Жыллё беларусаў; в) Народныя святы і абрады.

Выкладчык, арганізуючы заняткі па тэме, мае магчымасць прадугледзець некалькі варыянтаў вывучэння матэрыялу. Напрыклад, першы варыянт уключае лекцыю выкладчыка і адзін або два семінары; другі варыянт − уступнае і заключнае слова выкладчыка, некалькі семінараў-канферэнцый з абмеркаваннем рэфератаў навучэнцаў (выдачу тэм рэфератаў трэба ажыццяўляць наперад, за два-тры тыдні да семінара). У мэтах пашырэння ведаў навучэнцаў аб своеасаблівасцях нацыянальнага побыту беларусаў будзе пажаданым улічваць у тэматыцы паведамленняў розныя этнаграфічныя рэгіёны Беларусі.

На занятках па гэтай тэме раім выкарыстанне наглядных дапаможнікаў: табліц, малюнкаў, слайдаў, макетаў, фотакартак, відэазапісаў, кінафільмаў і г.д. Тэарэтычныя веды па тэме могуць быць замацаваны наведваннем этнаграфічнага (краязнаўчага) музея або выкананнем практычных заданняў, падрыхтоўкай рэфератаў і адказаў на кантрольныя пытанні. У працэсе падрыхтоўкі да заняткаў раім звярнуцца да выданняў, назвы якіх змешчаны ў дадатку да тэмы, што будзе карысным як выкладчыку, так і навучэнцам (студэнтам).

На занятках выкладчык павінен звярнуць увагу на тлумачэнне паняццяў, якія з'яўляюцца вузлавымі: рамяство, промыслы, хата, адзенне, святы, абрады і інш. Трэба мець на ўвазе, што змест некаторых паняццяў з часам мог змяняцца, таму

пажадана звяртацца да энцыклапедычных даведнікаў і тлумачальных слоўнікаў, якія выдадзены ў апошнія гады (Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 1—3. Мн., 1996; Беларусь: Энцыкл. даведнік. Мн., 1995; Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 1—3. Мн., 1993—1996 і інш.).

Пры разглядзе першага пытання, прысвечанага аналізу аднаго з важнейшых аспектаў народнай культуры і вытворчай дзейнасці беларусаў — рамёстваў і промыслаў, пажадана падкрэсліць, што яны з'яўляліся дапаможнымі заняткамі да сельскай гаспадаркі, перш-наперш земляробства, якое было асноўнай крыніцай здабывання сродкаў для існавання.

**Рамяство** (ад старажытнага "рукамяство") — выраб ручным спосабам і простымі прыладамі працы розных рэчаў хатняга ўжытку, адзення, абутку, сельскагаспадарчага інвентару, транспартных сродкаў, прадметаў паўсядзённага карыстання.

Паралельна з рамяствам развіваліся і **промыслы**, пачатковымі формамі якіх былі збіральніцтва, паляўніцтва, рыбалоўства, бортніцтва. У далейшым з развіццём вытворчасці сфера прамысловых заняткаў пашыралася і ўключала ў сябе выраб жалеза, шкла, паташу, нарыхтоўкі лубу, лазы, смалы, вугалю і іншай сыравіны, а таксама выраб з яе гатовай прадукцыі. Пасля рэформы 1861 г. частка насельніцтва ішла ў адыходныя промыслы і займалася будаўніцтвам, валкай і сплавам лесу, землянымі работамі і г.д.

Промыслы і рамёствы беларусаў, маючы старажытныя вытокі, адлюстроўваюць гісторыю развіцця прадукцыйных сіл. Магчыма адзначыць тры гістарычныя стадыі іх развіцця:

1) хатнія рамёствы і промыслы ("для сябе, сваёй сям'і");

2) на заказ;

3) на рынак (інакш — дробная таварная вытворчасць), калі рамяство станавілася важнай ці нават асноўнай крыніцай існавання.

Рамёствы і промыслы пачыналі фарміравацца ў старажытныя часы; найбольш высокі росквіт назіраўся ў час знаходжання беларусаў у Вялікім княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім, асабліва ў XVI —XVII стст. Найбольш распаўсюджанымі рамёствамі былі тыя, вырабы якіх карысталіся попытам сярод насельніцтва. У гарадах — гэта рамёствы кавальскае, кравецкае, шавецкае, гарбарнае, цяслярскае, ганчарнае; у вёсцы — розныя віды дрэваапрацоўкі (выраб сельскагаспадарчых прылад, посуду, цяслярства, стальмаства), апрацоўка воўны і льну, ткацтва, бортніцтва, лесахімічныя промыслы.

Са з'яўленнем фабрычна-заводскай вытворчасці звужалася сфера функцыяніравання народных промыслаў і рамёстваў, аднак яны існавалі яшчэ значны час і адыгрывалі немалаважную ролю ў жыцці народа.

Гарадскія рамеснікі з XVI ст. аб'ядноўваліся ў асобныя прафесійныя карпарацыі — цэхі (іншыя назвы — брацтвы ў Полацку і Менску, староствы — у Магілёве, сотні — у Гародні //

Нарысы гісторыі Беларусі. Ч.1. Мн., 1994. С.161). Усяго на Беларусі ў XVII ст. у 18 гарадах налічвалася 116 цэхаў, якія аб'ядноўвалі ад 1 да 10 прафесій (Беларусь: Энцыкл. даведнік. Мн., 1995. С. 623). Кожны цэх меў свой статут, які вызначаў яго структуру, парадак прыёму новых членаў, адносіны да гарадскога магістрата і г.д.

Да XIX ст. цэхавае рамяство канчаткова вычарпала свае магчымасці ў сувязі з пашырэннем мануфактуры і прамысловасці. У мінулым стагоддзі вызначылася спецыялізацыя сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай вытворчасці. Так, на Падняпроўі былі шырока развіты гарбарная, ганчарная, шкляная вытворчасці, лясныя і дрэваапрацоўчыя промыслы; у Падзвінні — вырошчванне льну і яго апрацоўка, рыбалоўства, каменячосны і кавальскія промыслы, цяслярства і інш. (Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. Мн., 1989. С. 427).

У наш час рамёствы і промыслы існуюць як розныя формы заняткаў насельніцтва, як народнае мастацтва (напрыклад, дэкаратыўна-прыкладное), у выглядзе індывідуальнай працоўнай дзейнасці, а таксама як хобі.

Пасля разгляду тэарэтычных палажэнняў аб рамёствах і промыслах магчыма перайсці да пытання аб традыцыйным жыллі беларусаў, яго будаўніцтве, абсталяванні і ўпрыгожванні, выкарыстанні асобнай сям'ёй.

**Жыллё** як збудаванне, у якім жыве чалавек, узнікла на досвітку цывілізацыі і развівалася ад прасцейшых шалаша, будкі, зямлянкі да адна- і шматкамернай пабудовы. Тыпы і разнавіднасці жылля абумоўлены ўзроўнем развіцця грамадства, культурна-бытавымі традыцыямі, прыроднымі ўмовамі, узроўнем будаўнічай тэхнікі. Розныя тыпы жылля існавалі для розных сацыяльных груп, для насельніцтва горада, вёскі, мястэчка.

Традыцыйным жыллём насельніцтва Беларусі на працягу многіх стагоддзяў з'яўлялася сялянская хата зрубнага тыпу, пабудаваная з драўніны (хвоі, елкі; на падрубу выкарыстоўвалі дуб). Хата магла мець некалькі памяшканняў і ўмоўна падзялялася на жылую і гаспадарчую часткі (сенцы, камору). Аднакамерныя пабудовы, якія ацяпляліся па-чорнаму, мелі земляную падлогу, былі жыллём для беднейшай часткі сялян і гараджан. Больш заможнае насельніцтва мела двух-, трох- і шматкамерныя пабудовы. Так, з XV — XVII стст. дамы рамеснікаў і гандляроў спалучалі традыцыйнае жыллё (хату) з майстэрняй або крамай; у багатых гараджан дамы мелі развітую планіроўку, складаныя архітэктурныя формы.

Унутраная планіроўка ў беларускім сялянскім (і часткова — гарадскім) жыллі вызначаецца ўстойлівасцю і на працягу доўгага часу ўключала: печ, покуць (кутны вугал, вялікі вугал, кут), дзе стаяў стол і знаходзілася бажніца; лавы, палаці, палічкі для посуду, лучнік, куфры (скрыні) і інш. Інтэр'ер хаты афармляўся вырабамі ручнога ткацтва — ручнікамі, абрусамі, посцілкамі, дыванамі, якія ўносілі ў сціплае жыллё элементы

святочнага настрою. Знешне жыллё маглі ўпрыгожваць разьбой па дрэву; у дэкоры выкарыстоўвалі самабытныя і нацыянальныя арнаментальныя матывы: выявы сонца і нябесных цел, мясцовай фауны і флоры, геаметрычныя абстрактныя формы.

Далейшая эвалюцыя традыцыйнага жылля беларускага народа звязана з сацыяльна-эканамічным і навукова-тэхнічным прагрэсам, асабліва ў другой палове XX ст. У савецкі час жыллё будавалі больш прасторным, на мураваным фундаменце; пачалі выкарыстоўваць новыя будаўнічыя матэрыялы, пашырылася добраўпарадкаванне гарадоў, пасёлкаў, вёсак камунальнымі выгодамі: электраасвятленнем, цэнтралізаваным ацяпленнем, каналізацыяй, вадой, газам і інш. Больш падрабязныя характарыстыкі жылля змешчаны ў выданнях па этнаграфіі і дойлідству Беларусі.

Характарызуючы апошняе пытанне, раім выкладчыку падкрэсліць, што састаўной часткай традыцыйна-бытавой культуры народа з'яўляюцца **абрады, звычаі і святы.**

**Абрады** — сукупнасць традыцыйных умоўных дзеянняў, што сімвалічна выражаюць і замацоўваюць адносіны людзей да прыроды і паміж сабою, іх паводзіны ў жыццёва важных сітуацыях, якія сістэматычна паўтараюцца. Большасць беларускіх абрадаў старажытнага паходжання, і ўзніклі яны на агульнай усходнеславянскай глебе ў першабытным грамадстве, калі людзі імкнуліся ўздейнічаць на незразумелыя ім з'явы прыроды заклінаннямі, танцамі, песнямі і г. д. Так, старажытная абраднасць ляжыць у аснове калядавання, Масленіцы, Купалля; многія абрады звязаны з культам продкаў — Дзяды, Радаўніца. Асаблівасцю беларускіх абрадаў з'яўляецца перапляценне ў іх аграрна-бытавых, язычніцкіх і хрысціянскіх элементаў.

**Звычаі** — гістарычна ўсталяваны і агульнапрыняты ў пэўным грамадстве або сацыяльнай групе спосаб паводзін. Як норма паводзін узнік у глыбокай старажытнасці; у аснове звычаяў першапачаткова былі розныя забароны і абмежаванні, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне і рэгулявалі паводзіны асобы, узаемаадносіны з іншымі людзьмі. У ролі звычаяў маглі выступаць вытворчыя навыкі, рэлігійныя абрады, народныя святы і інш. На аснове звычаяў сфарміравалася звычаёвае права — сукупнасць гістарычна выпрацаваных і прынятых грамадствам няпісаных нормаў паводзін і ўзаемаадносін людзей у розных галінах грамадскага і сямейнага жыцця. З узнікненнем дзяржавы частка звычаяў была кадыфікавана і ўключана ў законы, якія кантралююцца дзяржаўным апаратам. У наш час звычаі захоўваюцца ў сям'і, сферы побыту і грамадзянскай абраднасці. Так, некаторыя звычаі атрымалі назву абрадаў. Аднак паміж звычаем і абрадам, як тлумачыць даследчык С. Ф. Цярохін, існуе істотная розніца: "Звычай падае ўзоры для пераймання, узнаўляе і замацоўвае правілы паводзін, мэта абрадаў — пры дапамозе эмацыянальна насычанай сімволікі садзейнічаць трываламу засваенню сацыяльнага вопыту" (Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. Мн., 1989. С. 213).

**Святы** — сукупнасць звычаяў і абрадаў, якія выражаюць і замацоўваюць пэўныя погляды, пачуцці, адносіны людзей да прыроды і паміж сабой. Узніклі ў старажытныя часы — у першабытным грамадстве і былі звязаны з каляндарным ці земляробчым цыклам. У працэсе гістарычнага развіцця яны зазнавалі змены, некаторыя адміралі, узнікалі новыя, што адлюстроўвалі новы лад жыцця, іншыя погляды. Змест і значэнне іх разнастайныя; падзяляюцца на сінкрэтычныя (традыцыйныя каляндарныя народным святы — Каляды, Купалле, Масленіца і інш.), рэлігійныя і безрэлігійныя (Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. Т.4. Мн., 1987. С. 686—687).

Беларускія святы і абрады падзяляюцца на некалькі груп:

1) каляндарна-вытворчыя (зімовыя — Каляды, Масленіца; вясновыя — гуканне вясны, першы выхад у поле; летнія — Купалле, зажынкі, дажынкі; восеньскія — Багач, Пакровы і інш.);

2) сямейна-бытавыя: радзінныя, вясельныя, пахавальныя;

3) грамадскія: дзяржаўныя, мясцовыя, міжнародныя;

4) рэлігійныя (напрыклад, хрысціяне адзначаюць Раство Хрыстова, Вялікдзень, Вадохрышча, Благавешчанне і інш.).

Некаторыя святы і абрады, якія з'яўляюцца каляндарна-вытворчымі і сямейнымі, выкладчык мае магчымасць растлумачыць больш падрабязна.

У заключнай частцы лекцыі раім падкрэсліць самабытнасць, непаўторнасць традыцый беларускай нацыі, а таксама рэкамендаваць навучэнцам (студэнтам) літаратуру для падрыхтоўкі да семінараў.

Markdown-ish check aside: Featured Рознабаковасць пытанняў гэтай тэмы вымагае падзяліць агульны спіс літаратуры на некалькі падраздзелаў: а) Агульныя працы; б) Фальклор, абрады, звычаі; в) Рамёствы і промыслы; г) Жыллё, побыт.

## Кантрольныя пытанні:

1. Якія віды рамёстваў развіваліся на Беларусі ў мінулыя стагоддзі?
2. У чым прычына ўзнікнення рамесных цэхаў?
3. Якія змены адбыліся ў развіцці рамёстваў, калі на Беларусі ажыццявіўся прамысловы пераварот?
4. Як будавалася традыцыйная хата беларускага селяніна?
5. Якія пабудовы абавязкова існавалі на сялянскай сядзібе? Якія тыпы пабудовы сядзібы Вам вядомы?
6. У чым асаблівасці беларускага нацыянальнага адзення?
7. Якія каляндарныя і сямейныя святы адзначалі ў мінулым і адзначаюць сёння беларусы?
8. Што ўяўляе сабой беларуская нацыянальная кухня?
9. Як звязаны паміж сабой нацыянальныя стравы беларусаў і розныя віды працоўнай дзейнасці селяніна?
10. Якія нацыянальныя абрады беларусаў Вам вядомы?

## Тэматыка рэфератаў:

1. Традыцыйнае жыллё беларускага селяніна ў XVIII — XIX стст.

2. Беларускае нацыянальнае адзенне.

3. Асаблівасці нацыянальнага адзення ў розных этнічных рэгіёнах Беларусі.

4. Рамёствы і промыслы беларусаў (XVI — XVII стст., XVIII — XIX стст.).

5. Беларускія гульні і танцы.

6. Каляндарныя і сямейныя святы беларусаў.

7. Беларускія народныя тканіны.

8. Фальклор сучаснай вёскі (сучаснага беларускага горада).

9. Падарожнікі аб побыце беларусаў у XIX ст.

10. З гісторыі земляробчых заняткаў беларускага насельніцтва.

11. Забудовы для апрацоўкі і захавання зерня.

## Практычныя заданні:

1. Скласці апісанне пабудовы мінуўшчыны: сялянскай хаты, дома гараджаніна-рамесніка; зрабіць план пабудовы.

2. Падрыхтаваць слайд-фільм (відэафільм) аб старых пабудовах (народных святах і абрадах) у месцы жыхарства.

3. Выкананне прадметаў побыту: лыжкі, каўша, кошыка, цацак, вышыўкі, кухоннай дошкі, пісанкі і г. д.

4. Азнаёміцца з працай народных майстроў: дрэваапрацоўшчыкаў, ганчароў, кавалёў і г. д.

5. Вырабы макетаў традыцыйнай сялянскай хаты, якія датычаць розных перыядаў.

6. Параўнаць бытавы посуд розных ганчарных цэнтраў Беларусі, выкарыстоўваючы артыкулы энцыклапедычнага даведніка "Этнаграфія Беларусі" (Мн., 1989. С.43, 141, 171, 218, 406, 425, 432 і інш.).

7. Скласці апісанне нацыянальнага адзення і зрабіць малюнкі або фатаграфіі святочнага адзення.

8. Збор мясцовага фальклору: песень, частушак, казак, прымавак і г.д., іх запіс з асаблівасцямі мясцовага дыялекту.

9. Наведаць Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту (вёска Азярцо Мінскага раёна).

## ЛІТАРАТУРА:

### а) Агульныя працы да тэмы

Грамадскі сямейны быт і духоўная культура насельніцтва Палесся. Мн., 1987.
Змены ў побыце і культуры сельскага насельніцтва Беларусі. Мн., 1976.
Змены ў побыце і культуры гарадскога насельніцтва Беларусі. Мн., 1976.
Качаноўскі У.У. Гісторыя культуры Беларусі: Вучэбны дапаможнік для

студэнтаў ВНУ. Мн., 1994.

Конон В. Народ в координатах культуры // Неман. 1995. № 2, 7, 12.

Мальдзіс. А. І. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII ст. Нарысы быту і звычаяў. Мн., 1982.

Минько Л. И. Народная медицина Белоруссии: Краткий исторический очерк. Мн., 1969.

Молчанова Л. А. Очерк материальной культуры белорусов 16—18 вв. Мн., 1981.

Музей беларускага народнага мастацтва: Альбом. Мн., 1983.

Насытка Я. Да этнічнай гісторыі Заходняга Палесся // Спадчына. 1995. № 2.

Палессе. Матэрыяльная культура. Мн., 1988.

Рыер Я. Матэрыяльная культура вясковага насельніцтва Магілёўшчыны ў X—XIII стст. // Бел. гіст. часопіс. 1994. № 3.

Салееў В. А. Нацыянальная самасвядомасць і мастацкая культура. Мн., 1990.

Сахута Я. М. Беларускае народнае мастацтва: Альбом. Мн., 1980.

Сахута Я. М. Фарбы роднай зямлі: Нарысы пра народнае мастацтва Беларусі. Мн., 1985.

Сям'я і сямейны быт беларусаў. Мн., 1990.

Тарасевіч У. Беларуская вёска: мінулае і сучаснасць // Бел. гіст. часопіс. 1996. № 4.

Титов В. С. Историко-этнографическое районирование материальной культуры белорусов (XIX— нач. XX в.). Мн., 1983.

Фядосік А. С. Беларуская савецкая фалькларыстыка. Мн., 1987.

Цітоў В. С. Святы і абрады ў БССР. Мн., 1988.

Чурко Ю. М. Белорусский народный танец. Мн., 1972.

### б) Фальклор. Абрады. Звычаі

Анічэнка У. В., Малюк А. К. Народныя прыкметы. Мн., 1992.

Барташэвіч Г. А. Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя. Мн., 1985.

Беларускі народны каляндар / Аўт.-уклад. А. Ю. Лозка. Мн., 1992.

Беларускі народны соннік // Беларусь. 1994. № 3—6.

Беларускі фальклор: Хрэстаматыя. Мн., 1985.

Беларускі фальклор у сучасных запісах: Традыц. жанр Мінскай вобл. / Уклад. В. Д. Ліцвіненка. Мн., 1995.

Валодзіна Т. В. Талака: тэкст і кантэкст // Весці АН Беларусі. Серыя гуманіт. наук. 1995. № 1. С.83—89.

Васілевіч У. А. Усходнеславянская гумарыстычная песня. Мн., 1979.

Вількін Я. Р. Беларускія народныя гульні. Мн., 1969.

Вяселле: Песні. Кн. 1—6. Мн., 1980—1988.

Гілевіч Н. С. Наша родная песня: Навукова-папулярны нарыс. Мн., 1968.

Гурскі А. І. Зімовая паэзія беларусаў. Мн., 1980.

Гурскі А. І. Тайны народнай песні. Мн., 1994.

Жартоўныя песні. Мн., 1974.

Карнач П. К. Развіццё беларускай савецкай фалькларыстыкі. Мн., 1973.

Коваль В., Новак В.С. Беларускія народныя святы і звычаі. Гомель, 1993.

Козенка М. Беларускі народны танцавальны этыкет // Тэатральная Беларусь. 1995. № 1—2.

Матыліцкая Н. Гуканне вясны: Народныя святы // Роднае слова. 1993. № 1.

Матыліцкая Н. Фальклорныя традыцыі Заслаўшчыны // Бел. гіст. часопіс. 1995. № 2. С.70—76.

Пахаванне. Памінкі. Галашэнне. Мн., 1986.

Песні пра каханне. Мн., 1978.
Песні савецкага часу. Мн., 1970.
Салавей Л. М. Беларуская народная балада. Мн., 1978.
Сацыяльна-бытавыя песні. Мн., 1987.
Сысоў У. М. Дынаміка псіхалагізму пахавальнай абраднасці славян // Весці АН Беларусі. Серыя гуманіт. навук. 1993. № 2.
Таўшай Г. Б. Беларускае Купалле: абрад, песня. Мн., 1986.
Фядосік А. С. Беларуская народная сатырычная проза. Мн., 1982.
Фядосік А. С. Фальклор і "масавая культура". Мн., 1986.
Хатэнка А. З радаводу багоў паганьскіх // Роднае слова. 1993. № 9, 11.
Хатэнка А. Наламлю я з зялёнага маю...: Духоўны сэнс веснавых звычаяў і абрадаў // Роднае слова. 1994. № 5.
Хатэнка А. Пра дзіва продкавай веры: Духоўны сэнс народных звычаяў і абрадаў // Роднае слова. 1993. № 2, 3.
Цішчанка І. К. Беларуская частушка: Пытанні генезісу жанру. Мн., 1971.
Шаран В. М. Дынаміка функцыянавання весенне-летняга абрадавага цыкла Піншчыны // Весці АН Беларусі. Серыя гуманіт. навук. 1993. № 1.

### в) Кнігі з серыі "Беларуская народная творчасць"

Веснавыя песні. Мн., 1979.
Восеньскія і талочныя песні. Мн., 1981.
Вяселле: Абрад. Мн., 1978.
Вяселле: Песні. Кн. 1—6. Мн., 1980—1988.
Жарты, анекдоты, гумарэскі. Мн., 1984.
Жніўныя песні. Мн., 1974.
Загадкі. Мн., 1972.
Зімовыя песні: Калядкі і шчадроўкі. Мн., 1975.
Казкі ў сучасных запісах. Мн., 1989.
Прыказкі і прымаўкі. Мн., 1976.
Сямейна-бытавая песня. Мн., 1984.
Чарадзейныя казкі. Ч. 1—2. Мн., 1973, 1978.

### г) Рамёствы. Промыслы

Беларускае народнае адзенне. Мн., 1975.
Беларуская кафля. Мн., 1989.
Беларуская народная архітэктурная разьба: Альбом. Мн., 1958.
Беларусы: У 8 т. Т.1: Прамысловыя і рамесныя заняткі / Рэдкал.: В. К. Бандарчык, М. Ф. Піліпенка, В. С. Цітоў. Мн., 1995.
Браім І. М. Прамысловыя прылады і рамесныя вырабы як помнікі матэрыяльнай культуры. Мн., 1976.
Валадзько Р. Ф. Івянец — старажытны ганчарны цэнтр. Мн., 1978.
Гуркоў У. С., Цярохін С. Ф. Бортніцтва ў Беларусі. Мн., 1980.
Гурын М. Ф. Металаграфічныя даследаванні кавальскіх вырабаў з Клецка // Весці АН Беларусі. Серыя гуманіт. навук. 1993. № 1.
Дубінка В. Хлеб, соль і вада: Аб калодзежах на Беларусі // Беларусь. 1993. № 5. С. 14—15.
Касцюковіч М. Іскры з-пад молата // Бел. мінуўшчына. 1994. № 2.
Курыловіч Г. М. Беларускае народнае ткацтва. Мн., 1981.
Левко О. Н. Витебские изразцы XIV—XVII вв. Мн., 1981.
Леонова А. К. Народная деревянная скульптура Белоруссии. Мн., 1977.
Лобачевская О. А., Кузнецова Н. Н. Возьми простую соломку. Мн., 1988.
Локотко А.И. Белорусское народное зодчество. Мн., 1991.

Мілючэнкаў С. А. Беларускае народнае ганчарства. Мн., 1984.
Народнае мастацкае ткацтва Случчыны: Альбом. Мн., 1959.
Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. Мн., 1974.
Раманюк М. Ф. Беларускае народнае адзенне: Альбом. Мн., 1981.
Ржавуцкі М. С. Беларуская гліняная цацка. Мн., 1991.
Салівончык В. І. Беларускія паясы // Мастацтва Беларусі. 1988. № 10.
Сахута Е. М., Говор В. А. Художественные ремесла и промыслы Белоруссии. Мн., 1988.
Сахута Я. М. Беларускае народнае мастацкае кавальства. Мн., 1990.
Сахута Я. М. Беларуская народная кераміка. Мн., 1987.
Сахута Я. М. Выцінанкі // Мастацтва Беларусі. 1988. № 12.
Сахута Я. М. Гродзенскія пісанкі // Мастацтва Беларусі. 1988. № 2.
Сергачоў С. А. Летапіс драўлянага дойлідства Беларусі. Мн., 1975.
Терехин С. Ф. Охота в Белоруссии. Мн., 1986.
Трызна Д. С. Беларускія дываны і габелены. Мн., 1981.
Фадзеева В., Віннікава М. Беларуская намітка // Бел. мінуўшчына. 1994. № 3.
Фадзеева В. Я. Беларуская народная вышыўка. Мн., 1992.
Фадзеева В. Беларускі ручнік. Мн., 1994.
Цітоў В. С. Народныя дрэваапрацоўчыя промыслы Беларусі (1917—1941 гг.). Мн., 1976.
Шкут Н. Н. Белорусские художественные промыслы: Изделия из соломки и лозы. Мн., 1985.
Якуніна Л. І. Слуцкія паясы. Мн., 1960.
Яніцкая М. М. Вытокі шкларобства Беларусі. Мн., 1980.

## д) Жыллё. Побыт

Беларускае народнае жыллё. Мн., 1973.
Белорусская кухня // В. А. Болотникова, Л. М. Вапельник, И. П. Корзун и др. 2-е изд., перераб. Мн., 1984.
Краўчанка В. "Мае заступнікі ...": Побыт беларуса і веравызнанне // Крыніца. 1992. № 5—6.
Ленсу Я. Хата — мой сусвет // Мастацтва. 1995. № 4. С.14—15.
Навагродскі Т. Смачнасці...: Народная кулінарыя Гомельшчыны // Беларусь. 1994. № 6.
Трацевский В. История архитектуры народного жилища Белоруссии. Мн., 1989.
Шаблюк В. У. Сялянскі двор беларускага Панямоння ў XVI—XVIII стст. // Весці АН Беларусі. Серыя гуманіт. навук. 1995. № 1. С. 54—59.

# Тэма 5

# ВЕРАВЫЗНАННІ НАРОДАЎ БЕЛАРУСІ

Гэта тэма працягвае вывучэнне духоўнай культуры беларусаў і іншых этнічных груп насельніцтва праз такую спецыфічную форму адлюстравання рэчаіснасці і ўнутранага свету чалавека, як веравызнанне. Пачынаючы падрыхтоўку да заняткаў па гэтай тэме, выкладчыку рэкамендуецца перш-наперш вызначыць мэту лекцыі і семінара, а таксама ўплыў рэлігіі як адной з форм грамадскай свядомасці на фарміраванне нацыянальнай свядомасці беларусаў. У якасці асноўных пытанняў, якія пажадана разгледзець на лекцыі, могуць быць наступныя:

1. Дахрысціянскія (язычніцкія) вераванні на тэрыторыі Беларусі.

2. Хрысціянства і іншыя рэлігіі як формы грамадскай свядомасці розных народаў.

3. Сучасныя ўзаемаадносіны дзяржавы і вернікаў.

Як вядома з гістарычных (археалагічных) крыніц, рэлігійныя ўяўленні ў насельніцтва, якое знаходзілася прыкладна 40—30 тыс. гадоў таму назад на тэрыторыі сучаснай Беларусі, склаліся ва ўмовах старажытнага першабытнаабшчыннага грамадства. Язычніцкія вераванні існавалі ў розных формах; у спецыяльных месцах — капішчах, як сведчаць археолагі, адбываліся рэлігійныя абрады і ахвярапрынашэнні.

З X ст. на ўсходнеславянскіх землях пачаўся працэс хрысціянізацыі. Хрысціянская царква на Беларусі спрыяла ўмацаванню ўлады князёў і сувязей з еўрапейскай цывілізацыяй і культурай. Асаблівасцю дзейнасці хрысціянства на нашай зямлі было і застаецца адначасовае існаванне розных накірункаў гэтай рэлігіі: праваслаўя, каталіцтва, пратэстантызму, уніяцтва, адгалінавання праваслаўя — стараабрадства. На Беларусі таксама склаліся рэлігійныя аб'яднанні іўдзеяў, мусульман; у XX ст. з'явіліся нетрадыцыйныя рэлігійныя плыні: крышнаізм, дзэнбудызм, сведкі Іяговы і інш.

Кожная з рэлігійных канфесій мае своеасаблівасці ў абрадах, якія не заўсёды маюць сувязі з традыцыйнай культурай беларусаў, нацыянальнай мовай. Фактычна кожны рэлігійны накірунак спрабуе выжыць ва ўмовах сучаснага пераходнага этапа развіцця грамадства за кошт павелічэння колькасці сваіх аднаверцаў. І гэта ўвогуле вельмі супярэчліва ўплывае на згуртаванне беларускага народа, грамадзян Беларусі.

У мінулыя стагоддзі рэлігійная сітуацыя на Беларусі была іншая. Гэта звязана з тым, што спачатку праваслаўе, затым каталіцызм і уніяцтва, зноў праваслаўе выконвалі функцыі дзяржаўных рэлігій і былі адным са сродкаў палітычнай барацьбы, падтрымання ўлады над народам. Змена палітычнай улады і дзяржаўных межаў, падтрымка (альбо змена) дзяржавай таго ці іншага рэлігійнага накірунку адмоўна ўплывалі на стабільнасць веравызнанняў насельніцтва і вялі да канфліктаў (паміж святарамі розных канфесій за паству, паміж уладай і недзяржаўнымі рэлігіямі, паміж вернікамі за культавыя будынкі і г.д. Але адначасова трэба падкрэсліць, што на Беларусі не было грамадскіх войн на рэлігійнай аснове, і гэта сведчыць аб менталітэце, стрыманасці насельніцтва).

Праблема ўзаемаадносін рэлігійных накірункаў і вернікаў з дзяржавай у савецкі час на Беларусі — гэта фактычна барацьба ўлады супраць рэлігіі з выкарыстаннем розных метадаў: зачыненне храмаў і манастыроў, арышты і высылка святароў і вернікаў, канфіскацыя маёмасці, зруйнаванне часткі рэлігійных пабудоў, адмоўныя адносіны да рэлігійных патрэб насельніцтва і г. д. (Цікавы і абгрунтаваны матэрыял па гэтай праблеме змешчаны ў публікацыі Т.Працько "Рэпрэсіраваная вера" ў газеце "Советская Белоруссия" ад 8—14 жніўня, 24 верасня 1992 г.)

У часы пасля заканчэння другой сусветнай вайны адносіны савецкай улады на Беларусі да рэлігіі і вернікаў мяняліся ў лепшы бок (Гл.: БелСЭ. Т.12. С.664; БССР: Кароткая энцыклапедыя. Т. 1. С. 616—617), але і сёння некаторыя праблемы застаюцца.

У наш час, калі аднавіліся праблемы нацыянальнага адраджэння, прадстаўнікамі розных грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый звяртаецца ўвага на ідэю нацыянальнай рэлігіі для беларусаў, якая магла б дапамагчы (у большай ці меншай меры) вернікам авалодаць тымі духоўнымі каштоўнасцямі, якія выпрацаваны папярэднімі пакаленнямі, а таксама станоўча ўплываць на абарону нацыянальных інтарэсаў. Некаторыя грамадскія дзеячы і прадстаўнікі інтэлігенцыі выказваюць думку аб адраджэнні уніяцкай рэлігіі як нацыянальна-беларускай (Гл.: 100 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі. Мн., 1994. С. 38). Станоўчую ролю уніяцкай рэлігіі ва ўмацаванні этнічнай, нацыянальнай еднасці беларусаў адзначае Л.Лыч у сваёй кнізе "Беларуская нацыя і мова" (Мн., 1994. С. 24).

Як вядома, у 1596 г. Берасцейскі сабор абвясціў аб утварэнні уніяцкай царквы, якая аб'ядноўвала каталіцкую і праваслаўную цэрквы на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Стварэнне царкоўнай уніі ажыццяўлялася ў канкрэтна-гістарычных умовах XVI ст., калі вярхоўная ўлада разлічвала ўмацаваць дзяржаву, кансалідаваць розныя слаі грамадства (прычыны і этапы стварэння уніі, характарыстыка становішча ў Вялікім

княстве Літоўскім, Рэчы Паспалітай напярэдадні і пасля падпісання уніі даволі падрабязна выкладзены ў "Нарысах гісторыі Беларусі". Ч. 1. С. 166—178). Адносіны да новай царквы, якая афіцыйна навязвалася ўладай і падпарадкоўвалася рымскаму папу, але захоўвала традыцыйную абраднасць (грэкаўсходнюю), былі далёка не аднолькавымі —ад падтрымкі да актыўнага сацыяльнага пратэсту. Безумоўна, значным у дзейнасці уніяцкай царквы (з XVII ст.) было выкарыстанне народнай беларускай мовы ў набажэнствах. Але далейшы лёс уніяцкай царквы на Беларусі, калі адбыліся падзелы Рэчы Паспалітай і рэвалюцыйныя падзеі XX ст. у Расіі, быў незайздросны.

Ва ўмовах сучаснага беларускага грамадства, калі адбываецца працэс умацавання дзяржавы на падставе Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і робяцца спробы пераадолення сацыяльна-эканамічнага крызісу, падштурхоўваць пытанне аб "нацыянальнай рэлігіі", на наш погляд, немэтазгодна. У дэмакратычным грамадстве гэта пытанне вырашаецца самім насельніцтвам, на асабістых інтарэсах і схільнасцях, без агульнанацыянальных рэферэндумаў. Калі навязваць насельніцтву той ці іншы рэлігійны накірунак як "асноўны", "галоўны", "самы ўплывовы" і г.д., гэта можа прывесці да адмоўных вынікаў. Таму пытанне аб адносінах да уніяцкай царквы (як і да іншых рэлігій і цэркваў) здольны вырашыць самастойна грамадзяне рэспублікі.

Новыя адносіны да царквы, да розных рэлігійных накірункаў пачалі фарміравацца на Беларусі напярэдадні 1000-годдзя прыняцця хрысціянства на Русі. У нашай рэспубліцы створаны ўмовы для забеспячэння прававых гарантый у выражэнні веруючымі сваіх перакананняў. Новая палітыка знайшла прававое адлюстраванне ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, у Законе "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях". Адметнай рысай сучаснага рэлігійнага жыцця з'яўляецца рост рэлігійных абшчын (гл. статыстычныя табліцы да тэмы), у тым ліку адраджэнне уніяцкай царквы, якая была забаронена царскімі ўладамі ў 1839 г.

На пачатак 1995 г. на Беларусі дзейнічала 11 абшчын гэтай канфесіі (Нар. газ. 1995. 18 студз. С.1).

На занятках па тэме пажадана выкарыстаць наглядныя дапаможнікі: слайды, табліцы-плакаты "Помнікі дойлідства Беларусі", фотаілюстрацыі беларускіх абразоў, партрэты выдатных рэлігійных дзеячаў — Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Сімяона Полацкага і інш.; статыстычныя табліцы аб колькасці і размяшчэнні рэлігійных абшчын на Беларусі (гл. табліцы 5.1. і 5.2.).

На семінарскіх занятках па гэтай тэме раім абмеркаваць кантрольныя пытанні і некалькі рэфератаў, падвесці вынікі выканання практычных заданняў.

## Кантрольныя пытанні:

1. Чым выклікана з'яўленне язычніцкіх вераванняў у старажытных людзей?

2. Якім багам пакланяліся ўсходнія славяне?

3. Як і калі адбывалася хрысціянізацыя на старажытнай Русі?

4. Які ўплыў аказала хрысціянства на развіццё беларускіх зямель?

5. Чаму ў некаторыя гістарычныя перыяды ўзмацняўся на Беларусі нацыянальна-рэлігійны прыгнёт? Дакажыце гэта на прыкладах.

6. Як уплывала ў мінулым хрысціянства на мастацтва, культуру, сацыяльныя адносіны? Параўнайце гэты ўплыў мінулага з сучаснасцю.

7. Як складаліся ўзаемаадносіны хрысціянскай царквы на Беларусі з савецкай дзяржавай?

8. Чаму ў наш час у беларускім грамадстве назіраецца павышэнне рэлігійнай актыўнасці насельніцтва?

9. Якія тэндэнцыі ў развіцці рэлігійных канфесій на Беларусі вызначаюцца ў апошнія 10—20 гадоў?

## Тэматыка рэфератаў:

1. Гісторыя хрысціянізацыі беларускіх зямель.
2. Дзейнасць праваслаўнай царквы на Беларусі: мінулае і сучаснасць.
3. Каталіцызм на Беларусі (XIII — XIV стст., XV — XVII стст.).
4. Уніяцтва на Беларусі.
5. Рэлігійнае сектанцтва.
6. Рэлігія і мова.
7. Беларускія абразы.
8. Гісторыя крыжа Ефрасінні Полацкай.
9. Нетрадыцыйныя рэлігіі на Беларусі.
10. Агульныя рысы і асаблівасці абрадаў праваслаўя і каталіцызму.
11. Пратэстантызм на Беларусі: гісторыя і сучаснасць.
12. Рэлігійныя абрады і традыцыі ў побыце беларускага селяніна.
13. Свабода сумлення як адна з агульначалавечых і агульнадэмакратычных свабод.
14. Выданне кніг Бібліі Ф.Скарынам.
15. Гісторыя стварэння Бібліі.

## Практычныя заданні:

1. Азнаямленне з архітэктурнымі помнікамі — культавымі пабудовамі (на месцы жыхарства або знаходжання навучаль-

най установы; па кнізе "Гісторыя архітэктуры Беларусі").

2. Выраб макета культавай пабудовы — гістарычнага і архітэктурнага помніка Беларусі.

3. Азнаямленне з рэлігійнымі выданнямі на Беларусі — газетай "Царкоўнае слова", часопісам "Унія"; кнігамі Бібліі ў перакладзе Ф. Скарыны.

## ЛІТАРАТУРА:

### Асноўная


Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях. Закон Рэспублікі Беларусь // Звязда. 1993. 9 студз.

Абламейка С. Унія на Беларусі: Непарыўная сувязь стагоддзяў // Звязда. 1994. 22 крас.

Бабосов Е. Единая национальная церковь: миф или реальность? // Бел. думка. 1995. № 5. С. 12—17.

Беларусь в исторической, государственной и церковной жизни. Белорусский экзархат. Мн., 1990.

Библия. Книги Священного Писания Ветхого и Нового Завета. М., 1990.

Біблія: Пераклад і выданне Ф.Скарыны: У 3 т. Мн., 1991.

Вахрамееў К., мітрапаліт Філарэт: "Дацць волю краіне..." // Бел. мінуўшчына. 1993. № 1. С. 57—65.

Волошин А. О "белорусской" "народной" религии // 7 дней. 1996. № 3. С. 14.

Грыгаровіч І. І. Беларуская іерархія. Мн., 1992.

Грыгор'ева В., Навіцкі У., Філатава А. Уніяцтва на Беларусі ад Полацкага сабора 1839 г. і да нашых дзён // Бел. гіст. часопіс. 1996. № 2. С. 45—67.

Земляков Л. На трудных путях согласия: Религиозная ситуация в Беларуси: цифры и факты // Неман. 1995. № 9. С. 158—176.

Землякоў Л.Я. Рэлігійная сітуацыя ў Беларусі: праблемы і перспектывы // Нар. асвета. 1995. № 3. С. 54—65.

Корзун М.С. Русская православная церковь на службе эксплуататорских классов (X век — 1917 г.). Мн., 1984.

Краўчанка В. "Мае заступнікі...": Побыт беларуса і веравызнанне // Крыніца. 1992. № 5—6.

Круглов А. А. Религиозная обстановка в Республике Беларусь в современных условиях // Веснік БДУ. Сер. 3. 1993. № 2.

Лыч Л. Уніяцтва: Позірк у мінулае і сучаснасць // Наст. газ. 1993. 30 кастр. С. 5—6.

Міцкевіч А. М., Надольскі Р. В., Ярмоленка М. В. Кароткі курс гісторыі рэлігіі і царквы ў Беларусі: Вучэб. дап. Мн., 1995.

Польскі С. Рэлігійная геаграфія Беларусі // Беларусь. 1993. № 2. С. 18, каляр. уклад.

Протько Т. Репрессированная вера // Сов. Белоруссия. 1992. 8—14 авг., 24 сент.

Рапов О. М. Русская церковь в IX — первой трети XII в. Принятие христианства. М., 1988.

Рыбаков Б. Язычество Древней Руси. М., 1987.

Слюнькова І. Праваслаўныя манастыры Беларусі // Полымя. 1990. № 8. С. 215—229.

Тарасаў С. Прылучэнне да хрысціянства // Бел. гіст. часопіс. 1993. № 1.

Тарасаў С.В. Хрышчэнне Полацкай зямлі // Спадчына. 1990. № 3.

Філист Г. О "крещении" Белой Руси // Неман. 1988. № 9.
Шпакоўская В. Якая дарога вядзе да храма?: Аб манастыры ў Жыровічах // Беларусь. 1991. № 9. С. 26—29.

### Дадатковая

Анішчанка Я. "Усынаўленне", ці Як спрабавалі "ўз'яднаць" сялян-уніятаў // Спадчына. 1993. № 2.
Бейлькін Х. Веткаўскія раскольнікі // Бел. мінуўшчына. 1995. № 2. С. 44—47.
Боянков П. Жировичи: Летопись пяти веков // Неман. 1996. № 4. С. 143—152.
Будай Я., Землякоў Л. На шляху да свабоды сумлення // Полымя. 1994. № 4. С. 208—226.
Верещагина А. Конфессии: развитие в многообразии // Бел. думка. 1996. № 8. С. 54—59.
Грыгор'ева В. Каталіцкае і праваслаўнае духавенства ў паўстанні 1863 г. // Бел. гіст. часопіс. 1993. № 3. С. 46—50.
Деверин И. А. Литература Киевской Руси и церковь // АиФ. 1987. № 47. С. 6.
Конан У. Міфічныя вобразы і матывы ў паэзіі М.Багдановіча і Я. Коласа // Роднае слова. 1994. № 4.
Лакотка А. Мячэці Беларусі // Культура. 1993. № 46. С.5.
Лясун, лешы, лесавік: Бел. міфалогія // Беларусь. 1993. № 3. С.26.
Мараш Я. Н. Политика Ватикана и католической церкви в Западной Белоруссии (1918—1939 гг.). Мн., 1983.
Орлов В. Во власти Перуна и Сварога: О языч. верованиях наших предков // Дело (Восток + Запад). 1994. № 2—3. С. 45—47.
Палявік. Пушчавік. Пякельнікі // Беларусь. 1993. № 1. С. 23.
Ралес Р. Рэлігійныя святы яўрэяў // Бел.мова і літаратура ў школе. 1992. № 2. С.72—74.
Русалкі: Бел. міфалогія // Беларусь. 1993. № 9. С. 21.
Салавей Л. Пантэон багоў у міфалогіі беларусаў // Спадчына. 1992. № 3.
Смаляковіч М. Узаемаадносіны самадзяржаўя з каталіцкай царквой на Беларусі // Бел. гіст. часопіс. 1995. № 1.
Спарышка. Стрыга. Талака. Халера: Бел. міфалогія // Беларусь. 1993. № 8. С. 21.
Станкевіч Я. Беларускія мусульмане і беларуская літаратура арабскім пісьмом // Крыніца. 1994. № 11.
Трусаў А. Мураваныя сінагогі // Нар. газ. 1995. 11 студз.
Хатэнка А. З радаводу багоў паганьскіх // Роднае слова. 1993. № 9, 11.
Храмы: У истоков зодчества: Беседа канд. архитектуры И.Слюньковой и кор. В. Борисевича // Добры вечар. 1993. 3 лістап. С. 3.
Цярохін С.Ф. Многія пройдуць пад імем маім: Езуіты на Беларусі. Мн., 1995.
Чарняўскі М.М. Вогнепаклоннікі: Кніга для вучняў. Мн., 1989.

**Т а б л і ц а 5.1. Агульная колькасць рэлігійных абшчын на Беларусі**

| Рэлігійныя абшчыны | 1970 г. | 1992 г. | 1.09.94 г. | 1.01.95 |
|---|---|---|---|---|
| Агульная колькасць | 644[1] | 131[1] | 177[2] | 1866[3] |
| У тым ліку | | | | |
| праваслаўная царква | 382 | 744 | 863 | 902 |
| рымска-каталіцкая царква | 107 | 221 | 341 | 352 |
| стараабрадцы | | | 29 | 29 |
| пратэстанты | 153 | 348 | | |
| з іх | | | | |
| ЕХБ | | | 174 | 183 |
| ХВЕ | | | 242 | 261 |
| Адвентысты | | | 22 | |
| іудаізм | | | 14 | 15 |
| іслам | | | 13 | 15 |
| крышнаіты | | | | 7 |
| Іншыя | 2 | 1 | 74 | 102 |

[1] Беларусь. 1993. № 2. С.18.
[2] Нар. газ. 1994. 30 верас.
[3] Нар. газ. 1995. 18 студз.

**Т а б л і ц а 5.2. Размяшчэнне асноўных рэлігійных абшчын на Беларусі***

| Вобласць | 1970 г. | | | 1992 г. | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | БПЦ | РКЦ | Пратэст. | БПЦ | РКЦ | Пратэст. |
| Брэсцкая | 148 | 12 | 72 | 253 | 32 | 145 |
| Віцебская | 43 | 11 | 6 | 105 | 46 | 24 |
| Гродзенская | 76 | 71 | 24 | 119 | 136 | 28 |
| Гомельская | 44 | | 10 | 85 | 9 | 36 |
| Мінская | 49 | 13 | 25 | 137 | 51 | 81 |
| Магілёўская | 22 | | 16 | 45 | 4 | 34 |

* Беларусь. 1993. № 2. С.18.

Скарачэнні ў табліцах:
ЕХБ — Евангельскія хрысціяне-баптысты;
ХВЕ — Хрысціяне веры евангельскай;
БПЦ — Беларуская праваслаўная царква;
РКЦ — Рымска-каталіцкая царква.

# Тэма 6

# РАЗВІЦЦЁ АЙЧЫННАЙ ГРАМАДСКАЙ ДУМКІ

У гэтай тэме, як і ў тэмах 7—9, прапануецца разгледзець розныя аспекты духоўнай культуры Бацькаўшчыны, таму выкладчыку рэкамендуецца:

**па-першае**, выдзеліць у метадычным плане мэты і формы вывучэння некалькіх сумежных тэм;

**па-другое**, адзначыць тыя гістарычныя заканамернасці і асаблівасці развіцця грамадства, якія ўплывалі на розныя формы духоўнай творчасці; выдзеліць этапы развіцця грамадскай думкі;

**па-трэцяе**, звярнуць увагу на звесткі аб тых асобах, пра якія трэба будзе весці гаворку ў некалькіх ракурсах і па розных тэмах;

**па-чацвёртае**, падрыхтаваць вучэбна-наглядныя дапаможнікі, літаратуру і заданні для навучэнцаў, якія дапамогуць зразумець і засвоіць змест кожнай тэмы.

На вывучэнне тэмы "Развіццё айчыннай грамадскай думкі" пажадана прадугледзець ад 4 да 6 гадзін, у тым ліку на лекцыю (2 гадзіны) і на семінары або ўрокі (2—4 гадзіны). Праблема развіцця айчыннай грамадскай думкі з'яўляецца вельмі значнай, і пажадана тлумачыць яе даволі падрабязна, што звязана з цяжкасцю зместу, адсутнасцю дакладных метадычных распрацовак па тэме, уплывам грамадскай думкі на мастацтва, адукацыю, палітыку і г. д. Гэтыя асаблівасці вызначылі неабходнасць прапанаваць больш поўныя матэрыялы, чым па іншых тэмах.

У змесце тэмы рэкамендуецца вызначыць сутнасць паняцця "грамадская думка", асноўныя этапы развіцця грамадскай думкі на Беларусі ў розныя гістарычныя эпохі. У якасці плана лекцыі магчыма прапанаваць наступнае:

1) Грамадская думка Беларусі эпохі сярэднявечча;

2) Развіццё грамадскай думкі ў эпоху Адраджэння і Рэфармацыі. Асветніцтва на Беларусі;

3) Айчынная нацыянальна-дэмакратычная думка ў XIX — пачатку XX ст.;

4) XX ст.: праблемы і супярэчнасці развіцця грамадскай думкі на Беларусі.

Апошні пункт прапанаванага плана лекцыі адрозніваецца ад сфармуляванага ў праграме прадмета. На наш погляд,

больш мэтазгодным з'яўляецца разгляд пытання "Нацыянальная гістарычная адукацыя" ў тэме 9 "Нацыянальная адукацыя", а пытання аб пошуках уласнай парадыгмы развіцця грамадства — у тэме 11 "Станаўленне беларускай дзяржаўнасці".

Пачынаючы разгляд зместу тэмы, выкладчык павінен растлумачыць паняцце "грамадская думка" як частку духоўнага жыцця грамадства, духоўнай вытворчасці і грамадскай свядомасці, якія па сваіх змесце і форме носяць гістарычны характар. Грамадская думка адлюстроўвае прыроднае і сацыяльнае быццё, увасабляецца ў разнастайных ідэях, поглядах, паняццях, тэорыях і ўяўленнях асоб і розных сацыяльных груп (нацый, класаў, веруючых, атэістаў і г.д.). Грамадская думка распрацоўваецца вучонымі, ідэолагамі, палітыкамі, творчай інтэлігенцыяй, якія ствараюць духоўныя каштоўнасці — навуковыя і мастацкія творы, рэлігійныя і палітычныя трактаты або праграмы. Але не ўсе думкі, якія распрацаваны ў тым ці іншым грамадстве, набываюць грамадскі характар. Нейкая частка такіх думак (палітычных, навуковых, прававых, маральных, эстэтычных, рэлігійных і г.д.) можа быць не вядома — па тых ці іншых прычынах — у канкрэтным грамадстве і не падтрымана насельніцтвам, носіць скрытны, абмежаваны характар. Таму справядліва сцвярджаць, што грамадскімі трэба лічыць толькі тыя думкі, якія:

а) былі вядомы значнай (большай) частцы насельніцтва і знайшлі адлюстраванне ў дзейнасці народа, народнай творчасці;

б) рэалізоўваліся ў жыцці грамадства і станоўча ўплывалі на прагрэс;

в) апярэджвалі свой час і былі паспяхова выкарыстаны ў новых гістарычных умовах.

Пасля гэтых філасофска-гістарычных уводзін у тэму, выкладчык мае магчымасць выкарыстаць агульнакультурныя веды студэнтаў аб помніках грамадскай думкі. Так, выкладчык можа адзначыць, што першапачатковае адлюстраванне грамадская (палітычная, рэлігійная, філасофская, эстэтычная, педагагічная і г.д.) думка знаходзіла ў фальклоры — прыказках, прымаўках, прытчах, абрадавых гімнах, казках і былінах, а пасля — у літаратурных помніках. Важнае значэнне для развіцця грамадскай думкі народа мела ўвядзенне хрысціянства на Беларусі, пашырэнне пісьменнасці, развіццё эканамічных і культурных сувязей з Візантыяй і заходнееўрапейскімі краінамі. Да нашых дзён захаваліся асобныя граматы, надпісы і рукапісныя кнігі X—XII стст. — "Супрасльскі рукапіс", "Тураўскае евангелле", "Жыціе Ефрасінні Полацкай" і г. д., якія ўключаюць хрысціянскія ідэі аб чалавеку, яго месцы ў свеце і асноўных каштоўнасцях. Пры разглядзе асветніцкіх ідэй Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Клімента і Аўрамія са Смаленска выкладчык мае магчымасць пазнаёміць навучэнцаў з жыццёпісамі (агіябіяграфіямі) гэтых асоб, якія змешчаны ў вы-

данні "Кніга жыцій і хаджэнняў" (Мн., 1994). У якасці прыкладаў разнастайных жанраў грамадскай думкі магчыма адзначыць такія, як летапісы, жыцці, набожныя надпісы, ілюстраваныя рукапісы, словы, казанні.

Цікавыя грамадскія думкі змешчаны ў агульнаўсходнеславянскіх помніках культуры XII ст. — "Аповесці мінулых гадоў" і "Слове пра паход Ігаравы", якія распаўсюджваліся і на тэрыторыі Белай Русі. Напрыклад, у "Аповесці мінулых гадоў" падкрэсліваецца адзінства народа славянскага, змешчаны звесткі аб падзеях і на нашай зямлі; у мастацкім творы "Слова пра паход Ігаравы" аўтар паведамляе аб полацкіх князях (асабліва выразна аб Усяславе Полацкім), падкрэслівае значнасць еднасці ўсходніх славян у барацьбе за сваю незалежнасць (Гл.: Слово о полку Игореве. М.: Худ. лит., 1983. С.45, 71—73, 128, 154—155; Слова пра паход Ігаравы // Пер. Дз. Ліхачова, М. Забалоцкага, М. Рыльскага, Я. Купалы, Р. Барадуліна. Мн.: Маст. літ. 1986).

У XI—XII стст. на тэрыторыі нашай зямлі распаўсюджваліся рукапісныя кнігі, так званыя флорыгеліі — зборнікі фрагментаў, куды ўваходзілі вытрымкі з прац антычных філосафаў, у якіх адлюстроўваліся ідэі гуманізму, пытанні этыкі, эстэтыкі, хрысціянскія каштоўнасці. Рукапісныя кнігі былі даступны ў першую чаргу для заможных слаёў насельніцтва, і гэта своеасабліва ўплывала на свядомасць і грамадскія арыенціры. Значны ўплыў на культуру грамадства аказвалі язычніцкія традыцыі, хрысціянства, разнастайны эмпірычны вопыт, сувязі з замежжам.

Хрысціянская ідэалогія, якая ў часы сярэднявечча займала вядучае месца ў грамадскай думцы, прынесла на нашу зямлю не толькі плён асветніцтва, але і барацьбу супраць язычнікаў, чыя дзейнасць расцэньвалася як ерась. Фактычна хрысціянская царква падтрымлівала па асобных накірунках духоўны прыгнёт, не спрыяла з'яўленню новых грамадскіх ідэй, ажыццяўляла барацьбу з іншадумствам (напрыклад, каталіцкая царква выкарыстоўвала езуіцкія ордэны, інквізіцыю), стрымлівала развіццё навукі.

Адзначаныя вышэй прыклады развіцця грамадскай думкі ў сукупнасці з раней вывучанай праблематыкай аб фальклоры, народных святах і абрадах, веравызнаннях і рэлігіі, знакамітасцях нашай Бацькаўшчыны сведчаць аб станаўленні самабытнай духоўнай культуры беларускага народа, — такой выснову выкладчыка магчыма закончыць агляд першага пытання і перайсці да наступных пунктаў плана.

У час тлумачэння пытанняў аб эпохах Адраджэння і Асветніцтва, перыядаў Рэфармацыі і Контррэфармацыі пажадана ў працэсе гутаркі з навучэнцамі аднавіць гістарычныя веды аб гэтых эпохах і перыядах, удакладніць храналогію, становішча зямель Белай Русі (з XIII—XIV стст. беларускія землі з'яўляліся часткай тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага, Руска-

га і Жамойцкага; у XVI—XVIII стст. Вялікае княства Літоўскае знаходзілася ў складзе Рэчы Паспалітай). Рэкамендуецца падкрэсліць, што на нашай Бацькаўшчыне фарміравалася беларуская народнасць, беларуская мова выконвала дзяржаўныя функцыі, пашыраліся культурныя і іншыя сувязі з замежжам, узнікла і развівалася беларускае кнігадрукаванне.

Асабліва значныя зрухі ў большасці галін духоўнага жыцця Беларусі, у тым ліку ў развіцці грамадскай думкі, адбыліся ў канцы XV—XVI ст. Гэта быў перыяд росквіту рэнесансавай культуры ў Беларусі і ва ўсім Вялікім княстве Літоўскім, калі значна пашыраліся markdown рознабаковыя сувязі з Еўропай, узнікла кнігадрукаванне, распаўсюджваліся ідэі рэфармацыі, зніжалася роля рэлігіі ў духоўным жыцці, пашыраліся свецкія гуманістычныя і асветніцкія ідэі і г. д. Падрабязная характарыстыка гэтага перыяду змешчана ў "Нарысах гісторыі Беларусі" (Ч. 1. С. 178—200).

Для грамадскай думкі Беларусі XVI ст. характэрна развіццё ідэй гуманізму і вальнадумства, фарміраванне новых грамадскіх арыентацый, сцвярджэнне антырэлігійных каштоўнасцей. У якасці прыкладаў новых філасофскіх, сацыяльных, атэістычных і іншых ідэй, якія трэба пракаменціраваць у кантэксце эпохі і дзейнасці канкрэтнага чалавека, магчыма прывесці наступныя:

а) спробы паставіць пад сумненне артадаксальную хрысціянскую канцэпцыю паходжання свету, трактаваць духоўнае як атрыбут быцця (Ф. Скарына, М. Гусоўскі, С. Будны, Л. Зізаній);

б) матэрыялістычнае і атэістычнае вырашэнне праблемы паходжання свету (С.Лован, К.Лышчынскі);

в) у сферы этыкі чалавек пачынае разглядацца як істота маральная, інтэлектуальная, грамадская і актыўная (Ф. Скарына, М. Гусоўскі і інш.);

г) сцвярджэнне аўтарытэту права ў грамадстве, асуджэнне тыраніі і абвяшчэнне ідэалу адукаванага манарха (Ф. Скарына, М. Гусоўскі, С. Будны, А. Волан, Л. Сапега);

д) задачы барацьбы супраць нацыянальна-рэлігійнага прыгнёту, ідэі верацярпімасці (С. Будны, В. Цяпінскі, С. Зізаній, М. Сматрыцкі і інш.);

е) антыфеадальныя і наіўна-камуністычныя ідэі эпохі Адраджэння — знішчэнне прыгонніцтва, ліквідацыя прыватнай уласнасці, сацыяльнай няроўнасці (Пётр з Ганендза, Марцін Чаховіц, Якуб з Калінаўкі і інш.);

ж) вядзенне палемікі з прадстаўнікамі дзяржаўных рэлігій — каталіцызму, уніі (М. Сматрыцкі — у ранні перыяд, Л. Карповіч, А. Філіповіч і інш.).

У той жа час існавалі сацыяльна-палітычныя і філасофскія погляды феадальна-каталіцкіх вярхоў, якія выказвалі і абаранялі П. Скарга, І. Пацей, М. Лашч і інш.

Грамадскія думкі выказваліся ў розных жанрах — палемічнай публіцыстыцы, прадмовах і пасляслоў'ях, эпіграмах,

дыярыушах, допісах, мемуарах, каментарыях, навучальных трактатах і г. д. Сярод гэтых твораў вылучаліся Баркалабаўскі летапіс, Дзённік Ф. Еўлашоўскага, працы Стэфана і Лаўрэнція Зізаніяў, М. Сматрыцкага, А. Філіповіча і інш.

У XVI—XVIII стст. у Беларусі ўзмацняліся асветніцкія тэндэнцыі ў развіцці грамадска-палітычнай думкі. Асветніцтва як ідэалогія новага часу прыйшло на Беларусь у XVIII ст., калі на змену старым уяўленням часоў контррэфармацыі — чалавеку старых правіл, набожнаму, ненавісніку чужога і новага — ішлі ідэалы асветы, розуму, навукі. Асаблівая ўвага звярталася на розум чалавека, яго рацыяналізм і скептыцызм, крытыку рэлігіі, адкрытасць дасягненням сусветнай культуры і рэфарматарству.

Значную ролю ў фарміраванні новага светапогляду адыгралі творы заходнееўрапейскіх (Ж.-Ж. Русо, Ф. Вальтэра, Р. Дэкарта, Д. Лока), рускіх (А. Радзішчава) і іншых асветнікаў, якія распаўсюджваліся на Беларусі.

Мысліцелі і асветнікі нашай зямлі асэнсоўвалі праблемы існавання прыроды, чалавека і грамадства, абумоўлівалі развіццё навукі адыходам ад тэалогіі. Напрыклад, ідэі С. Шадурскага, А. Скарульскага, К. Нарбута, Б. Дабшэвіча накіроўваліся супраць царкоўнага засілля, схаластыкі, адстойвалі права на вальнадумства, на прыродныя правы чалавека. І. Храбтовіч, А. Тызенгаўз, І. Страйноўскі з'яўляліся паслядоўнікамі вучэння фізіякратаў —аднаго з накірункаў класічнай палітычнай эканоміі XVIII ст. — і выказвалі ідэі аб развіцці грамадства па законах "натуральнага парадку", прызнанні аб'ектыўнай рэчаіснасці знешняга свету, дабаўленай вартасці ў земляробстве і г.д. — гэта адбывалася ў русле распаўсюджвання філасофіі і навуцы Новага часу. Асветніцкія ідэі адлюстраваны ў творчасці Я. Снядэцкага (адначасова з ідэяй эвалюцыянізму), Д. Пільхоўскага; сінтэз асветніцкіх і рамантычнага светапоглядаў намеціўся ў творчасці Л. Бароўскага і Я. Славацкага, якія далей развівалі Я. Чачот, Т. Зан, П. Яжоўскі і інш.

У канцы XVIII ст. землі Беларусі былі ўключаны ў склад Расіі. Зразумела, што на духоўнае жыццё ў гэты час уплывалі расійская рэчаіснасць, руская культура, а таксама еўрапейскія грамадска-палітычныя ідэі і падзеі. У сацыяльнай думцы 20—40-х гадоў XIX ст. выявіліся дзве тэндэнцыі: ідэалагічнае (тэарэтычнае) абгрунтаванне неабходнасці ліквідаваць феадальна-прыгонніцкія адносіны, якія гістарычна зжылі сябе (М.Баловіч, Ф. Савіч, Ш. Канарскі, браты А. і Ф. Далеўскія і інш.), і іх апалагетыка (Г. Ржавускі, І. Галавінскі, К. Буйніцкі і г.д.).

У 30—40-я гады XIX ст. адбываўся працэс радыкалізацыі сацыяльнай думкі Беларусі, яе рух улева, абумоўлены ростам класавай барацьбы ў беларускай вёсцы, асэнсаваннем прычын паражэння паўстанняў 1825, 1830—1831 гг., а таксама глыбокім уплывам рэвалюцыйнай ідэалогіі польскага вызваленчага руху. Некаторыя мысліцелі (М. Лавіцкі, В. Давід, Э. Жалігоўскі) імкну-

ліся абгрунтаваць значэнне філасофіі не толькі для пазнання, але і для пераўтварэння свету. Сваю ролю ў фарміраванні грамадскай свядомасці адыграла дзейнасць беларускіх пісьменнікаў, фалькларыстаў (Я. Чачот, Я. Баршчэўскі, А. Рыпінскі, І. Храпавіцкі, У. Сыракомля і інш.), творчасць якіх садзейнічала пачатку культурнага самавызначэння беларускай нацыі. Так, В. Дунін-Марцінкевіч прызнаваў існаванне самастойнага беларускага этнасу, нацыянальнай мовы і культуры беларусаў. Гэта знайшло адлюстраванне ў яго творчасці.

Істотнай асаблівасцю існавання беларускага этнасу (і адначасова яго грамадскай думкі) у параўнанні з рускімі, палякамі, літоўцамі быў падзел іх уладамі царскай Расіі і Рэчы Паспалітай, дзяржаўнымі цэрквамі гэтых краін па веравызнанні на праваслаўных і каталікаў, які шырока выкарыстоўваўся ў мэтах русіфікацыі і паланізацыі беларускага насельніцтва. І праваслаўная царква, і каталіцкі касцёл на працягу амаль усёй сваёй гісторыі не прызнавалі існавання беларускага этнасу, не дапускалі беларускую мову ў сваю дзейнасць (толькі ў 90-я гады XX ст., калі быў прыняты Закон аб мовах, адбыліся змены ў гэтым накірунку), даказвалі, што беларусы-праваслаўныя ёсць рускія, а беларусы-каталікі — адпаведна палякі. Пасля скасавання ў 1839 г. Брэсцкай (Берасцейскай) царкоўнай уніі і прымусовага далучэння уніятаў да дзяржаўнай царквы праваслаўныя сталі сярод беларусаў значнай большасцю (у 1897 г. — 81,2%). Каталікі складалі ў Заходнім краі 18,8% ад беларускага насельніцтва (Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 1. С. 333).

Выдатным прадстаўніком рэвалюцыйна-дэмакратычнага накірунку ў грамадскай думцы другой паловы XIX ст. быў К. Каліноўскі, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863—1864 гг. на Беларусі і ў Літве. Характэрныя бакі праграмы К. Каліноўскага — вострая сацыяльная крытыка, заклік да ўзброенай барацьбы, тэндэнцыя да знішчэння існуючых форм эканамічнай і сацыяльнай залежнасці працоўнага народа, імкненне да такога грамадства, у якім бы працоўны народ займаў вядучае месца. Важную ролю ў тлумачэнні вельмі складаных грамадска-палітычных пытанняў і фарміраванні грамадскай свядомасці выконвала газета "Мужыцкая праўда" — першая ў краіне рэвалюцыйна-дэмакратычная газета, заснаваная К. Каліноўскім, В. Урублеўскім, Ф. Ражанскім (у 1862—1863 гг. былі нелегальна надрукаваны і распаўсюджаны 7 нумароў газеты ў Гродзенскай, Віленскай, Віцебскай і Мінскай губернях). Так, у чацвёртым нумары газеты К. Каліноўскі сфармуляваў адзін з важнейшых прынцыпаў рэвалюцыйнай дэмакратыі адносна дзяржаўнага будаўніцтва: "... не народ зроблены для ўрада, а ўрад для народа" (Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 1. С. 322—323).

К. Каліноўскі патрабаваў дзяржаўнай самастойнасці для Беларусі і Літвы, пратэставаў супраць русіфікатарскай палітыкі царызму ў школах Беларусі, прызнаваў нацыянальным веравызнаннем беларускага народа уніяцтва.

Частка насельніцтва нашай зямлі падтрымала ідэі К. Каліноўскага сваім актыўным ўдзелам у паўстанні. Але рэалізаваць сваю праграмму паўстанцы не змаглі. Паўстанне 1863—1864 гг. было падаўлена царскімі войскамі.

Пасля падаўлення паўстання рэзка ўзмацнілася ідэалагічна-русіфікатарская апрацоўка беларускага насельніцтва праз царкву, асвету, друк, дзяржаўныя ўстановы. Таму ўмовы распаўсюджання нацыянальнай грамадскай думкі на Беларусі былі значна абмежаваны і знайшлі частковае адлюстраванне ў літаратуры, мастацтве, некаторых навуковых працах, у дзейнасці рэвалюцыйных груп (нелегальных).

Дэмакратычныя, рэалістычныя прынцыпы ў літаратуры характэрны для творчасці Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, А. Гурыновіча (апошні меў сувязі з групай "Вызваленне працы" Г. Пляханава), аўтараў паэм "Энеіда навыварат" і "Тарас на Парнасе" (у наш час выказваюцца думкі пра тое, што найбольш верагоднымі аўтарамі гэтых твораў былі адпаведна В. Равінскі і К. Вераніцын).

У 60—90-я гады XIX ст. былі сабраны і апублікаваны гістарычныя, этнаграфічныя даследаванні, фальклорныя запісы вучоных (І. Насовіча, Ю. Крачкоўскага, Я. Карскага, М. Федароўскага, Е. Раманава, М. Доўнар-Запольскага, М. Янчука і інш.), якія аб'ектыўна засведчылі факт існавання самастойнага беларускага этнасу і адначасова ўплывалі на развіццё беларускага навуковага беларусазнаўства (аб зараджэнні беларусазнаўства як часткі славістыкі змястоўныя матэрыялы надрукаваны ў "Нарысах гісторыі Беларусі". Ч. 1. С. 298—300). Навуковыя даследаванні былі вядомы частцы інтэлігенцыі, беларускай студэнцкай моладзі — гэта ўплывала на фарміраванне грамадскай свядомасці і нацыянальнай самасвядомасці часткі насельніцтва. Так, у 1884 г. група беларускай моладзі, якая вучылася ў Пецярбурзе, выдала на гектографе 2 нумары нелегальнага народніцкага часопіса "Гоман". У другім нумары гэтага выдання адзначалася, што "... асаблівасці Беларусі даюць права на аўтаномную федэратыўную самастойнасць у сям'і іншых народаў Расіі" (Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 1. С. 345). Таксама былі выдадзены на рускай мове адозвы "Да беларускай моладзі", "Да беларускай інтэлігенцыі", "Пісьмы пра Беларусь".

У 70—80-я гады XIX ст. пачыналі дзейнічаць народніцкія гурткі рэвалюцыйна настроенай інтэлігенцыі (напрыклад, беларуская фракцыя "Народнай волі", дзе адным з заснавальнікаў быў І. Грынявіцкі, гурткі ў Мінску, Магілёве, Гародне, Пінску, Віцебску, Оршы, Слуцку; у мінскіх гуртках пад кіраўніцтвам Я.Хургіна было аб'яднана да 20 інтэлігентаў і каля 160 рабочых), а таксама марксісцкія гурткі і групы, што цесна звязана з фарміраваннем рабочага класа і развіццём сацыял-дэмакратычнага руху (так, першы марксісцкі гурток быў створаны ў Мінску ў 1884 г. студэнтам Э. Абрамовічам; ў 1879—1880 гг. у Мінску двойчы быў Г.Пляханаў; у 1898 г. адбыўся

I з'езд РСДРП). На грамадскую думку ўплывалі і розныя нацыянальныя арганізацыі, якія ўзніклі ў канцы XIX — пачатку XX ст.: Літоўская сацыял-дэмакратычная партыя (1896), Рабочы саюз Літвы (1896), Бунд — усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Польшчы і Расіі (1897), Польская сацыялістычная партыя, Рабочая партыя палітычнага вызвалення Расіі (1897), Сацыял-дэмакратыя Каралеўства Польскага і Літвы (1900), Сацыялістычная партыя Белай Русі (1904), Партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (1902) і інш. Падрабязная характарыстыка праграм розных палітычных партый змешчана ў дапаможніках па паліталогіі і гісторыі.

Гэтыя нелегальныя рэвалюцыйныя накірункі вялі сваю прапаганду, распаўсюджвалі літаратуру і газеты, стваралі гурткі, кіравалі маніфестацыямі, стачкамі і г.д.

У пачатку XX ст. рэвалюцыйную дэмакратыю прадстаўлялі Я. Купала, Я. Колас, А. Пашкевіч (Цётка), якія выступалі ад імя ўсяго працоўнага народа як ідэолагі нацыі. На іх творчасць і светапогляд значна ўплывалі як агульнадэмакратычныя патрабаванні (знішчэнне самадзяржаўя, дэмакратызацыя грамадскага жыцця, ліквідацыя памешчыцкага землеўладання, надзел сялян зямлёй і інш.), так і нацыянальныя асаблівасці (свабоднае развіццё беларускай культуры і мовы, пашырэнне нацыянальнай асветы і г.д.).

Пэўную ролю ў развіцці грамадскай думкі на Беларусі адыгралі мясцовыя перыядычныя выданні — газета "Наша Доля" і "Наша Ніва", "Северо-Западный край", "Минский листок", "Голос провинции" і інш.; календары, агітацыйныя брашуры.

Асабліва значны ўздым рэвалюцыйнага руху рабочых і сялян Беларусі адбыўся напярэдадні і ў перыяд буржуазна-дэмакратычных рэвалюцый, калі розныя палітычныя сілы аб'ядноўваліся пад адзінымі лозунгамі ў барацьбе супраць самадзяржаўя, за дэмакратычныя свабоды і рэспубліку, права нацый на самавызначэнне. Менавіта такія патрабаванні вызначылі бліжэйшыя мэты розных сацыял-дэмакратычных і леванародніцкіх партый і арганізацый. Але, як вядома з гістарычных падзей, ідэйна-палітычнага адзінства паміж імі не было. Партыі арыентаваліся на розныя класы і слаі грамадства ў рэвалюцыйнай барацьбе, мелі розныя погляды на сацыялізм і шляхі яго дасягнення, істотна разыходзіліся яны па пытаннях стратэгіі і тактыкі барацьбы. Названыя вышэй партыі і арганізацыі кіраваліся інтарэсамі сялянства, пралетарыяту, розных дэмакратычных слаёў насельніцтва.

У якасці ідэолага і палітычнага кіраўніка беларускага нацыянальна-вызваленчага руху выступіла леванародніцкая Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ), заснаваная ў снежні 1902 г. (цікавыя звесткі аб дзейнасці БСГ змешчаны ва ўспамінах А. Луцкевіча "За дваццаць пяць гадоў". Мн.: Бел Эн 1991). Асноўным аб'ектам дзейнасці БСГ з'яўлялася вёска — сельскія рабочыя і сяляне-падзёншчыкі, сярод якіх распаўсюджваліся

лістоўкі, праводзіліся палітычныя сходы, мітынгі, былі арганізаваны сельскагаспадарчыя забастоўкі. Пасля паражэння рэвалюцыі 1905—1907 гг. кіраўнікі БСГ засяродзіліся на легальнай дзейнасці ў газеце "Наша Ніва", сышлі на асветніцкія пазіцыі. Асаблівую ўвагу "Наша Ніва" і лідэры БСГ звярталі на барацьбу за ўсебаковае нацыянальна-культурнае адраджэнне беларускага народа, за прызнанне самога факта яго існавання, за раўнапраўнасць з іншымі народамі. На падставе гэтых ідэй абуджалася беларуская інтэлігенцыя, аб'ядноўвалася вакол "Нашай Нівы" як цэнтра нацыянальнага адраджэння.

Але на шляху нацыянальнага адраджэння былі значныя цяжкасці і складанасці. Дзяржаўныя ўлады, праваслаўная царква, шавіністычны друк, афіцыйная школа, рускія і польскія партыі і арганізацыі дзейнічалі ў накірунку далейшай асіміляцыі беларускага народа. У такіх умовах было немагчыма аб'яднаць значную частку беларускага грамадства на агульных ідэях барацьбы за незалежнасць і самастойнасць.

І толькі ў далейшым, калі царскае самадзяржаўе было звергнута, з'явіліся новыя ўмовы для пашырэння дзейнасці нацыянальных арганізацый, для ўздыму беларускага нацыянальнага руху, распрацоўкі ідэй аб беларускай дзяржаўнасці.

Станаўленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці характарызавалася як ідэйнай барацьбой, так і жорсткім супрацьборствам розных палітычных сіл. Кожны палітычны рух і партыя (ліберальна-буржуазныя партыі; сацыял-дэмакратычныя — бальшавікі, меншавікі, сацыялісты-рэвалюцыянеры; нацыянальныя і інш.) выпрацоўвалі і прапагандавалі сваю стратэгію і тактыку з улікам абставін, ступені свайго аўтарытэту і сувязей з рознымі сацыяльнымі групамі насельніцтва.

Да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. беларускі нацыянальны рух цвёрда стаяў на пазіцыі аўтаноміі Беларусі ў складзе Расіі. У далейшым, калі значная тэрыторыя Беларусі была акупавана германскімі войскамі і пачыналася грамадзянская вайна, розныя палітычныя сілы змянілі свае падыходы да праблемы нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, што прывяло да абвяшчэння Беларусі як нацыянальнай дзяржавы ў 1918—1919 гг. у формах БНР і ССРБ (БССР), а таксама аб'яднанай Літоўска-Беларускай рэспублікі.

У далейшым, як сведчыць гісторыя, працяглы час існавала Беларуская ССР, якая ў перыяд 1922—1991 гг. уваходзіла ў склад Саюза ССР. У савецкі час, калі існавала аднапартыйная сістэма, камуністычная партыя абапіралася на марксісцка-ленінскую ідэалогію, на падставе якой і маглі выказвацца тыя ці іншыя думкі аб шляхах дасягнення праграмных мэт — пабудовы сацыялізму і камунізму. Калі вырашаліся ў 20—30-я гады вельмі складаныя пытанні сацыяльнага характару (увядзенне новай эканамічнай палітыкі, індустрыялізацыя, падрыхтоўка і правядзенне калектывізацыі, развіццё нацыянальнай эканомікі і культуры, беларусізацыя і г. д.), праводзіліся

ўнутрыпартыйныя дыскусіі, у ходзе якіх выказваліся даволі супярэчлівыя думкі. Але ў 30-я гады, калі значна ўмацавалася дыктатарска-таталітарная сістэма ў СССР, склалася рэгламентацыя грамадска-палітычнага жыцця, узнік даволі жорсткі кантроль за працай вучоных-грамадазнаўцаў, творчасцю літаратараў і дзеячаў культуры, і паступова выпрацоўвалася афіцыйнае адзінства думак, якое прапагандавалася партыйна-дзяржаўнымі структурамі як "вялікае дасягненне ў сацыялістычным будаўніцтве".

У гэты час, калі вельмі супярэчліва спалучаліся працоўны энтузіязм народа і яго страх перад беззаконнем, рэпрэсіямі, вера ў І. В. Сталіна і няведанне таго, што ён з'яўляўся галоўным ініцыятарам масавых рэпрэсій, было немагчыма адкрыта выказаць тыя думкі, што адрозніваліся ад афіцыйных. У часы сталінскіх рэпрэсій Беларусь панесла вялікія інтэлектуальныя страты, што ўплывала на развіццё грамадскай думкі вельмі адмоўна.

У своеасаблівых умовах фарміравалася грамадская думка беларусаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі, калі яна знаходзілася ў 1921—1939 гг. у складзе Польшчы; сярод беларусаў-эмігрантаў; у беларусаў, якія апынуліся ў часы другой сусветнай вайны на акупаванай тэрыторыі.

Працэс развіцця навукова-грамадскай думкі на Беларусі ў савецкі час паказаны (з пункту гледжання тых часоў) у Беларускай савецкай энцыклапедыі (Гл.: Т. 12. С. 408—451, 530—586), у "Нарысах гісторыі Беларусі" (Ч. 2. Мн., 1995).

Новыя ўмовы развіцця грамадскай думкі на Беларусі склаліся ў час адлігі 50-х гадоў, у перыяд так званай перабудовы і пасля скасавання кіруючай ролі КПСС—КПБ у грамадстве. У апошнія часы існавання Саюза ССР пачыналі фарміравацца ўмовы для існавання шматпартыйнай сістэмы, дэмакратычнай прэсы, плюралізму поглядаў. Гэтыя накірункі развіцця грамадства рэалізуюцца на практыцы ў Рэспубліцы Беларусь, якая абвешчана суверэннай дзяржавай. Прыклады розных поглядаў на развіццё беларускага грамадства выкладчык мае магчымасць прывесці, спасылаючыся на праграмы розных палітычных партый, матэрыялы паліталагічных і сацыялагічных цэнтраў, публікацыі газет і часопісаў. Гэтымі прыкладамі і вывадамі па тэме можна завяршыць лекцыю.

Пры падвядзенні вынікаў вывучэння тэмы пажадана падкрэсліць асноўныя этапы фарміравання грамадскай думкі Беларусі, значнасць дзейнасці тых выдатных асоб, ідэі і погляды якіх якасна ўплывалі на развіццё грамадства. Асаблівую ўвагу студэнтаў і навучэнцаў раім звярнуць на ідэі дзяржаўнасці беларусаў, незалежнасці, нацыянальнага адраджэння.

У час падрыхтоўкі да заняткаў па гэтай тэме раім выкарыстаць энцыклапедычныя даведнікі "Мысліцелі і асветнікі Беларусі" (Мн., 1995), "Францыск Скарына і яго час" (Мн., 1988), "Курс лекцый па паліталогіі" (Мн., 1995. С. 38—49), дзе змешчаны матэрыял аб эвалюцыі палітычнай думкі на Бела-

русі; таксама творы філасофскай і грамадска-палітычнай думкі розных гістарычных перыядаў, працы У. Арлова, М. Біча, Э. Дарашэвіча, С. Падокшына, В. Шалькевіча і інш.

По тэме рэкамендуюцца кантрольныя пытанні для навучэнцаў, практычныя заданні і рэфераты.

## Кантрольныя пытанні:

1. На якія асноўныя перыяды ўмоўна падзяляецца гісторыя грамадскай думкі Беларусі?

2. У чым гістарычныя асаблівасці кожнага з перыядаў развіцця грамадскай думкі Беларусі? Якія асноўныя ідэі характэрны для кожнага з перыядаў?

3. У чым была сутнасць поглядаў Ф.Скарыны? У чым значэнне яго ідэй?

4. Якія грамадска-палітычныя погляды выказваў К.Каліноўскі?

5. Калі і чаму пачалося зараджэнне навуковага беларусазнаўства?

6. Якія агульнадэмакратычныя ідэі аб'ядноўвалі сацыял-дэмакратычныя партыі і рухі ў барацьбе супраць самадзяржаўя?

7. Хто і чаму прытрымліваўся марксісцкай думкі на Беларусі на рубяжы XIX—XX стст.?

8. Якія грамадскія ідэі характэрны для творчасці класікаў беларускай літаратуры Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча ў розныя перыяды іх творчасці?

9. У чым былі, на Ваш погляд, асаблівасці развіцця грамадазнаўства і навуковай гістарычнай (філасофскай, паліталагічнай, эстэтычнай і г.д.) думкі ў часы існавання БССР?

10. Якія сучасныя грамадскія ідэі, на Ваш погляд, могуць аб'яднаць беларускае грамадства ў мэтах пераадолення крызісу і набліжэння да найбольш развітых краін?

## Практычныя заданні:

1. Азнаёміцца са зместам уступаў Ф. Скарыны да Біблейскіх кніг.

2. Правесці параўнальны аналіз твораў сучасных публіцыстаў (па часопісах і газетах Беларусі).

3. Скласці анатацыю на адзін з выпускаў беларускага грамадскага, грамадска-палітычнага, гістарычнага часопіса або штотыднёвіка (па выбару: "Спадчына", "Беларускі гістарычны часопіс", "Беларуская мінуўшчына", "Беларуская думка", "Беларусь", "Культура", "Літаратура і мастацтва", "Весці АН Беларусі (гуманітарная серыя)", "Веснік БДУ" і інш.).

4. Правесці аналіз тэкстаў праграм палітычных партый і рухаў, кандыдатаў на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, выдзеліць галоўныя мэты развіцця беларускага грамадства.

5. Азнаёміцца з літаратурнымі творамі прадстаўнікоў бела-

рускага замежжа, адзначыць іх адносіны да Бацькаўшчыны і шляхоў яе развіцця.

6. Сфармулюйце свае думкі па праблемах:

а) шляхі распаўсюджвання і ўмацавання беларускай мовы ў нашым грамадстве;

б) ці патрэбна на шляху адраджэння нацыянальная рэлігія?

в) ідэі нацыянальнага адраджэння 20-х гадоў і сучаснасць;

г) палітычныя партыі Беларусі і нацыянальнае адраджэнне.

## Тэматыка рэфератаў:

1. Грамадскія ідэі ў Малітоўнай паэзіі Кірылы Тураўскага.
2. Прадмовы і пасляслоўі Ф. Скарыны.
3. Ідэі гуманізму і патрыятызму ў творчасці М. Гусоўскага.
4. Дзейнасць Сымона Буднага і яго палеміка з дзеячамі рэфармацыі.
5. Ідэі патрыятызму ў гісторыка-хранікальных творах Мацея Стрыйкоўскага.
6. Літаратурна-рэлігійная палеміка ў канцы XVI —пачатку XVII ст.
7. З гісторыі зараджэння навуковага беларусазнаўства ў першай палове XIX ст.
8. Грамадска-палітычныя погляды К.Каліноўскага.
9. Нацыянальна-дэмакратычная думка Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст. (у часы першай сусветнай вайны).
10. Сацыял-дэмакратычная думка Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст.
11. Праграмныя мэты Беларускай сацыялістычнай грамады і іх рэалізацыя ў часы рэвалюцыі 1905—1907 гг. (лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г.).
12. Марксісцкая думка на Беларусі (80-я гады XIX ст. — пачатак XX ст.; у савецкі час).
13. Грамадскія матывы ў творчасці Я. Купалы (Я. Коласа, М. Багдановіча, М. Танка, Н. Гілевіча, Г. Бураўкіна і інш.).
14. Інтэлектуальныя страты Беларусі ў часы сталінскіх рэпрэсій.
15. Развіццё філасофскай (гістарычнай, эстэтычнай, атэістычнай, паліталагічнай і г.д.) думкі ў БССР.
16. Беларуская публіцыстыка часоў перабудовы і нацыянальнага адраджэння: А. Адамовіч, В. Акулаў, В. Быкаў, Л. Лыч, А. Майсеня, З. Пазьняк, А. Саламонаў, В. Чыкін і інш.).
17. Творчасць У. Караткевіча і яе ўплыў на нацыянальную культуру, грамадскую думку.
18. Сучасныя беларускія паэты і пісьменнікі пра сэнс жыцця і прызначэнне чалавека (В. Быкаў, А. Разанаў, У. Ліпскі, А. Адамовіч).

# ЛІТАРАТУРА:

## Асноўная


Адамовіч А. М. Апакаліпсіс па графіку. Мн., 1992.

Бабосов Е. М., Матусевич А. В. Самодеятельные общественные движения: их социально-политические ориентации и характер деятельности. Мн., 1989.

Багдановіч А. Г. Ідэя дзяржаўнасці ў грамадска-палітычнай думцы Беларусі (1914 — сакавік 1917 г.) // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь. Ч. 2. Мн., 1995. С. 136—141.

Бирало А. А. Философская и общественная мысль в Белоруссии и Литве в конце XVII — середине XVIII в. Мн., 1971.

Біч М. Аб нацыянальнай канцэпцыі гісторыі і гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь // Бел. гіст. часопіс. 1993. № 1.

Бліхарж Р. І. і інш. Філасофія: Кароткі курс лекцый. Мн., 1993. С. 41—43.

Дварчанін І. С. Францішак Скарына — як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве / Пер. з чэш. мовы. Мн., 1991.

Дорошевич Э. К. Философия эпохи Просвещения в Белоруссии. Мн., 1971.

Жлутка А. Лацінская літаратура як феномен беларускай культуры // Спадчына. 1993. № 2.

Игнатенко И. М. Февральская буржуазно-демократическая революция в Белоруссии. Мн., 1986.

Идеи гуманизма в общественно-политической и философской мысли Белоруссии: Дооктябрьский период. Мн., 1977.

Из истории свободомыслия и атеизма в Белоруссии. Мн., 1978.

Калиновский К. Из печатного и рукописного наследия. Мн., 1988.

Конон В. Н. От Ренессанса к классицизму. Мн., 1977.

Кніга жыццяў і хаджэнняў / Пер. са старажытнарус., старабел. і польск.; Уклад., прадм. і каментарыі А. Мельнікава. Мн., 1994.

Лойко О. Скорина. М., 1989.

Лыч Г., Шчэрбін В. Гуманітарныя і сацыяльныя навукі ў Беларусі: стан і праблемы развіцця // Бел. думка. 1996. № 3. С. 30—36.

Михнюк В. Н., Петриков П. Т. Историческая наука БССР. 80-е годы. Мн., 1987.

Михнюк В. Н. Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии. 1919—1941 гг. Мн., 1985.

Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X—XIX стагоддзі: Энцыкл. даведнік / Склад. Г. А. Маслыка. Мн., 1995.

Октябрь 1917 г. в судьбах политической оппозиции: В 3 ч. / Под общ. ред. Э. М. Энтина. Гомель, 1993.

Падокшын С. А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: Ад Ф. Скарыны да С. Полацкага. Мн., 1990.

Развитие марксистско-ленинской философии в БССР (20—70-е гг.). Мн., 1984.

Савастюк А., Антонова Т. Общенациональная идея: новое видение // Бел. думка. 1996. № 12. С. 34—36.

Скарына Ф. Творы: Прадмовы, казанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія. Мн., 1990.

Сокол С. Ф. Политическая и правовая мысль в Белоруссии XVI — первой половины XVII вв. Мн., 1984.

Сташкевич Н. С. На пути к истине: Из истории национально-освободительного движения в Белоруссии: 1917 год. Мн., 1983.

Францыск Скарына і яго час: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1988.

Шалькевіч В. Філасофская думка ў Беларусі. Мн., 1976.

### Дадатковая

Алелькавіч Л. Беларускія дысідэнты XVI стагоддзя // Добры вечар. 1992. 8, 9, 13 ліп.

Арлоў У. "Муж дабраверны, царкве і дзяржаве патрэбны...": Жыццё і творчасць С.Полацкага // Роднае слова. 1992. № 10—11.

Біч М. Нацыянальнае і аграрнае пытанні ў час паўстання 1863—1864 гг. // Бел. гіст. часопіс. 1993. № 3. С. 36—45.

Беларускія пісьменнікі: Бібліягр. сл.: У 6 т. Т. 1—6. Мн., 1992—1995.

Величко В. Нужна ли обществу идеология? // Бел. думка. 1996. № 5. С. 18—22.

Домжа А. А. Цывілізатарская місія дэмакратычнага грамадства // Весці АН Беларусі. Серыя гуманіт. навук. 1993. № 2.

Дыярыуш князя Міхаіла Казімера Радзівіла // Спадчына. 1995. № 3—5.

Козляков В. Идеи социализма и белорусское национальное Возрождение // Бел. думка. 1996. № 2. С. 114—124.

Кушнер В. Гістарычная адукацыя і палітыка // Бел. гіст. часопіс. 1996. № 4.

Памятники философской мысли Белоруссии XVII — первой половины XVIII вв. Мн., 1991.

Прыбытка Г. Беларускія асветнікі XVI—XVII стагоддзяў у Маскве // Роднае слова. 1992. № 7—9.

Таляронак С. "...Молім аб перамозе Банапарта": Грамадска-палітычны рух на Беларусі напярэдадні вайны 1812 г. // Настаўніцкая газета. 1994. 28 мая. С. 2.

Тамушанскі Р. Анёл Доўгірд — філосаф з Вільні / Пер. з англ. мовы // Спадчына. 1994. № 5.

Челядинский А. Не сбиться с пути к выживанию: О некоторых тенденциях общественного развития Беларуси // Бел. думка. 1993. № 3.

Шалькевіч В. Ф. З гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі ў першай трэці XIX ст. // Веснік БДУ. Серыя 3. 1992. № 2.

#### Літаратуразнаўства

Гарэцкі М. Гісторыя беларускай літаратуры. Мн., 1992.

Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Т.1—2. Мн., 1968.

Гісторыя беларускай савецкай літаратуры. Т. 1—2. Мн., 1965—1966.

Камінская Л. З Багацькаўкі родам...: Да 100-годдзя М.Гарэцкага // Беларусь. 1993. № 2. С. 16—17.

Коваленко В. Трагическая мечта о буйном колошении...: Философия национальной жизни в творчестве М.Горецкого // Неман. 1995. № 3.

Лабынцаў Ю.А. "Напой росою благодати...": Малітоўная паэзія Кірылы Тураўскага. Мн., 1992.

Мархель У. І. Лірнік вясковы: пра паэта У. Сыракомлю. Мн., 1983.

Рудович С. Глашатай белорусской идеи // Неман. 1995. № 10—11.

Тычына М. Курапаты — Хатынь — Чарнобыль: Савецкая гісторыя ў люстэрку літаратуры // Роднае слова. 1994. № 2—3.

Тычына М. Карані і крона: Крытычны артыкул аб бел. літаратуры // Беларусь. 1993. № 9. С. 28.

Фядосік А. С. Антырэлігійныя матывы ў беларускім фальклоры. Мн., 1963.

Цішчанка І. К. Да народных вытокаў: Збіранне і вывучэнне беларускага фальклору ў 50—60-я гады XIX ст. Мн., 1986.

#### Літаратура беларускага замежжа

Акула К. Россыпы. З "Запісак Яўхіма Крайняга" // Роднае слова. 1994. № 7—8.

Арлоў У. Змагарныя шляхі Кастуся Акулы // Роднае слова. 1993. № 7.

Арсеннева Н. "Я не палітык і ніколі ім не была...": Пра жыццёвы і творчы шлях паэткі // Роднае слова. 1993. № 1.

Бяляцкі А. "Цішыню не растлумачу анікому": Творчасць Янкі Юхнаўца // Роднае слова. 1993. № 6.

Вішнеўскі А. "Я хацеў бы ізноў нарадзіцца...": Творчасць Уладзіміра Клішэвіча // Роднае слова. 1993. № 11.

Калубовіч А. Крокі гісторыі: Даследаванні, артыкулы, успаміны. Мн., 1993.

Марціновіч А. Лёс і творчасць Масея Сяднёва // Роднае слова. 1993. № 2—3.

Марціновіч А. Душа шукала паразумення: Жыццёвы і творчы шляхі Юркі Віцьбіча // Роднае слова. 1993. № 5.

Мішчанчук М. "Між берагамі": Лёс і творчасць Н.Арсенневай // Роднае слова. 1993. № 1.

Сачанка Б. З далёкага выраю...: Літаратура беларускага замежжа // Роднае слова. 1993. № 1.

Супрун В. За смугою часу: Даследаванні і меркаванні / Прадм. Г.Каханоўскага. Мн., 1994.

Сяднёў М. Масеева кніга: Успаміны, старонкі дзённіка, эсэ. Мн., 1994.

Чыгрын С. Тры постаці: Алесь Змагар, Ян Пятроўскі, Сяргей Хмара-Сіняк // Роднае слова. 1993. № 10.

# Тэма 7

# СЛАВУТАСЦІ БЕЛАРУСІ

Гэта тэма прысвечана знакамітым людзям нашай Бацькаўшчыны, імёны якіх назаўсёды засталіся на беларускай зямлі і ўшаноўваюцца ў народнай памяці.

Вывучэнне гэтай тэмы мае некаторыя асаблівасці, таму выкладчыку рэкамендуецца пазбегнуць нематываваных паўтораў тых асоб, дзейнасць якіх разглядалася ў папярэдніх тэмах; падкрэсліць для навучэнцаў (студэнтаў) значнасць і велічнасць канкрэтных асоб для цывілізацыі, Еўропы, славянскіх народаў, нашай Радзімы і яе рэгіёнаў, той ці іншай мясцовасці і г.д.; падрыхтаваць для заняткаў па тэме ілюстрацыйны матэрыял і дадатковую літаратуру; прадугледзець выхаваўчыя аспекты заняткаў, каб жыццёвы шлях і дзейнасць славутых людзей Беларусі былі ўзорамі і прыкладамі для маладых пакаленняў. Такім чынам, выкладчык павінен вызначыць змест вывучаемай тэмы, тыя пытанні, што з'яўляюцца галоўнымі, а таксама формы арганізацыі заняткаў (раім правесці адзін або два семінары).

Як паказвае вопыт арганізацыі заняткаў па гэтай тэме, даволі ўдала могуць спалучацца тлумачэнні выкладчыка з рэфератамі навучэнцаў (напрыклад, семінар-канферэнцыя). Рэфераты прапануецца рыхтаваць па гістарычных перыядах Бацькаўшчыны або па напрамках дзейнасці канкрэтных асоб. Так, цікава слухаюцца і абмяркоўваюцца на семінары-канферэнцыі даклады па ваеннай гісторыі Беларусі, аб дзеячах навукі, дзяржаўных дзеячах сярэднявечча і XX ст. і інш. Некаторыя з гэтых пытанняў, напэўна, могуць разглядацца даволі падрабязна і быць асновай для мэтанакіраванай размовы аб славутых земляках. Важна, каб пры падрыхтоўцы тэматыкі дакладаў па гэтай тэме былі ўлічаны схільнасці навучэнцаў, іх інтарэсы, спецыфіка навучальнай установы, змястоўны аспект тэмы.

Асаблівую ўвагу пажадана звярнуць на раскрыццё дзейнасці тых выдатных асоб, пра якіх вельмі скарочана гаварылася (або ўвогуле не адзначалася) на занятках па гісторыі Беларусі. Так, вельмі цікавы і каштоўны матэрыял змешчаны ў серыі "Нашы славутыя землякі", заснаванай у 1988 г. У гэтай серыі ўжо выдадзена больш за 20 кніг пра найменш вядомых сучаснаму беларусу нашых суайчыннікаў — выдатных навукоўцаў, асветнікаў, палітыкаў, дзеячаў культуры, мастацтва, літаратуры. Аўтары кніг пішуць не толькі пра тых, хто жыў і працаваў

на Радзіме, але і пра беларусаў, якія воляю лёсу былі закінуты на чужыну і зрабілі важкі ўклад у развіццё культуры розных народаў. Кнігі з акадэмічнай серыі "Нашы славутыя землякі", якія падрыхтаваны выдавецтвам "Навука і тэхніка", рэкамендуюцца навучэнцам, студэнтам для чытання і падрыхтоўкі да семінараў (у спісе літаратуры да тэмы кнігі адзначанай серыі выдзелены ў асобную рубрыку). Па гэтай тэме таксама магчыма шырока выкарыстаць мемуарную літаратуру (напрыклад, частка агульнага спіса мемуарнай літаратуры змешчана ў выданні: Савецкая Беларусь ва ўспамінах сучаснікаў: Анатаваны паказальнік мемуарнай літаратуры. 1917—1972 гг. Мн., 1973).

Завяршыць вывучэнне гэтай тэмы пажадана сустрэчай са знакамітымі людзьмі, праглядам кінафільма альбо наведваннем мясцовага музея.

Агульны вывад, які рэкамендуецца зрабіць выкладчыку, наступны: наша Бацькаўшчына ніколі не была бедная на таленты, яе ўраджэнцы ўзбагачалі і ўзбагачаюць сусветную навуку, літаратуру, культуру сваімі думкамі, творамі і дасягненнямі.

## Кантрольныя пытанні:

1. Якіх выдатных дзеячаў беларускай дзяржавы Вы ведаеце?
2. Хто з'яўляўся пачынальнікам нацыянальнага адраджэння на рубяжы XIX—XX стст.?
3. Хто з прадстаўнікоў Беларусі ўпершыню напісаў гісторыю Бацькаўшчыны?
4. Якія беларускія спартсмены маюць (або мелі ў мінулым) найбольш значныя дасягненні?
5. Хто з дзеячаў культуры пачынаў кнігадрукаванне на Беларусі?
6. Хто з выдатных дзеячаў нашай зямлі мае агульнаеўрапейскую вядомасць?

## Тэматыка рэфератаў:

1. Усевалад Ігнатоўскі і яго час.
2. Я. Ф. Карскі і беларускае мовазнаўства.
3. Сімяон Полацкі як пісьменнік і асветнік.
4. Беларускія першадрукары: Ф. Скарына, С. Будны, Л. Зізаній.
5. Дзяржаўныя і палітычныя дзеячы Беларусі:
    - 5.1. Л. Сапега — канцлер Вялікага княства Літоўскага;
    - 5.2. Т. Касцюшка, К. Каліноўскі — змагары за вольнасць;
    - 5.3. Пётр Машэраў і яго час;
    - 5.4. Д. Жылуновіч і яго лёс;
    - 5.5. Палітычныя лідэры БНР і іх дзейнасць.
6. Зоркі айчыннага спорту — беларускія алімпійцы: А. Мядз-

ведзь, В. Корбут, М. Іткіна, А. Валчэцкая, Р. Клім, Я. Бялова-Новікава, І. Жалязоўскі і інш.

7. Дзеячы беларускай навукі: У. І. Пічэта, М. М. Нікольскі, М. Ф. Бліадуха, І. І. Гарэцкі, У. М. Ігнатоўскі, В. Ф. Купрэвіч, М. А. Барысевіч, А. І. Мальдзіс, М. П. Яругін, А. Н. Саўчанка, Б. І. Сцяпанаў і інш.

## Прыкладныя тэмы семінараў-канферэнцый:

1. Выдатныя дзеячы беларускай культуры.
2. Навукоўцы Беларусі.
3. Дзяржаўныя і палітычныя дзеячы Беларусі.
4. Барацьбіты за свабоду і незалежнасць Бацькаўшчыны.
5. Славутыя землякі.

## Практычныя заданні:

1. Азнаямленне з гісторыяй прысваення імён славутых землякоў вуліцам, плошчам, бібліятэкам, навучальным установам, прадпрыемствам населенага пункта.

2. Збіранне біяграфічных звестак аб знакамітых людзях сваёй мясцовасці: удзельніках барацьбы за незалежнасць Радзімы, дзеячах культуры, вучоных і г.д.

## ЛІТАРАТУРА:

### Асноўная

Азгур З. "Чалавек ён быў...": Аб П. М. Машэраве // Беларусь. 1991. № 7. С. 4—6.

Аповесць жыцця і смерці святой і блажэннай і найпадобнейшай Ефрасінні... / Пер. са стараслав. А. Мельнікаў // Спадчына. 1989. № 1.

Багадзяж М. "Златоуст, паче всех воссиявший нам на Руси...": Аб Кірыле Тураўскім // Беларусь. 1991. № 9. С. 26.

Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 1—3 // Рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. Мн., 1996.

Беларускія пісьменнікі 1917—1990: Даведнік // Склад. А. К. Гарадзіцкі; Навук. рэд. А. Л. Верабей. Мн., 1994.

Белугин А. Он отдал себя народу: О С. О. Притыцком // Бел. думка. 1993. № 3. С. 70—75.

Булахов М. Г. Е. Ф. Карский. Мн., 1981.

Галко В. К. Тураўскі і яго спадчына // Бел. гіст. часопіс. 1993. № 3. С. 29—34.

Жыццяпіс Марка Шагала // Беларусь. 1994. № 11.

Их именами названы: Энцикл. справ. Мн., 1987.

Казбярук У. Прарок беларускага Адраджэння: Аб Я. Купалу // Полымя. 1993. № 10.

Корж Е. С. Вся жизнь — Отчизне: О командире Пинского партизанского соединения В. З. Корже. Мн., 1984.

Корнилович З. А. Люди революционного долга. Мн., 1985.

Кузнецов Н. О нем слагали песни: О Н. Ф. Гикало // Сов. Белоруссия. 1987. 19 марта. С. 3.

Мазуров К. Т. Незабываемое: О деятельности подпольных комсомольских организаций в годы Великой Отечественной войны. Мн., 1984.

Майхровiч С. Выдатны беларускі філосаф: Пра К. Лышчынскага // Беларусь. 1988. № 11.

Мальдзіс А. Скарына вяртаецца ў Падую і Венецыю // Беларусь. 1993. № 2. С. 26—27.

Марціновіч А. Златавуст з Турава // Бел. мінуўшчына. 1993. № 3—4.

Марціновіч А. Маці, асветніца Беларусі: Аб Е.Полацкай // Полымя. 1993. № 10.

Масткоў І. "Быў прыхільнікам самых аптымістычных прагнозаў..." Аб бел. вучоным Г. В.Багамолаве — геолагу, гідролагу // Беларусь. 1991. № 4. С. 24—25.

Мельнікаў А. Шлях немаркотны: Аб Е.Полацкай // Беларусь. 1992. № 5. С. 19.

Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X—XIX стагоддзі: Энцыкл. даведнік / Склад. Г. А. Маслыка. Мн., 1995.

Мяснікоў А. Нацдэмы: Лёс і трагедыя Ф. Шантыра, У. Ігнатоўскага, Я. Лёсіка / Прадм. Б.Сачанкі. Мн., 1993.

Орлов В. Победитель: О Казимире Лыщинском // Сов. Белоруссия. 1991. 12 янв. С. 2.

Орлов В. "Яко луча солнечная...": О Е.Полоцкой // Неман. 1992. № 12. С. 120—135.

Прокошина Е. С., Шалькевич В.Ф. Казимир Лыщинский. Мн., 1986.

Прыбытка Г. "На Всемирную пользу...": Жыцце і лёс Ільі Капіевіча // Бел. мінуўшчына. 1994. № 3.

Пугачева Э. Возвращение через века: О Ф. Скорине // Неман. 1991. № 1.

Ростаў А. Русін племені беларусаў: Т. Касцюшка // Бел.мінуўшчына. 1994. № 1. С. 18—20.

Сазанович В. П. и др. Физическая культура и спорт Белоруссии: Страницы летописи. Мн., 1988.

Сачанка Б. "Сняцца сны аб Беларусі": Загадка смерці Я.Купалы // Літ. і мастацтва. 1988. 19 жн. С. 14—16; 26 жн. С.14.

Спорт на Беларусі: Падборка матэрыялаў // Беларусь. 1993. № 7. С. 4—32.

Тарасаў К. Памяць пра легенды: Постаці беларускай мінуўшчыны. 2-е выд., дап. Мн., 1993.

Францыск Скарына і яго час: Энцыкл. даведнік. Мн., 1988.

Цеханавецкі А. М. К. Агінскі і яго "сядзіба музаў" у Слоніме. Мн., 1993.

Шалькевіч В. Апостал свабоды і незалежнасці: К.Каліноўскі // Бел. мінуўшчына. 1993. № 1. С. 30—34.

## Дадатковая

Адамушка У. Ігнат Дварчанін — рэвалюцыянер, гісторык, паэт // Бел. гіст. часопіс. 1993. № 3. С. 113—118.

Акшевский И. Он любил эту землю: о Д. Ф. Прищепове // Неман. 1991. № 4.

Бандарэнка М. Мяцежны генерал: жыццё генерала Рамуальда Траўгута // Бел. думка. 1993. № 1. С. 49—51.

Бястужаў Д. За акіянам ведаюць наш голас: Пра П. Конюха // Нар. газ. 1993. 13 кастр. С.4.

Далгатовіч Б. Мікола Гастэла і трыццаць яго пабрацімаў // Беларусь. 1994. № 5. С. 15.

Дышыневіч В. Георгі Каніскі — светач духоўны // Культура. 1993. 10 жн. С. 6—7.

Ермолаев В. Научный потенциал Белоруссии. Мн., 1987.

Ігнаценка І., Кароль А. Усевалад Ігнатоўскі і яго час. Мн., 1991.

Калюта І. Тысяча твараў і адна любоў: Аб Вользе Корбут // Беларусь. 1993. № 10. С. 38.

Касцюк М. "Воля, роўнасць, незалежнасць": Да 20-годдзя паўстання ў Польшчы, на Беларусі і ў Літве // Нар. газ. 1994. 24 жн. С.3.

Кісялёў У. Наш сучаснік Якуб Наркевіч — Ёдка // Наст. газ. 1994. 29 кастр. С. 5.

Конон В. Пророк в своем Отечестве: О В. Самойле—Сулиме // Неман. 1992. № 1.

Короткевич А. Т. Наука в Белоруссии на современном этапе (1970—1980 гг.). Мн., 1985.

Маліноўскі М. "Сами учили и деток своих научали": Да 400-х угодкаў з дня смерці Сымона Буднага // Бел. думка. 1993. № 3. С. 67—70.

Міцкевіч А. Язэп Лёсік // Наст. газ. 1994. 24 ліст.

Мяснікоў А. Лёс адметны і трагічны: Антон Жабрак // Бел. мінуўшчына. 1994. № 1. С. 46—48.

Платонаў Р. Тайна смерці Мікалая Галадзеда // Беларусь. 1993. № 10. С. 22—23.

Протько П. С., Лапец П. Д., Антонович Т. М. Я.Купала: трагический 1930-й // Неман. 1990. № 10.

Саверченко И. Блестящий кавалер: О Льве Сапеге // Сов. Белоруссия. 1990. 9 окт. С. 2.

Садовский А. С. П. Н. Лепешинский: Страницы биографии. Мн., 1986.

Успаміны пра Івана Мележа. Мн., 1982.

Успаміны пра Цішку Гартнага. Мн., 1984.

Успаміны пра Якуба Коласа. Мн., 1982.

Успаміны пра Янку Купалу. Мн., 1982.

Францішак-Бенядзікт Багушэвіч. Жыццё і творчасць / Склад. У. Содаль, Е. Мацюш. Мн., 1986.

Чаропка В. Імя ў летапісе / Прадм. А. М.Сідарэвіча. Мн., 1994.

Шалькевіч В. Касцёр бессмяротнасці: Пра К.Лышчынскага // Полымя. 1977. № 3.

Шматаў В. Святло Скарынавых кніг: Традыцыі беларускага асветніцтва ў славянскім кнігадрукаванні // Роднае слова. 1992. № 9—11.

**Серыя "Нашы славутыя землякі"**
**(Мн.: Навука і тэхніка, 1988—1994)**

Арлоў У. А. Асветніца з роду Усяслава: Ефрасіння Полацкая.

Арлоў У. А. Прысуд выканаў невядомы: Ігнат Грынявіцкі.

Бельскі А.М., Ткачоў М. А. Вялікае мастацтва артылерыі: Казімір Семяновіч.

Галакціёнаў С. Г., Яцкевіч Г. М. Рыцары навукі з Нянькава: Уладзіслаў Дыбоўскі.

Гапоненка В. А. У пошуках гармоніі сусвету: Іван Яркоўскі.

Грыбкоўскі В. П., Гапоненка В. А., Кісялёў У. М. Прафесар электраграфіі і магнетызму: Якуб Наркевіч — Ёдка.

Грыцкевіч В. П. Адысея навагрудскай лекаркі: Саламея Русецкая.

Гусак А. А. Практычная механіка і "Мёртвыя душы": Мікалай Ястрэбскі.

Дабравольскі В. А. Да ісціны — найпрацейшым шляхам: Васіль Ермакоў.

Казбярук У. М. Светлай волі зычны звон: Алесь Гарун.

Каханоўскі Г. А., Каханоўскі А. Г. Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч.

Мархель У. І. Вяшчун славы і волі: Уладзіслаў Сыракомля.
Процька Т. С. Даследчык таямніцаў святла: Аляксандр Садоўскі.
Процька Т. С. Эксперыментатар з Беластоцкай гімназіі: Кароль Чаховіч.
Саверчанка І. В. Апостал яднання і веры: Язэп Руцкі.
Саверчанка І. В. Канцлер Вялікага княства: Леў Сапега.
Сагановіч Г. М. Айчыну сваю баронячы: Кастусь Астрожскі.
Тарасаў С. В. Чарадзей сёмага веку Траяна: Усяслаў Чарадзей.
Юхо Я. А. За вольнасць нашу і вашу: Тадэвуш Касцюшка.
Юхо Я., Емяльянчык У. "Нарадзіўся я ліцьвінам...": Тадэвуш Касцюшка.

# Тэма 8

# МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ

Тэма аб мастацтве нашай Бацькаўшчыны з'яўляецца адной з самых значных у раскрыцці духоўнай культуры народа і вельмі важкай па агульнаму аб'ёму вывучаемага матэрыялу: ад старажытных часоў і да сучаснасці разглядаюцца розныя віды і жанры нацыянальнага мастацтва. Усё гэта сведчыць аб тым, што па дадзенай тэме немагчыма абмежавацца адным або двума заняткамі. Пажаданым для выкладчыка з'яўляецца выдзяленне на гэту тэму 8—10 гадзін, у тым ліку: лекцыі — 2 (4) гадзіны, семінары (урокі) — 2 (4) гадзіны, экскурсія — 2 гадзіны. Такі падыход дае магчымасць даволі падрабязна растлумачыць асноўныя этапы развіцця мастацтва Беларусі і падкрэсліць, што ў наш час носьбітам этнічнай спецыфікі выступае духоўная культура, і ў першую чаргу — мастацкая. Веданне гісторыі, разуменне мінулага і сучаснага нацыянальнага мастацтва з'яўляецца, на наш погляд, адной з прыкмет нацыянальнай свядомасці сучасных грамадзян Беларусі.

У працэсе падрыхтоўкі да заняткаў выкладчыку трэба падрыхтаваць наглядныя дапаможнікі, кіна- або відэафрагменты, фоназапісы і г.д.; адзначыць тэматыку рэфератаў да семінара, падрыхтаваць неабходную літаратуру. Раім абавязкова выкарыстаць наступныя выданні: Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі, Гісторыя мастацтва Беларусі, часопіс "Мастацтва" (за розныя гады).

У якасці асноўных змястоўных пытанняў, якія пажадана разгледзець на лекцыі, могуць быць наступныя:

1) Асноўныя этапы развіцця мастацтва Беларусі;

2) Віды нацыянальнага мастацтва (дойлідства, выяўленчае мастацтва, музыка, тэатр, кіно, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва) і іх асаблівасці.

У час вывучэння матэрыялу тэмы пажадана абапірацца на тыя веды, якія былі набыты навучэнцамі (студэнтамі) у сярэдняй школе на занятках па выяўленчаму мастацтву, музыцы, гісторыі сусветнай і айчыннай культуры, гісторыі і літаратуры Беларусі.

На занятках існуе магчымасць спалучэння матэрыялу, які тлумачыць выкладчык, з рэфератамі студэнтаў. Выкладчыку раім звярнуць увагу на раскрыццё тэорыі мастацтва, аналіз заканамернасцей і асаблівасцей развіцця беларускага мастацтва ў розных гістарычных умовах, на канкрэтныя прыклады

нацыянальнага мастацтва. Творы мастацтва пажадана тлумачыць на падставе розных наглядных дапаможнікаў і фонафрагментаў.

Адной з цяжкасцей раскрыцця зместу тэмы з'яўляецца адбор матэрыялу, таму выкладчыку трэба вызначыць асабісты падыход да раскрыцця гістарычнага аспекту тэмы, суадносін тэорыі мастацтвазнаўства і прыкладаў беларускага мастацтва, а таксама да ўнутрыпрадметных сувязей з тэмамі "Грамадская думка", "Знакамітасці Беларусі", "Веравызнанні народаў Беларусі".

Пытанне аб гісторыі беларускага мастацтва магчыма разглядаць па некалькіх варыянтах: а) у адпаведнасці з асноўнымі этапамі развіцця грамадства (прыклад такога падыходу змешчаны ў кнізе У. У. Качаноўскага "Гісторыя культуры Беларусі". Мн., 1994. С. 161—162), калі выкладчык павінен звяртацца да кожнага віду мастацтва па некалькі разоў, што вельмі цяжка зрабіць у кароткім лекцыйным курсе; б) на падставе аналізу развіцця асноўных відаў мастацтва на працягу ўсёй гісторыі — ад узнікнення да сучаснасці. Такі варыянт вывучэння тэмы патрабуе праграма прадмета, і ён, на наш погляд, з'яўляецца даволі эфектыўным. Пажаданым можа быць дапаўненне зместу гэтай тэмы пытаннем аб традыцыях, асаблівасцях і навацыях у беларускім мастацтве; в) у сувязі з агульнаеўрапейскімі стылямі і накірункамі мастацтва, калі выкладчыкам вызначаюцца як заканамернасці, так і асаблівасці развіцця нацыянальнага мастацтва Беларусі. Гэты варыянт заняткаў магчыма выкарыстаць для падрыхтаваных навучэнцаў (студэнтаў), якія маюць зацікаўленасць у паглыбленні ведаў, параўнанні працэсаў развіцця грамадства і мастацтва. Лекцыя выкладчыка ў такім выпадку можа насіць праблемна-разважаючы характар.

На лекцыях і семінарах раім выкладчыку звярнуць увагу на асноўныя паняцці тэмы: мастацтва, віды, жанры, стылі, накірункі, этапы развіцця, нацыянальныя асаблівасці і інш.

Мастацтва — творчая дзейнасць чалавека, якая адлюстроўвае рэчаіснасць і ўнутраны свет чалавека (пачуцці, фантазіі, думкі і г.д.) у вобразных формах; адна з форм грамадскай свядомасці; састаўная частка культуры чалавецтва, спецыфічны род эстэтычнага асваення свету (Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. Т. 3. Мн., 1986. С. 473).

Мастацтва ўключае розныя віды — дойлідства, жывапіс, скульптуру, графіку, музыку, тэатр, кіно, фатаграфію, цырк, эстраду, тэлебачанне, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і інш., якія ў сваю чаргу падзяляюцца на жанры (напрыклад, у жывапісе вызначаюцца партрэт, пейзаж, нацюрморт і г.д.). Мастацтва адлюстроўвае працэс гістарычнага развіцця чалавецтва і розных народаў, дапамагае грамадству знаходзіць шляхі і перспектывы прагрэсу. Разам з тым развіццё мастацтва ідзе адносна самастойна і супярэчліва ўзаемадзейнічае з яго сацыяльнай абумоўленасцю.

Вытокі сучаснага беларускага мастацтва — у народнай, славянскай (усходнеславянскай), еўрапейскай мастацкай культуры, пачынаючы з часоў старажытнасці, першых княстваў, Кіеўскай Русі. Народная творчасць беларусаў была і застаецца крыніцай развіцця нацыянальнага прафесійнага мастацтва.

Ва ўсіх відах пластычнага мастацтва Беларусі выявіліся агульныя рысы заходнееўрапейскіх стыляў і плыней — готыкі, адраджэння, барока, ракако, класіцызму і інш. Творчае пераасэнсаванне іх беларускімі майстрамі пры апоры на народныя мастацкія традыцыі вызначылі самабытнасць нацыянальнага мастацтва, мясцовых мастацкіх школ.

Асаблівасці беларускага мастацтва яскрава праявіліся ў іканапісе, кніжнай графіцы, драўлянай скульптуры, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, харэаграфіі, музыцы і г.д. Непаўторныя рысы мелі культавыя збудаванні (Сафійскі сабор у Полацку, фарныя касцёлы ў Гродне і Нясвіжы і інш.), замкі і крэпасці ў Гродне, Нясвіжы, Міры, Крэве; народны тэатр "Батлейка"; слуцкія паясы, ракаўская кераміка, Урэцка-Налібоцкае шкло і інш.

Адной з асаблівасцей беларускага мастацтва з'яўляецца вельмі шырокае і падрабязнае адлюстраванне рознымі відамі нацыянальнага мастацтва падзей Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг. і партызанскага руху. Гэта тэма пераважна раскрываецца як вышэйшае напружанне сіл народа, цяжкая, поўная драматызму барацьба і дасягненне перамогі цаною цяжкіх людскіх страт. Разважанні выкладчыка па гэтай праблеме магчыма ілюстраваць выявамі твораў жывапісу, графікі, скульптуры, музычнымі фрагментамі (напрыклад, карціны Я. Зайцава "Абарона Брэсцкай крэпасці", Я.Ціхановіча "Партызаны ў разведцы", Ф. Мадорава "Партрэт партызана Талаша", М. Савіцкага "Партызанская мадонна" і яго ж цыкл "Лічбы на сэрцы", В. Волкава "Мінск 3 ліпеня 1944 г."; абеліск-помнік на плошчы Перамогі ў Мінску, мемарыяльны комплекс "Хатынь"; музычныя фрагменты з "Лясной песні" У. Алоўнікава, з песні І. Лучанка "Памяць сэрца" і інш.).

Гэты матэрыял удала выкарыстоўваецца для патрыятычнага выхавання сучаснай моладзі, у мэтах фарміравання грамадскіх якасцей.

У мастацтве Беларусі адлюстраваліся асаблівасці развіцця нашага грамадства, дзяржаўнасці, грамадскай думкі, рэлігіі і інш. Так, у мастацтве спалучаюцца язычніцтва, народныя абрады і розныя накірункі хрысціянства; еўрапейская культура і элементы азіяцкай; гарадская і вясковая культуры і г.д. Трэба звярнуць увагу навучэнцаў (студэнтаў) на тое, што значная частка беларускай нацыянальнай культуры была ў мінулым метадычна знішчана спачатку польскай экспансіяй, а потым імперскай палітыкай царскай Расіі.

У савецкі час нацыянальнае мастацтва беларусаў і іншых народаў, якія жывуць на Беларусі, развівалася, як народнае,

так і прафесійнае, са сваімі дасягненнямі і супярэчнасцямі. Некаторыя творы мастацтва былі занадта ідэалагізаваны, услаўлялі і ідэалізавалі палітыку і кіраўнікоў КПСС; частка дзеячаў культуры абвінавачвалася ў нацыяналізме і была рэпрэсіравана, што адмоўна ўплывала на развіццё нацыянальнай свядомасці, мастацтва, культуры ў рэспубліцы.

У цэлым мастацкая культура Беларусі за гады існавання БССР выйшла на больш якасны узровень у параўнанні з мінулым перыядам: былі створаны нацыянальныя мастацкія навучальныя ўстановы (тэатральна-мастацкі інстытут, кансерваторыя, музычныя і мастацкія вучылішчы і школы), тэатры, канцэртныя залы, мастацкія музеі і выставы, кінастудыя і іншыя ўстановы. Мастацтва Беларусі развівалася ў рэчышчы савецкага мастацтва, захоўваючы нацыянальную самабытнасць, своеасаблівасць і разнастайнасць творчых почыркаў.

У наш час, калі Беларусь ідзе па шляху развіцця нацыянальнай дзяржаўнасці і сацыяльна-эканамічных рэформаў, беларускае мастацтва даволі актыўна выходзіць на сусветную арэну як роўнае сярод роўных, з уласным тварам і светапоглядам, захоўвае і паказвае суверэнітэт нацыянальнай культуры.

Па тэме "Мастацтва Беларусі" выкладчык дае заданні навучэнцам (студэнтам) па падрыхтоўцы да семінараў, фармулюе кантрольныя пытанні, прапануе тэматыку рэфератаў. Па выніках правядзення экскурсіі ў музей навучэнцам можна прапанаваць заданне па падрыхтоўцы пісьмовый справаздачы; аб наведванні выставы, тэатральнага спектакля — водгуку або рэцэнзіі.

У заключнай частцы заняткаў па тэме выкладчыку рэкамендуецца падвесці вынікі адказаў навучэнцаў; падкрэсліць, што розныя элементы этнічнай самасвядомасці з найбольшай паўнатой адлюстроўваюцца ў нацыянальнай мастацкай культуры. У мастацтве мінулага і сучаснага разгортваюцца сацыяльныя імкненні і эстэтычныя ўяўленні этнасу, яго маральныя ідэалы і адчуванне спецыфічнасці нацыянальнага пачуцця і г.д.

Мастацтва Беларусі наглядна характарызуе нацыянальныя асаблівасці беларускага этнасу, яго сувязі з агульнаславянскай, еўрапейскай культурай і сусветнай цывілізацыяй.

Літаратура па гэтай тэме прапануецца як для выкладчыка (абагульняючыя працы), так і для навучэнцаў, якія рыхтуюць рэфераты (дадатковая літаратура сістэматызавана па асноўных відах мастацтва).

## Кантрольныя пытанні:

1. У якіх гістарычных умовах развівалася культура на Беларусі ў мінулым? Якія асноўныя этапы вызначаюцца ў развіцці мастацтва Беларусі?

2. Якія дасягненні беларускага дойлідства перыяду сярэднявечча Вам вядомы?

3. Калі і дзе пачалася творчасць першых беларускіх тэатраў?

4. Што ўяўляе сабой батлейка?

5. Якія мемарыяльныя комплексы створаны на Беларусі?

6. Хто з'яўляецца заснавальнікам:

а) беларускага драматычнага тэатра?

б) першай беларускай прафесійнай тэатральнай трупы?

в) нацыянальнай абернай музыкі?

7. Калі нарадзілася беларускае кіно? Як называўся першы мастацкі фільм?

8. Якія найбольш вядомыя кінафільмы былі зняты на "Беларусьфільме"?

9. Як, на Ваш погляд, уплывае сучасная беларуская эстрада на фарміраванне нацыянальнай свядомасці народа?

10. Якія асаблівасці маюць беларускія абразы (іконы)?

11. Чаму ў гісторыі мастацтва Беларусі выключнае месца займае крыж Ефрасінні Полацкай, які быў зроблены Лазарам Богшай?

## Тэматыка рэфератаў:

### 1. Нацыянальнае дойлідства

1.1. Архітэктура сялянскай сядзібы.

1.2. Архітэктура старажытных беларускіх гарадоў: Полацка, Брэста, Нясвіжа, Віцебска, Турава, Гродна (на выбар).

1.3. Абарончыя збудаванні, замкі і крэпасці (цытадэлі) Беларусі.

1.4. Культавае будаўніцтва XII—XX стст.

1.5. Горадабудаўніцтва савецкага перыяду. Прамысловае дойлідства. Жылыя і грамадскія будынкі.

1.6. Творчасць беларускіх архітэктараў (І.Лангбарда, А.Воінава, В.Караля і інш.).

### 2. Выяўленчае мастацтва

2.1. Беларускія абразы.

2.2. Партрэт у беларускім жывапісе.

2.3. Скульптуры і мемарыяльныя комплексы, прысвечаныя героям і ахвярам другой сусветнай вайны.

2.4. Творчасць беларускіх мастакоў: І. Хруцкага, А. Гараўскага, В. Бялыніцкага-Бірулі, М. Савіцкага, Я. Зайцава, А. Глебава, А. Ісачова і інш.

2.5. Сучаснае выяўленчае мастацтва.

2.6. Мастацкая фатаграфія ў друку Беларусі.

### 3. Тэатры

3.1. Народны лялечны тэатр "Батлейка".

3.2. Гісторыя стварэння беларускага нацыянальнага прафесійнага тэатра. Творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча.

3.3. Беларуская драматургія. Творчасць К.Крапівы, А.Макаёнка, А.Петрашкевіча, М.Матукоўскага, А.Дударава і інш.

3.4. Творчая дзейнасць беларускіх тэатраў (імя Я.Купалы, Я.Коласа, М.Горкага, тэатра-студыі кінаакцёра, юнага гледача і інш.).

**4. Музыка**

4.1. Народная музычная творчасць. Народныя інструменты.
4.2. Беларуская опера.
4.3. Беларускі балет.
4.4. Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў музычнай творчасці.
4.5. Барды Беларусі.
4.6. Царкоўная музыка.
4.7. Творчасць М. Кл. Агінскага.
4.8. Эстрада Беларусі.
4.9. Гуманістычны ідэал у творчасці Я. Глебава.
4.10. Песенная творчасць І. Лучанка, В. Захлеўнага, Э. Ханка і іншых кампазітараў.
4.11. Творчы партрэт кампазітара, спевака, інструменталіста.

**5. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

5.1. Народная кераміка.
5.2. Разьба па дрэву.
5.3. Беларускія дываны і габелены.
5.4. Народныя тканіны.
5.5. Слуцкія паясы.

**6. Кнігадрукаванне**

6.1. Графіка Ф. Скарыны.
6.2. Беларуская кніжная графіка.
6.3. Агляд часопіса "Мастацтва".
6.4. Гісторыя беларускага кнігадрукавання.
6.5. Ф. Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар.

**7. Помнікі культуры Мінска**

7.1. Мінская скульптура.
7.2. Мемарыяльныя комплексы сталіцы, прысвечаныя героям і ахвярам другой сусветнай вайны.
7.3. Музеі Мінска.
7.4. Курапаты: дарогі болю і памяці.
7.5. Літаратурныя музеі сталіцы Беларусі.

**8. Помнікі культуры рэгіёна**, дзе пастаянна пражываюць студэнты (на прыкладзе раёна, горада, пасёлка, вёскі).

**9. Скарбы, рассыпаныя па свеце** (аб каштоўнасцях беларускай культуры, якія знаходзяцца за межамі Беларусі).

## Практычныя заданні:

1. Апісанне помніка дойлідства, які знаходзіцца ў мясцовасці пастаяннага жыхарства студэнта.

2. Індывідуальнае (калектыўнае) наведванне мясцовага музея, складанне справаздачы аб наведванні.

3. Наведванне выставы, тэатра, сустрэчы з дзеячамі культуры, складанне рэцэнзіі або водгуку.

4. Азнаямленне з новымі творамі беларускай літаратуры, складанне анатацыі.

5. Правядзенне параўнальнага аналізу твораў розных мастакоў, скульптараў; помнікаў дойлідства; упрыгожванняў, знойдзеных археолагамі на Беларусі; выканання аднолькавай ролі рознымі артыстамі тэатра і г.д.

## ЛІТАРАТУРА:

### Асноўная


Беларускае мастацтва: Зб. артыкулаў і матэрыялаў. Вып. 1—10. Мн., 1962—1988.

Ганчароў М. І. Мастацтва мужнасці і гераізму. Мн., 1976.

Гісторыя беларускага мастацтва: У 6 Т. Мн., 1985—1990.

Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Т. 1—6. Мн., 1984—1987.

Качаноўскі У. У. Гісторыя культуры Беларусі: Вучэб. дапаможнік Мн., 1994.

Конан У. М. Беларуская культура: Гістарычны нарыс (X ст. — 1917 г.) // Адукацыя і выхаванне. 1994. № 10. С. 24—37.

Лазука Б. А. Гісторыя мастацтваў: Вучэб. дапаможнік. Мн., 1996.

Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння. XVI — першая палова XVII ст. / Рэд. С. В.Марцэлеў. Мн., 1994.

Смаляк С. Р. Гісторыя і сучаснасць беларускай культуры. Мн., 1991.

Шчакаціхін М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. Мн., 1993.

Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. Мн., 1984—1987.


### Дадатковая (па відах і жанрах мастацтва)

#### Народнае самадзейнае мастацтва


Барышаў Г. І., Саннікаў А. К. Беларускі народны тэатр "Батлейка". Мн., 1962.

Калюта І. Дуэт, у якім трое: Выканаўцы аўтарскай песні Г. і Б.Вайханскія // Беларусь. 1991. № 11. С.36.

Мартыненка В. Панацэя ад духоўнай хваробы: Агляд беларускай аўтарскай песні. Вальжына Цярэшчанка // Роднае слова. 1994. № 1.

Назіна І. Д. Беларускія народныя музычныя інструменты: струнныя. Мн., 1983.

Сахута Я. М. Фарбы роднай зямлі: Нарысы пра народнае мастацтва. Мн., 1985.

Шаура Р. Ф. Самадзейнае выяўленчае мастацтва Беларусі (1917—1988 гг.): Жывапіс. Графіка. Скульптура. Мн., 1995.

Шырма Р. Песня — душа народа: З літ. спадчыны / Прадм. Н.Гілевіча. Мн., 1993.

**Дойлідства**

Аникин В. И. Брестская крепость — крепость-герой. 2-е изд. М., 1985.

Воинов А. А. История архитектуры Белоруссии (Советский период). Мн., 1985.

Дубровін С. Сівая даўніна Нясвіжа // Бел. мінуўшчына. 1993. № 2.

Лакотка А. Запаведнік ля сутокаў Менкі і Пцічы // Бел. думка. 1995. № 1. С.82—86.

Ткачев М. А. Замки Белоруссии. Мн., 1987.

Трусаў А. А. Старонкі мураванай кнігі: Манументальная архітэктура эпохі феадалізму і капіталізму. Мн., 1990.

Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии. 3-е изд., перераб. и доп. Мн., 1985.

**Выяўленчае мастацтва**

Агіевіч У. Сімвалічныя знакі Скарыны // Бел. думка. 1996. № 11. С. 156—164.

Вайцэхоўская В. У. Выяўленчае мастацтва Беларусі: Жывапіс 20—30-х гг. XX ст. // Нар. асвета. 1995. № 5. С. 58—66.

Дробаў Л. Н. Жывапіс Савецкай Беларусі (1917—1975). Мн., 1979.

Жывапіс Беларусі XII—XVIII стагоддзяў: фрэска, абраз, партрэт. Мн., 1980.

Кароткіна Н. Фатаграфія Беларусі // Мастацтва. 1995. № 2. С. 46—53.

Лявонава А. К. Старажытнабеларуская скульптура. Мн., 1991.

Памятники Минска / Авт.-сост. В. П. Шамов. Мн., 1990.

Пуцко В. Лёс няпросты, але свой: Іканапіс Беларусі XV—XVIII стст. у кантэксце ўсходнееўрапейскага сакральнага мастацтва візантыйскай традыцыі // Мастацтва. 1994. № 8. С. 72—74.

Хадыка А. Из тьмы светлеющие лики: Старобел. портрет // Неман. 1992. № 1.

Чантурия В. А. Атлас памятников архитектуры и мемориальных комплексов Белоруссии. Мн., 1988.

Шматаў В. Ф. Беларуская кніжная гравюра XVI—XVIII стагоддзяў. Мн., 1984.

Шматаў В. Ф. Беларуская графіка 1917—1941 гг. Мн., 1975.

**Тэатральнае мастацтва**

Барышев Г. И. Театральная культура Белоруссии XVIII века. Мн., 1992.

Гаробчанка Т. Шляхі нацыянальнага тэатра: Энцыкл. даведка // Тэатральная Беларусь. 1995. № 5.

Гісторыя беларускага тэатра / Кал. аўтараў пад кір. У.І.Няфёда: У 3 т. Мн., 1982—1987.

З гісторыі беларускага тэатра ад вытокаў да пачатку XX ст.: Рэкаменд. бібліягр. спіс // Новыя кнігі Беларусі. 1995. № 5 (Дадат.).

Пятровіч С. П. Якуб Колас і беларускі тэатр. Мн., 1975.

**Музычнае мастацтва**

Ауэрбах А. Л. Белорусские композиторы. Мн., 1978.

Беларускі рок: Рэкаменд. бібліягр. спіс // Новыя кнігі Беларусі. 1994. № 7 (Дадат.).

Дадзіёмава В. Наша першае нотнае выданне // Спадчына. 1995. № 4.

Дадиомова О. В. Музыкальная культура городов Белоруссии в XVIII веке. Мн., 1992.

Куляшова Г. Р. Беларуская кантата і араторыя. Мн., 1987.

Мартыненка В. Птушкі спяваюць сэрцам: Агляд беларускай бардаўскай песні // Роднае слова. 1993. № 6, 9, 12.

**Танцавальнае мастацтва**

Загородний Г. Хороши наши "Хорошки" // Бел. думка. 1993. № 3. С. 48—51.

Чурко Ю. М. Беларускі народны танец. Мн., 1972.

Чурко Ю. М. Белорусский балет. Мн., 1969.

**Кіно. Тэлебачанне**

Бондарава Е. Беларускае кіно на літаратурным падмурку // Бел. думка. 1994. № 3.

Бондарава Е., Дашук В. Кінематограф і час // Полымя. 1996. № 6. С. 189—204.

Все белорусские фильмы. Т.1: Игровое кино (1926—1970): Каталог-справочник. Мн., 1996.

Гісторыя беларускага кіно / Кіраўнік аўтарскага калектыву А. В. Красінскі. Кн. 1—2. Мн., 1969—1970.

Экран и культура: Белорусское кино и ТВ в системе художественной культуры. Мн., 1988.

**Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва**

Кацар М. С. Народна-прыкладное мастацтва Беларусі: Ад першабытнага грамадства да 1917 г. Мн., 1972.

Лабачэўская В. Вера — не марная: Выстава "Беларускія народныя паясы" // Мастацтва. 1993. № 6. С. 39—44.

Раманюк М. Ф. Беларускае народнае адзенне. Мн., 1981.

Сахута Я. М. Беларуская народная кераміка. Мн., 1987.

Федорук А. Т. Садово-парковое искусство Белоруссии. Мн., 1988.

Яніцкая М. М. Беларускае мастацкае шкло XIX — пачатку XX ст. Мн., 1984.

**Да праблемы вяртання скарбаў беларускай культуры**

Вяртанне-2: Зб. артыкулаў і дакументаў / Бел. фонд культуры; Склад. А. Тоўсцік, М. Яніцкая. Мн., 1994.

Канапелька А. Згубленыя скарбы, або Тайны крыжа Ефрасінні Полацкай і іншых нацыянальных каштоўнасцей // Бел. думка. 1995. № 8—9. С. 47—52.

Мальдис А.: "Прикарманить — это не по-братски..." Беседа с кор. И.Ждановичем // АиФ. 1995. № 8. С. 8а, 8в.

Яніцкая М. Скарбы, рассыпаныя па свеце // Наст. газ. 1994. 12 сак. С. 7.

# Тэма 9

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АДУКАЦЫЯ

Вучэбны матэрыял гэтай тэмы дае магчымасць выкладчыку адзначыць асноўныя гістарычныя этапы развіцця адукацыі на землях беларусаў, асаблівасці арганізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу ў розныя часы і ў розных тыпах навучальных устаноў; педагагічны вопыт і здабыткі (дасягненні) у адукацыйнай сістэме мінулага.

У якасці плана вывучэння гэтай тэмы (або лекцыі па гэтай тэме) могуць быць рэкамендаваны наступныя пытанні:

1. Пісьменнасць на Беларусі як аснова развіцця нацыянальнай школы.
2. Рэлігійная і свецкая адукацыя на Беларусі ў часы сярэднявечча і знаходжання ў складзе Расійскай імперыі.
3. Адукацыйная сістэма Беларусі ў сацыялістычны перыяд: дасягненні, супярэчнасці развіцця, недахопы, праблемы.
4. Сучасны этап нацыянальнай адукацыі і праблемы рэформы. Закон "Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь".

Выкладчыку трэба адзначыць, што своеасаблівай асновай развіцця адукацыі з'яўлялася распаўсюджанне пісьменнасці, а гэта ў значнай ступені звязана з хрысціянізацыяй беларускіх зямель. Так, найбольш раннімі помнікамі пісьменнасці з'яўляюцца: надпіс на свінцовай пячатцы полацкага князя Ізяслава (X ст.), надпіс на крыжы Ефрасінні Полацкай (1161 г.), Барысавы камяні, Тураўскае евангелле (XII ст.), берасцяныя граматы і г.д. Асвета перыяду сярэднявечча на Беларусі, як і на большай частцы Еўропы, насіла царкоўны кірунак. У манастырах або пры іх ствараліся першыя школы, перапісваліся кнігі, групаваліся людзі асветы.

Але кола навучэнцаў ва ўсіх царкоўных, манастырскіх, брацкіх, езуіцкіх і іншых школах не ахоплівала значнай часткі падрастаючага пакалення. Большая частка "шкаляроў" адносілася да сярэдніх слаёў грамадства — гэта былі дзеці шляхты, святароў, гандляроў, рамеснікаў-майстроў. Адукацыйная справа выкарыстоўвалася ў рэлігійна-палітычных мэтах, што значна ўплывала на сацыяльныя адносіны і магло мець розныя вынікі. Так, у XVII — першай палове XVIII ст. манаполіяй на асвету валодалі каталіцкія ордэны, і ў першую чаргу — багаты і ўплывовы ордэн езуітаў, які меў сетку пачатковых і сярэдніх наву-

чальных устаноў па выхоўванню "адданых каталікоў", а не нацыянальна свядомых беларусаў.

На занятках раім адзначыць, што сацыяльна-палітычныя пераўтварэнні ў Рэчы Паспалітай у XVIII ст. патрабавалі рэформ у галіне асветы. У 1773—1794 гг. дзейнічала першая ў Еўропе дзяржаўная ўстанова па кіраўніцтву народнай асветай — Адукацыйная камісія, якая ажыццяўляла рэформу навучальных устаноў, зацвердзіла для ўсіх школ статут, адкрыла на Беларусі амаль 20 школ (БелСЭ. Т. 12. С. 375). Гэты вопыт дзяржаўнага кіравання адукацыйнай сістэмай быў у далейшым выкарыстаны ў розных дзяржавах.

Далейшае пашырэнне агульнай колькасці навучальных устаноў на Беларусі ў часы існавання Расійскай імперыі і ў паслярэвалюцыйны час XX ст. вызначалася накіраванасцю сацыяльнага прагрэсу, патрабаваннямі часу. У 1803—1832 гг. дзейнічаў Віленскі універсітэт, з 1848 г. пачаў працаваць Гора-Горацкі земляробчы інстытут — першая ў Расіі вышэйшая агранамічная навучальная ўстанова; у 1829—1850 гг. дзейнічала Беларуская навучальная акруга, у якой знаходзіліся школы і гімназіі Віцебскай і Магілёўскай губерняў; ствараліся рамесныя школы, жаночыя вучылішчы і г.д.

У 1914/15 навучальным годзе на Беларусі працавалі 7682 агульнаадукацыйныя школы ўсіх тыпаў, у якіх навучалася 488,6 тыс. чалавек — 20% дзяцей школьнага ўзросту (БелСЭ. Т. 12. С. 376). Гэтыя лічбы сведчаць аб тым, што адукацыйная сістэма мела саслоўны характар і большасць падрастаючага пакалення не атрымалі магчымасці наведваць школу. Адначасова царскія ўлады выкарыстоўвалі школу ў мэтах русіфікатарства беларускага насельніцтва.

Даволі шырокая адукацыйная сістэма Беларусі была створана ў сацыялістычны перыяд. Гэта сістэма ахоплівала дашкольнае выхаванне, агульную сярэднюю адукацыю, пазашкольнае выхаванне, прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную і вышэйшую адукацыю, навукова-метадычнае забеспячэнне вучэбна-выхаваўчага працэсу; розныя нацыянальныя пачатковыя і сярэднія агульнаадукацыйныя школы — беларускія, рускія, польскія, яўрэйскія, літоўскія і інш. Праблемы развіцця нацыянальнай культуры і адукацыі былі ў цэнтры ўвагі партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР. Так, у 20-я гады ажыццяўлялася ліквідаванне непісьменнасці і малапісьменнасці дарослага насельніцтва, рэформа школьнай сістэмы; вырашалася праблема навучання на беларускай мове і г. д. Падзеямі вялікага культурна-нацыянальнага значэння было адкрыццё ў 1921 г. Беларускага дзяржаўнага універсітэта (першы рэктар — У. І. Пічэта) і ў канцы 1920 г. — політэхнічнага інстытута ў Мінску, якія ў наш час з'яўляюцца вядучымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Беларусі.

У часы існавання савецкай адукацыйнай сістэмы былі як дасягненні, так і недахопы — амаль заўсёды не хапала дзяр-

жаўных сродкаў на мадэрнізацыю адукацыйных устаноў, да дробязей рэгламентавалася дзейнасць розных тыпаў навучальных устаноў, дзейнічаў ідэалагічны кантроль, недастаткова ўлічваліся нацыянальныя інтарэсы ў справе адукацыі. Гэта прывяло да непрыкрытага фармалізму, да зніжэння ў школьнікаў і студэнтаў цікавасці да вучобы, да падзення аўтарытэту ведаў. У выніку дасягнуты ў кароткі час значны ўздым адукацыйнага ўзроўню насельніцтва не прывёў да чакаемага росту прадукцыйнасці працы ў гаспадарцы і сацыяльнай актыўнасці насельніцтва, што ў значнай ступені вызначылася ў адносінах большасці насельніцтва да рыначных умоў, палітычных навацый, дзяржаўнасці беларускай мовы і г.д. Такія супярэчнасці развіцця, якія амаль супадаюць па часу з распадам Саюза ССР і нацыянальным адраджэннем на Беларусі, патрабуюць у наш час рэформы ўсёй адукацыйнай сістэмы рэспублікі. З асноўнымі накірункамі гэтай рэформы, яе праблемамі і ходам падрыхтоўкі выкладчыку неабходна пазнаёміць навучэнцаў, звяртаючы іх увагу як на агульныя пытанні, так і на больш вузкія, якія датычацца канкрэтнай навучальнай установы і ролі навучэнцаў, выкладчыкаў, адміністрацыі ў вырашэнні задач рэформы.

Акрамя лекцыі па гэтай тэме пажадана падрыхтаваць семінар-канферэнцыю (або "Круглы стол"), на якім магчыма абмеркаваць некалькі рэфератаў навучэнцаў і праблемы ажыццяўлення рэформы адукацыйнай сістэмы, яе ролю ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, або кантрольныя пытанні.

У мэтах набыцця сучасных падыходаў да праблем адукацыйнай сістэмы трэба пазнаёміць навучэнцаў з "Настаўніцкай газетай", часопісамі "Адукацыя і выхаванне", "Народная асвета", "Роднае слова", літаратурай па тэме. Таксама можа быць выкарыстаны штомесячны бібліяграфічны бюлетэнь "Новыя кнігі Беларусі" (1994. № 10), які мае дадатак — рэкамендацыйны бібліяграфічны спіс "Нацыянальнае адраджэнне і нацыянальная школа". Выкладчыку раім звярнуць увагу на працы Е. Андрэевай, Я. Бандарэнкі, Н. Каменскай, Л. Лыча, С. Снапкоўскай і іншых аўтараў, якія змешчаны ў спісе літаратуры да тэмы.

У якасці наглядных дапаможнікаў рэкамендуецца падрыхтаваць партрэты (фотаздымкі) выдатных дзеячаў педагагічнай думкі Беларусі (напрыклад, Е. Полацкай, С. Полацкага — С. Я. Пятроўскага-Сітніяновіча; М. Сматрыцкага, Л. Зізанія і інш.), педагагічныя выданні, табліцы аб агульнай колькасці навучальных устаноў і навучэнцаў (гл. табл. 9.1).

## Кантрольныя пытанні:

1. Калі і дзе ўзніклі на зямлі Беларусі першыя школы?
2. Якія школы дзйнічалі на Беларусі ў часы Вялікага княства Літоўскага?

3. Хто з'яўляецца на Беларусі найбольш вядомымі прадстаўнікамі педагагічнай думкі? У чым сутнасць іх поглядаў?

4. У чым значэнне дзейнасці Сімяона Полацкага?

5. У чым праявілася ў мінулыя стагоддзі ўзмацненне нацыянальнага, рэлігійнага прыгнёту ў школьнай адукацыі?

6. Якое значэнне мела дзейнасць брацкіх школ на Беларусі?

7. Як Вы разумееце паняцце аб саслоўным характары адукацыі? Прывядзіце прыклады.

8. У чым сутнасць савецкай адукацыйнай сістэмы? Якія тыпы навучальных устаноў уваходзілі ў гэту сістэму?

9. З якой мэтай створаны і дзейнічаюць прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы?

10. Чаму ў апошнія гады пачалі ствараецца навучальныя ўстановы новых тыпаў: гімназіі, каледжы, ліцэі, акадэміі і г.д.?

11. У чым сутнасць сучаснай рэформы адукацыйнай сістэмы ў нашай рэспубліцы?

12. Якімі шляхамі грамадства і дзяржава маюць магчымасць эфектыўна ўплываць на якасць падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў, на глыбіню ведаў і выхаванне навучэнцаў?

## Тэматыка рэфератаў:

1. Брацкія школы на Беларусі ў XVI—XVII стст. і іх роля ў развіцці асветы.

2. Свецкая адукацыя на Беларусі ў мінулыя стагоддзі.

3. Педагагічная думка Беларусі: гісторыя і сучаснасць.

4. Праблематыка "Настаўніцкай газеты" (часопісаў "Народная асвета", "Адукацыя і выхаванне") за апошнія 1—2 гады.

5. Новыя тыпы навучальных устаноў Беларусі і іх роля ў падрыхтоўцы спецыялістаў.

6. Праблема рэформы сістэмы адукацыі ў наш час.

7. Шляхі паляпшэння дзейнасці навучальнай установы ў сувязі з рэформай адукацыйнай сістэмы і нацыянальным адраджэннем: погляд студэнцкай моладзі.

8. Гуманістычны асветніцкі рух у Вялікім княстве Літоўскім у перыяд Рэфармацыі і яго беларускія прадстаўнікі: Ф.Скарына, М.Гусоўскі, С.Будны, В.Цяпінскі, Я.Намыслоўскі.

9. Беларускае культурна-асветніцкае адраджэнне канца XIX — пачатку XX ст. і яго прадстаўнікі: Ф. Багушэвіч, А. Гурыновіч, К. Міцкевіч (Я. Колас), А. Пашкевіч (Цётка) і інш.

10. Атэістычна-асветніцкая дзейнасць К. Лышчынскага.

11. Тэарэтычныя ідэі і асветніцкая дзейнасць вядомага прадстаўніка брацкай школы Сімяона Полацкага.

12. Дэмакратычныя і гуманістычныя асновы арганізацыі працэсу навучання ў беларускіх брацкіх школах.

13. Сутнасць пераўтварэнняў у галіне народнай асветы Беларусі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Першыя савецкія дэкрэты і пастановы аб школе.

14. Беларусізацыя грамадскага жыцця і асветы ў БССР у 20-я гады (тыпы школ, дзяржаўныя асветніцкія ўстановы, вучэбна-метадычная літаратура, педагагічная тэорыя).

15. Народная асвета ў Заходняй Беларусі ў перыяд 1921—1939 гг. "Таварыства беларускай школы" і яго прадстаўнікі: Б. Тарашкевіч, С. Паўловіч, Р. Шырма.

16. Школа Беларусі ў часы напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Школы ў партызанскіх зонах.

17. Школы і патрыятычнае выхаванне вучняў (студэнтаў), арганізацыя іх грамадска-карыснай працы.

## Практычныя заданні:

1. Падрыхтоўка дакладу па тэме "Школа мінулага ў нашым краі" (у вёсцы, горадзе, мястэчку).

2. Падрыхтоўка рэфератаў да "Круглага стала" (канферэнцыі) па тэме "Школа будучыні", або "Шляхі ўдасканалення падрыхтоўкі спецыялістаў у навучальнай установе".

3. Наведванне навучальнай установы новага тыпу (ліцэя, каледжа, гімназіі), сустрэча з педагогамі і навучэнцамі.

4. Распрацоўка рэкамендацый для педагагічнага савета, студэнцкага прафкома па пытаннях дэмакратызацыі навучальнага працэсу, удасканалення падрыхтоўкі спецыялістаў у навучальнай установе.

## ЛІТАРАТУРА:

### Асноўная


Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Закон РБ // Звязда. 1991. 21 лістап.

Андрэева Е. За нацыянальную школу // Наст. газ. 1995. 20 верас. С. 4.

Андрэева Е., Лыч Л. Нацыянальная асвета: традыцыі і праблемы // Наст. газ. 1992. 29 чэрв.; 15, 25 ліп.; 8 жн.; 2, 16, 26 верас.

Андрэева Е., Лыч Л. У сферы дзяржаўнай палітыкі: Нацыянальна-культурнае Адраджэнне і асвета // Наст. газ. 1994. 9 лют. С. 4.

Антология педагогической мысли БССР / Сост. Э. К. Дорошевич и др. М., 1986.

Арлова Г. П. Беларуская народная педагогіка. Мн., 1993.

Асвета і педагагічная думка ў Беларусі са старажытных часоў да 1917 г. Мн., 1985.

Бондаренко Е. Г. и др. Учебные заведения нового типа в Республике Беларусь // Адукацыя і выхаванне. 1992. № 1. С. 58—64.

Кавалёў С. А. Асвета ў жыцці беларусаў: Гіст.-псіхал. нарыс // Нар. асвета. 1995. № 11. С. 128—139.

Канцэпцыя выхавання ў нацыянальнай школе Беларусі // Нар. асвета. 1993. № 7. С. 3—11.

Канцэпцыя гістарычнай адукацыі ў сярэдняй школе Беларусі / Склад. І. І. Багдановіч і інш. // Наст. газ. 1991. 30 лістап.

Канцэпцыя стандартаў агульнай сярэдняй адукацыі (асноўныя палажэнні) / Склад. Г. М. Пятроўскі і М. С. Крот // Наст. газ. 1994. 22 кастр. С. 3.

Кулінковіч К. А. Этнічная педагогіка беларусаў: Вучэбна-метад. дапаможнік. Мн., 1993.

Ляўко А. І. Гуманізацыя як прынцып перабудовы нацыянальнай школы // Адукацыя і выхаванне. 1994. № 2. С. 48—56.

Народная педагогіка беларусаў: Дапаможнік для настаўнікаў / Адк. рэд. С. В. Снапкоўская. Мн., 1996.

Снапкоўская С. В. Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі: З гісторыі школы і педагагічнай думкі Беларусі канца XIX — пачатку XX ст. Мн., 1995.

Тэарэтычныя падставы канцэпцыі нацыянальнай школы Рэспублікі Беларусь / М. А. Гусакоўскі і інш. // Адукацыя і выхаванне. 1992. № 12. С. 20—29.

Яковенко В. Реформа школы и общество // Бел. думка. 1996. № 5. С. 131—135.

## Дадатковая

Баранава Н. Рысы новых мадэлей адукацыі // Нар. асвета. 1994. № 12.

Баталка Т. І. З гісторыі будаўніцтва нацыянальнай беларускай школы. 1919—1922 гг. // Веснік БДУ. Сер. 3. 1992. № 2.

Бондаренко Е. Г. и др. Образование в БССР: Итоги и перспективы. Мн., 1991.

Бутрым Г.А. Адраджэнне нацыянальнай школы: праблемы выхавання // Нар. асвета. 1993. № 8. С. 19—24.

Вабішчэвіч А. Нацыянальная школа ў Заходняй Беларусі. 1921—1939 гг. // Бел. гіст. часопіс. 1994. № 2.

Гантарэнка А.А. Станаўленне і развіццё ваеннай адукацыі на Беларусі ў XVIII—XIX стст. // Веснік БДУ. Сер. 3. 1993. № 2.

Дзямчук М. Беларуская нацыянальная школа: Час станаўлення // Бел. мова і літ. у школе. 1991. № 2. С. 2—5.

Дубянецкі Э. Чаму вучыць мінулае: Як праходзіла беларусізацыя школ у 20-х гг. // Наст. газ. 1991. 6 лют.

Зайкоўскі Э. Калі на Беларусі з'явілася пісьмо? // Спадчына. 1992. № 2.

Калачова І.І. Сямейнае выхаванне на Беларусі (Другая палова XIX — пачатак XX ст.) // Адукацыя і выхаванне. 1994. № 10. С. 79—85.

Кушнер В. Адукацыя на рубяжы стагоддзяў: праблемы і перспектывы // Бел. гіст. часопіс. 1996. № 1. С. 5—10.

Ляднёва А. Беларуская школа на эміграцыі // Наст. газ. 1995. 13 мая.

Масленікава В. П. Музычная адукацыя ў Беларусі. Мн., 1980.

Мещеряков В. П. Братские школы Белоруссии (XVI — первая половина XVII в.) Мн., 1977.

Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі. 1917—1945 гг. Мн., 1993.

Яноўскі А. Пачаткі гістарычнай адукацыі // Бел. мінуўшчына. 1994. № 3.

**Т а б л і ц а 9.1. Адукацыйная сістэма Беларусі з 1914 па 1995 г. (Статыстычныя даныя: Народное хозяйство БССР в 1987 г.: Стат. ежегодник. Мн., 1988. С.16)**

| Установа | Год | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1914 | 1940 | 1950 | 1980** | 1990** | 01.01.95*** |
| Дашкольныя дзіцячыя ўстановы | | 1316 | 732 | 3717 | 5350 | 4693 |
| колькасць дзяцей, тыс. чал. | | 63,9 | 29,0 | 448,6 | 608,0 | 478,6 |
| Агульнаадукацыйныя сярэднія школы ўсіх відаў | 7682 | 12 294 | 12 715 | 6968 | 5325 | 5062 |
| колькасць навучэнцаў, тыс. чал. | 489 | 1737 | 1555 | 1525 | 1482 | 1561 |
| Сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы: | | | | | | |
| ПТВ | 8* | 61* | 103 | 220 | 238 | 252 |
| колькасць навучэнцаў, тыс. чал. | 0,6 | 14,0 | 32,8 | 143,5 | 132,3 | 130,1 |
| тэхнікумы | 15 | 128 | 107 | 135 | 147 | 145 |
| колькасць студэнтаў, тыс. чал. | 1,4 | 35,0 | 41,8 | 163,0 | 144,0 | 124,5 |
| Вышэйшыя навучальныя ўстановы | | 25 | 29 | 32 | 33 | 40 |
| колькасць студэнтаў, тыс. чал. | | 21,5 | 31,6 | 177,0 | 188,6 | 174,2 |

* БелСЭ. Т. 12. Мн., 1975. С. 382.

** Народное хозяйство РБ в 1991 г.: Стат. сб. Мн., 1993. С.63, 110, 112, 123.

*** Наст. газ. 1995. 20 снеж. С. 7.

# Тэма 10

# ПРЫРОДНЫЯ ЎМОВЫ І ЭКАЛАГІЧНАЯ СІТУАЦЫЯ НА БЕЛАРУСІ

Гэта тэма з'яўляецца вельмі насычанай па агульнаму аб'ёму матэрыялу і абагульняе звесткі геаграфічнага, геалагічнага, біялагічнага і экалагічнага характару, якія былі раней набыты ў сярэдняй школе. У працэсе заняткаў (лекцыі і семінара) выкладчыку рэкамендуецца звярнуць увагу на найбольш значныя пытанні тэмы (напрыклад: Прыродныя ўмовы Беларусі і багацці яе нетраў; Экалагічная сітуацыя ў рэспубліцы і шляхі яе паляпшэння), а таксама на новыя праблемы, якія датычаць тэмы: асаблівасці геаграфічнага месцазнаходжання Беларусі, спецыфіка расліннага і жывёльнага свету, уплыў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС на жыццё беларускага народа і прыроду, а таксама шляхі пераадолення вынікаў гэтай катастрофы.

Трэба звярнуць увагу навучэнцаў (студэнтаў) на зварот Вярхоўнага Савета нашай дзяржавы да міравога супольніцтва з мэтай атрымання дапамогі на шляхах пераадолення Чарнобыльскай катастрофы, пастанову Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь (1990) аб абвяшчэнні нашай зямлі зонай нацыянальнага бядотнага становішча — зонай экалагічнага бедства.

На занятках па гэтай тэме, якія магчыма спалучыць з экскурсіямі ў прыроду, неабходна звярнуць увагу навучэнцаў на экалагічныя пытанні і ўсё больш узрастаючую ролю кожнага чалавека ў ахове прыроды. Так, з 1956 г. дзейнічае Міжнародны саюз аховы прыроды і прыродных рэсурсаў, які з 60-х гадоў пачаў друкаваць спісы рэдкіх і знікаючых відаў. На падставе такіх спісаў пачалі публікаваць нацыянальныя Чырвоныя кнігі.

Выкладчык, знаёмячы навучэнцаў з прыродаахоўнай палітыкай у нашай дзяржаве, можа спаслацца на "Чырвоную кнігу". Так, "Чырвоная кніга БССР" была ўпершыню апублікавана ў 1981 г. і ўключала 80 відаў жывёлін, з якіх 10 — млекакормячыя і 45 — птушкі. У другое выданне "Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь" (Мн., 1993) ужо ўнесены 75 з 224 відаў птушак, якія гняздуюцца, 14 з 70 відаў млекакормячых (Никифоров М. Е. и др. Охотничьи звери и птицы Белоруссии. Мн.: Урожай, 1991. С. 4). Гэтыя лічбы сведчаць аб нарастаючай экалагічнай ката-

строфе. Таму ў "Чырвонай кнізе Рэспублікі Беларусь" адзначаецца, што "Інтэнсіўная антрапагенная трансфармацыя прыродных комплексаў Беларусі, а таксама ўсё больш узрастаючае спажыванне прыродных, у прыватнасці біялагічных, рэсурсаў паўсюдна прыводзіць да колькаснай і якаснай дэградацыі знешняга асяроддзя, адной з праяў якой з'яўляецца рэзкае скарачэнне колькасці або поўнае знішчэнне папуляцый многіх, пераважна рэдкіх відаў, жывёл і раслін. Неабходнасць захавання флоры і фауны, біялагічнай разнастайнасці, чысціні генафонду ў Беларусі набывае асабліваe значэнне ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай атамнай станцыі (красавік 1986 г.), якая прывяла да забруджвання радыёнуклідамі пятай часткі тэрыторыі рэспублікі і стварыла значную небяспеку для чалавека, для расліннага і жывёльнага свету" (С. 5). "Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь" не толькі дае каштоўныя даведкі па стану прыроды нашага краю, яна з'яўляецца своеасаблівай праграмай правядзення цэлага комплексу прыродаахоўных мерапрыемстваў на ўсёй Беларусі, у якіх могуць прымаць удзел навучэнцы і студэнты навучальных устаноў рэспублікі.

З мэтай паглыблення ведаў навучэнцаў у сучасных пытаннях аховы прыроды выкладчыку раім адзначыць, што на Беларусі створаны і дзейнічаюць чатыры прыродныя лабараторыі: Бярэзінскі міжнародны біясферны запаведнік (з 1925 г.); Прыпяцкі ландшафтна-гідралагічны запаведнік (1969 г.), Палескі радыёэкалагічны запаведнік (1986—1987 гг.), Нацыянальны дзяржаўны парк "Белавежская пушча" (1939 г.), а таксама 88 заказнікаў: ландшафтныя, гідралагічныя, батанічныя, заалагічныя, паляўнічыя, мемарыяльныя і інш. З 1995 г. ствараецца новы Нацыянальны парк "Браслаўскія азёры", з 1996 г. — "Возера Нарач".

Адзначаючы эфектыўнасць працы навуковых калектываў ахоўных тэрыторый, можна спаслацца на канкрэтныя прыклады. Так, дзякуючы дзейнасці Бярэзінскага запаведніка была адноўлена беларуская папуляцыя бабра і лася; запаведніка "Белавежская пушча" — зубра, казулі, высакароднага аленя.

У працэсе падрыхтоўкі заняткаў па гэтай тэме выкладчыку неабходна карыстацца 5-томнай энцыклапедыяй "Прырода Беларусі", часопісам "Прырода Беларусі" (выдаецца з 1972 г. і змяшчае цікавыя матэрыялы аб прыродзе нашага краю, асвятляе актуальныя пытанні яе аховы), экалагічнымі газетамі. Падрабязны спіс літаратуры, якой могуць карыстацца як выкладчыкі, так і навучэнцы ў час падрыхтоўкі рэфератаў, змешчаны ў папулярнай энцыклапедыі "Прырода Беларусі" (Мн.: БелСЭ, 1986. С.593—596), выданні "Новыя кнігі Беларусі" (1994. № 8. Дадатак "Прыродныя багацці Беларусі": Рэк. бібліягр. спіс), "Чырвонай кнізе Рэспублікі Беларусь" (Мн., 1993).

На занятках па гэтай тэме пажадана азнаёміць навучэнцаў з новымі картамі (картамі-схемамі) Беларусі: фізічнай, дзе змешчаны новыя звесткі аб радовішчах карысных выкапняў;

экалагічнай, дзе адзначаны радыяцыйнае становішча і аб'екты прыродаахоўнай дзейнасці.

У мэтах замацавання матэрыялу тэмы рэкамендуецца падрыхтоўка рэфератаў, адказаў на кантрольныя пытанні, а таксама практычных заданняў.

Завяршаючы разгляд зместу гэтай тэмы, выкладчык можа прапанаваць навучэнцам зрабіць калектыўныя высновы аб тым, што:

1) натуральныя прыродна-геаграфічныя фактары Беларусі ўплывалі і ўплываюць на фарміраванне асаблівасцей этнасу, яго светапогляду, характару, самасвядомасці, на матэрыяльную і духоўную дзейнасць, нацыянальную культуру;

2) сучасныя экалагічныя праблемы маюць сусветны характар, і трэба аб'ядноўваць намаганні чалавецтва ў мэтах сумеснага вырашэння глабальных пытанняў, якія ўплываюць на чалавека і будучыя пакаленні, флору і фауну.

## Кантрольныя пытанні:

1. Якімі прыроднымі рэсурсамі і карыснымі выкапнямі багата Беларусь?

2. Якія новыя галіны вытворчасці створаны ў нашай дзяржаве на аснове радовішчаў карысных выкапняў?

3. Як уплывае дзейнасць нашага грамадства на прыроднае асяроддзе?

4. Чаму і дзе ўзніклі на Беларусі зоны экалагічнага бедства?

5. Што ажыццяўляецца ў нашай дзяржаве ў мэтах паляпшэння экалагічнай сітуацыі?

6. У чым сутнасць "Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь" і які змест яна мае?

7. Які ўплыў зрабіла катастрофа на Чарнобыльскай АЭС на Беларусь?

8. Якімі шляхамі пераадольваецца ўплыў Чарнобыльскай катастрофы ў нашым грамадстве?

9. Якія прыродаахоўныя тэрыторыі створаны на Беларусі? У чым сутнасць дзейнасці запаведнікаў, заказнікаў, нацыянальных паркаў?

10. Як клапоцяцца ў Вашай мясцовасці аб ахове жывёл і раслін? Ці растуць у Вашым рэгіёне рэдкія расліны, занесеныя ў "Чырвоную кнігу"?

## Тэматыка рэфератаў:

1. Нетры Беларусі: ці бедныя яны?

2. Помнікі прыроды.

3. Прыродакарыстанне і ахова прыроды на Беларусі.

4. Уплыў Чарнобыльскай катастрофы на экалогію Беларусі.

5. Пераадоленне вынікаў аварыі на ЧАЭС у Беларусі, былых рэспубліках Саюза.

6. Экалагічная сітуацыя рэгіёна і перспектывы яе паляпшэння (на прыкладзе рэгіёнаў, гарадоў, вёсак Беларусі, дзе пастаянна жывуць студэнты, або на прыкладзе населенага пункта, дзе знаходзіцца навучальная ўстанова).

7. Водныя багацці Беларусі, іх выкарыстанне і праблемы экалогіі.

8. Параўнальны аналіз звестак, змешчаных у двух выданнях "Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь" — першае выданне — 1981 г., другое — 1993 г.

## Практычныя заданні:

1. Збор матэрыялаў да калекцый: "Карысныя выкапні Беларусі"; "Раслінны свет Беларусі".

2. Падрыхтоўка звестак аб экалагічнай сітуацыі ў раёне, горадзе, мястэчку; выкарыстанне набытых звестак на занятках для артыкула ў газету.

3. Падрыхтоўка гістарычных звестак аб помніках прыроды свайго раёна, горада.

4. Удзел у прыродаахоўных мерапрыемствах, якія ажыццяўляюцца ў навучальнай установе, раёне, горадзе, вобласці, рэспубліцы.

5. Падрыхтоўка і правядзенне экскурсіі "Мой родны кут".

6. Падрыхтоўка плакатаў да выставак "Прырода і чалавек", "Прырода — наш агульны дом", "Чарнобыль і экалогія" і г.д.

7. Здыманне відэафільма або падрыхтоўка фотарэпартажу аб прыродзе Беларусі, помніках прыроды, праблемах экалогіі.

## ЛІТАРАТУРА:

### Асноўная


Аб асабліва ахоўваемых прыродных тэрыторыях і аб'ектах. Закон Рэспублікі Беларусь // Нар. газ. 1994. 30 лістап.

Аб ахове навакольнага асяроддзя. Закон Рэспублікі Беларусь. Мн., 1993.

Ахова прыроды ў Беларусі // Беларусь. 1993. № 8. С. 32—33.

Ахоўныя прыродныя тэрыторыі і помнікі прыроды Беларусі. Мн., 1985.

Блакітная кніга Беларусі: Водныя аб'екты Беларусі: Энцыкл. Мн., 1994.

Воронин Ф. Н. Фауна Белоруссии и охрана природы. Мн., 1967.

Гурскі Б. М. Як збудаваны і чым багатыя нетры Беларусі. Мн., 1992.

Земля тревоги нашей / В. Яковенко, А. Люцко, А. Петрашкевич и др. О последствиях аварии на Чернобыльской АЭС, проблемах экологии Белоруссии. Мн., 1991.

Лиштван И. Оглянись в тревоге: Беларусь стала зоной экологического бедствия // Чалавек і эканоміка. 1994. № 9. С. 35.

Люцко А. М., Ролевич И. В., Тернов В. И. Выжить после Чернобыля. Мн., 1990.

Моисеева А. Б. Охраняемые растения белорусской флоры. 2-е изд. Мн., 1980.

На парозе экалагічнага крызісу: Гутарка акад. В. І. Парфёнава і кар. А. Дзятлава // Родная прырода. 1994. № 4. С. 14—16.

Памятники природы Белоруссии / В. М. Бельский и др. 2-е изд., перераб. и доп. Мн., 1986.

Природа Белоруссии: Попул. энцикл. Мн., 1986.

Смоляр И. Беларусь и мировое сообщество после Чернобыльской катастрофы // Нар. газ. 1995. 24 лют. С. 2.

Чарнобыль: Погляд праз дзесяцігоддзе: Даведнік / Рэдкал.: Я. В. Малашэвіч і інш. Мн., 1996.

Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь: Рэдкія і тыя, што знаходзяцца пад пагрозай знішчэння, віды жывёл і раслін / Бел. Энцыкл. Гал. рэдкал.: А. М. Дарафееў (стар.) і інш. Мн., 1993.

Энцыклапедыя прыроды Беларусі: У 5 т. Мн., 1983—1986.

### Дадатковая

Аўсіевіч М. Залатое "Чорнае золата" Палесся // Родная прырода. 1994. № 5.

Ахоўныя расліны Беларусі. Мн., 1984.

Бабарыкін А. Землятрусы на Беларусі? // Беларусь. 1995. № 4. С. 32.

Боўш В. І. Філасофскі аналіз экалагічных запатрабаванняў // Весці АН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 1993. № 1.

Ганчар У. Эталон беларускай прыроды ў біясферы зямлі: Аб Бярэзінскім запаведніку // Беларусь. 1993. № 12. С. 29.

Заповедники Белоруссии: Исследования. Вып. 1—8. Мн., 1977—1984.

Козловская Н.В. Флора Белоруссии: закономерности ее формирования, научные основы использования и охраны. Мн., 1978.

Конопля Е. Чернобыль: концепции и жизнь // Сов. Белоруссия. 1991. 18 янв. С. 3.

Кульменева Л. Г., Котов Н. Н. Радиобиология: Учеб. пособие для 10—11-х кл. ср. шк. Мн., 1993.

Кучынскі В., Улаховіч М. Экалагічны крызіс і інфармацыйная палітыка ў Беларусі // Бел. гіст. часопіс. 1996. № 4.

Малышевич Е.В. Краткий словарь-справочник по охране природы. Мн., 1987.

Махнач А. Чем богаты?: Ресурсные возможности Белоруссии: современный взгляд // Бел. думка. 1994. № 1.

Мотесович А. А. Актуальные проблемы состояния и охраны природной среды в Белоруссии. Мн., 1990.

Мядзведзеў А. Прыроду трэба адраджаць разам з гісторыяй і культурай // Беларусь. 1993. № 10. С.8.

Несцярэнка В. Памяць і боль трагедыі // Полымя. 1996. № 3. С. 153—167.

Прырода Беларусі: Рэкамендацыйны бібліяграфічны паказальнік / Склад. Т. К. Лазарук, М. А. Каваленка. Мн., 1981.

Прыродныя багацці Беларусі: Рэк. бібліягр. спіс / Склад. Т. Р. Мацвеева // Новыя кнігі Беларусі. 1994. № 3. Дадатак.

Радыяцыйнае становішча на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Карта-схема па стану на 1 студзеня 1995 г. // Нар. газ. 1995. 16 лют. С. 2.

Шыльнікоўская В. "Букет" — у паветры, "кактэйль" — з крана: Экалогія Мінска // Родная прырода. 1993. № 3.

Якавенка В. Чалавек. Асяроддзе. Соцыум: Да гісторыі сацыяльна-экалагічнага руху ў Беларусі: 80—90-я гг. XX стагоддзя // Набат. 1994. № 5. С. 2.

# Тэма 11

# СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

Гэта тэма вылучаецца сваёй значнасцю ў курсе "Беларусазнаўства" ў сувязі з тым, што фактычна ў ёй завяршаецца аналіз фарміравання беларускага этнасу, які на розных этапах свайго развіцця замацоўваў і ўдасканальваў дзяржаўныя ўтварэнні.

Агляд асноўных этапаў фарміравання беларускай дзяржаўнасці пажадана разглядаць (на падставе параўнальна-гістарычнага метаду) у цеснай сувязі з тымі падзеямі, што адбыліся ў свеце і Еўропе. Выкладчыку рэкамендуецца падкрэсліць на лекцыі, што Беларусь з'яўляецца адной з невялікіх частак Еўропы і таму беларускі народ ішоў па гістарычнаму шляху развіцця разам з іншымі еўрапейцамі. Так, класавае грамадства сярод усходніх славян на тэрыторыі Беларусі, як адзначаецца ў "Нарысах гісторыі Беларусі" (Ч. 1. Мн., 1994. С. 6), узнікла ў другой палове першага тысячагоддзя, калі аналагічныя працэсы адбываліся ў заходняй, паўднёвай і цэнтральнай Еўропе.

Аналізуючы развіццё дзяржаўнасці, выкладчык мае магчымасць падкрэсліць асаблівую ролю Полацкага княства ў далейшым лёсе беларускай народнасці, умовы развіцця беларускай мовы і культуры ў час знаходжання нашых зямель у Вялікім княстве Літоўскім. Напрыклад, на беларускай мове, як больш развітай і дасканалай, пісаліся выдатныя помнікі прававой еўрапейскай думкі сярэднявечча — Статуты Вялікага княства Літоўскага (1529, 1566, 1588 гг.), якія аказалі значны ўплыў на развіццё сацыяльных адносін у дзяржаве і ўдасканаленне юрыдычнай заканадаўчай базы ў іншых краінах.

Некалькі іншыя ўмовы для існавання беларускага народа былі ў часы Рэчы Паспалітай і Расійская імперыі, калі неаднаразова праз нашу зямлю праносіліся крывавыя войны, ішоў націск на нацыянальную беларускую культуру і мову. Капіталістычныя адносіны садзейнічалі працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа, складання беларускай нацыі і ўзнікнення перадумоў для беларускай дзяржаўнасці.

Значныя змены ў развіцці нацыянальнай дзяржавы адбыліся ў XX ст., калі Беларусь разам з іншымі народамі Еўропы

ўступіла ў перыяд рэвалюцый, звяржэння манархій, нацыянальнага адраджэння. Праз своеасаблівыя ступені "БНР — ССРБ — Літ.-Бел.ССР — БССР" ажыццявіўся пераход нацыі да незалежнай Рэспублікі Беларусь, якая ў наш час мае ўсе атрыбуты суверэнітэту, перш-наперш — Канстытуцыю.

Характарызуючы асноўныя гістарычныя этапы развіцця дзяржаўнасці беларускага народа, выкладчык мае магчымасць звязаць новы матэрыял з раней разгледжанай праблемай аб суадносінах этнічных зямель і дзяржаўных тэрыторый (тэму 3), а таксама прывесці прыклады барацьбы славутых дзеячаў нашай зямлі за незалежнасць і нацыянальнае адраджэнне (тэма 6—7). Гэтыя матэрыялы, што вядомы навучэнцам, могуць разглядацца ў форме дыялога, які замацоўвае веды, нагадвае раней вывучанае.

Новы матэрыял тэмы змяшчае сучасныя гісторыка-палітычныя ацэнкі тых дзяржаў, якія раней існавалі на зямлі Беларусі. З мэтай выкарыстання сучасных падыходаў выкладчыку рэкамендуецца азнаёміцца з апошнімі выданнямі вучэбных дапаможнікаў па гісторыі Беларусі для сярэдняй школы, нарысамі гісторыі Беларусі, энцыклапедыяй гісторыі Беларусі, публікацыямі навуковых часопісаў, картаграфічнымі матэрыяламі. Раім звярнуць увагу на навуковыя працы М. Доўнар-Запольскага, В. Круталевіча, М. Сташкевіча, У. Снапкоўскага, Я. Юхо, а таксама на выданне "Гісторыя дзяржавы і права БССР" (Т. 1—2. Мн., 1970—1976).

Частка новага матэрыялу можа грунтавацца на веданні навучэнцамі паліталогіі, асабліва пытанняў аб палітычных партыях і грамадскіх рухах на Беларусі, аб дзейнасці Беларусі на міжнароднай арэне, аб сутнасці палітычнага працэсу.

Цікавыя гісторыка-юрыдычныя меркаванні і вывады аб станаўленні беларускай дзяржаўнасці выказвае доктар юрыдычных навук В. А. Круталевіч у новай кнізе "На шляхах нацыянальнага самавызначэння: БНР — БССР — РБ" (Мн., 1995). Так, аўтар падкрэслівае, што "гісторыю як рэальны працэс нельга перапісаць. З гісторыі нічога не выкінеш. Мінулае не перайначыш, хіба што толькі на паперы. Яго трэба прымаць такім, якім яно было, нічога не дадаючы і нічога ад яго не адымаючы" (С. 54). Гэта цытата можа быць выкарыстана выкладчыкам як у пачатку лекцыі, так і ў заключнай частцы ў якасці аднаго з вывадаў па тэме.

Завяршыць вывучэнне гэтай тэмы рэкамендуецца семінарам (2—4 гадзіны), дзе абмяркоўваюцца кантрольныя пытанні і рэфераты, падрыхтаваныя навучэнцамі.

## Кантрольныя пытанні:

1. Калі і дзе ўзніклі першыя дзяржавы на сучаснай тэрыторыі Беларусі?

2. У чым прычыны ўтварэння і ўзвышэння Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага?

3. Якія фактары ўплывалі на міждзяржаўнае аб'яднанне ВКЛ і Каралеўства Польскага ў Рэч Паспалітую? Калі і чаму скончылася існаванне ВКЛ — Беларуска-Літоўскай дзяржавы?

4. Якія рысы характарызуюць БНР як нацыянальную дзяржаву?

5. У якіх межах была абвешчана БНР? Хто ўзначальваў першы ўрад БНР?

6. Чаму была створана Літоўска-Беларуская Рэспубліка?

7. Якія прычыны ўплывалі на абвяшчэнне БССР? Хто ўзначальваў дзяржаву і першы ўрад БССР?

8. Чаму БССР была рэспублікай — заснавальніцай Саюза ССР? Што аб'ядноўвала БССР і іншыя рэспублікі ў Саюз?

9. Якім статусам валодала БССР у складзе Саюза ССР?

10. Калі і чаму наша рэспубліка абвясціла дзяржаўную незалежнасць і выйшла з Саюза ССР?

11. Як складаюцца адносіны Рэспублікі Беларусь з дзяржавамі — удзельнікамі Садружнасці Незалежных Дзяржаў і былымі рэспублікамі Савецкага Саюза?

12. Якія палітычныя партыі і грамадскія рухі дзейнічаюць на сучаснай Беларусі? Як яны адносяцца да ўдзелу РБ у СНД, Агульным рынку, ААН, НАТО?

13. З якога часу ўдзельнічае Беларусь у дзейнасці Арганізацыі Аб'яднаных Нацый? У якія міжнародныя камітэты ўваходзіць наша дзяржава?

14. Чаму і якія змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыі РБ былі прапанаваны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкам на рэферэндум 24 лістапада 1996 г.?

## Тэматыка рэфератаў:

1. Вытокі беларускай дзяржаўнасці. Полацкае і Тураўскае княствы. Наваградская зямля (Навагрудскае княства).

2. Гісторыя ўтварэння Вялікага княства Літоўскага — Беларуска-Літоўскай дзяржавы.

3. Беларуская Народная Рэспубліка: гісторыя і сучаснасць.

4. Літоўска-Беларуская Савецкая Рэспубліка: прычыны стварэння, гістарычны лёс, лідэры дзяржавы.

5. Беларуская ССР: гісторыя фарміравання і этапы развіцця.

6. Рэспубліка Беларусь на міжнароднай арэне.

7. Удзел дэлегацый БССР і РБ у дзейнасці Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

8. Параўнальны аналіз Канстытуцыі РБ (1994 г.) і БССР (1978 г.).

9. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР ад 27 ліпеня 1990 г.: гісторыя прыняцця, змест, значэнне.

10. Магдэбургскае права ў гарадах Беларуска-Літоўскай дзяржавы.

11. Самакіраванне ў беларускім горадзе: гісторыя і сучаснасць.

12. Статуты ВКЛ: гісторыя стварэння, сутнасць зместу, значэнне гэтых помнікаў прававой думкі.

13. Змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, ініцыіраваныя Прэзідэнтам А. Р. Лукашэнкам і зацверджаныя на рэферэндуме 24 лістапада 1996 г.

14. Супольніцтва Беларусі і Расіі: гісторыя стварэння, шляхі і праблемы развіцця.

## Практычныя заданні:

1. Азнакамленне з гісторыяй беларускай дзяржаўнасці на навуковых працах В. Ластоўскага, У. Ігнатоўскага, М. Доўнар-Запольскага, В. Круталевіча, Г. Штыхава, Я. Юхо; Беларускай энцыклапедыі.

2. Выкананне картаў-схем — наглядных дапаможнікаў да заняткаў:

Княства на зямлі Беларусі;
Межы ВКЛ;
Тэрыторыя БНР;
Фарміраванне тэрыторыі БССР;
Суадносіны этнічных зямель беларусаў і дзяржаўных тэрыторый.

3. Выкананне табліц, схем аб сучасных палітычных партыях і грамадскіх рухах на Беларусі, аб дзяржаўнай атрыбутыцы, геральдыцы (гарадской, княжацкай і г.д.).

## ЛІТАРАТУРА:

### Асноўная


Беларуская энцыклапедыя: У 18 Т. Т. 1—3 / Рэд. кал.: Г. П. Пашкоў і інш. Мн., 1996.

Беларусы: Этнагеаграфія. Дэмаграфія. Дыяспара. Канфесіі: Атлас / Рэд. кал.: С. А. Польскі і інш. Мн., 1996.

Беларусь: Энцыкл. даведнік. Мн., 1995.

Біч М. Дзяржаўнасць Беларусі: Станаўленне, страта, барацьба за аднаўленне (IX ст. — 1918 г.) // Бел. мінуўшчына. 1993. № 5—6. С. 3—7.

Вишневский А. Ф. Очерки истории государства и права Республики Беларусь (1917 — 1995 гг.): Учеб. пособие для юридич. фак. Мн., 1995.

Грыцкевіч А. Гісторыя геапалітыкі Беларусі // Спадчына. 1994. № 1, 3—4.

Дагавор аб стварэнні Супольніцтва Беларусі і Расіі // Бел. думка. 1996. № 6. С. 3—7.

Дрозд Н. Совет Европы и Беларусь: проблемы и перспективы // Бел. думка. 1996. № 10. С. 167—176.

Жылінскі Г. В. З гісторыі фарміравання дзяржаўнасці ў беларусаў // Адукацыя і выхаванне. 1995. № 1. С.81—87.

Ігнаценка І. Месца БНР у гісторыі Беларусі // Наст. газ. 1996. 31 ліп. С.5.

Ілюстраваная храналогія гісторыі Беларусі: Ад старажытнасці да пачатку XX ст. Мн., 1995.

История государства и права Белорусской ССР: В 2 т. / Ред. кол.: С.П.Маргунский и др. Мн., 1976.

Круталевич В. А. На путях национального самоопределения: (БНР — БССР — РБ). Мн., 1995.

Круталевич В. А. Рождение Белорусской Советской республики: (На пути к провозглашению республики. Октябрь 1917 г. — декабрь 1918 г.). Мн., 1975.

Круталевіч В. А. Станаўленне дзяржаўнасці. Мн., 1989.

Мясникович М., Григорьев В. По воле братских народов // Бел. думка. 1996. № 12. С. 3—8.

Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. / Рэд. кал.: М. П. Касцюк (гал. рэд.) і інш. Мн., 1994—1995.

Платонаў Р., Сташкевіч М. БНР: Рэальнасць ці ілюзія? // Звязда. 1989. 23 сак. С. 3.

Платонов Р., Сташкевич Н. Трудный путь к свободе: О ряде важнейших событий 1919 года в истории Белоруссии // Сов. Белоруссия. 1991. 16, 18, 25 июля; 1 авг.

Снапковский В. Е. Путь Беларуси в ООН. 1944—1945 гг. Мн., 1994.

Снапкоўскі У. Геапалітычнае становішча Беларусі: учора і сёння // Бел. мінуўшчына. 1994. № 3.

Снапкоўскі У., Сяргеева Г. Міжнародная дзейнасць Беларусі // Наст. газ. 1994. 16, 20, 30 крас.

Сташкевич Н. С. Исторический путь Беларуси. Мн., 1993.

Сукало В. Не альтернатива, а развитие: О Сообществе Беларуси и России // Бел. думка. 1996. № 7. С. 61—65.

Ширяев Е. Е. Беларусь: Русь Белая, Русь Чёрная и Литва в картах. Мн., 1991.

Штыхаў Г. Вытокі беларускай дзяржаўнасці // Бел. гіст. часопіс. 1993. № 1.

Юхо Я. А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мн., 1992.

### Дадатковая

Административно-территориальное устройство БССР: Справ. В 2 т. Мн., 1985.

Беларуская ССР у Вялікай Айчыннай вайне Савецкага Саюза (1941—1945 гг.): Бібліягр. паказ. літ. Мн., 1980.

Белорусская ССР в международных отношениях. Международные договоры, конвенции и соглашения БССР с иностранными государствами (1944—1959). Мн., 1960.

Белорусская ССР в международных отношениях. Многосторонние международные договоры, конвенции и соглашения БССР (1960—1980). Мн., 1983.

Власова Л.В. БССР в международном культурном и научном сотрудничестве. Мн., 1984.

Гарэцкі Р. Дзяржаўнасць на Беларусі мае больш чым тысячагадовую гісторыю // Бел. мінуўшчына. 1994. № 1.

Дзярновіч А. Адносіны ВКЛ з нямецкімі дзяржавамі // Бел. мінуўшчына. 1994. № 2.

Доўнар-Запольскі М. В. Гісторыя Беларусі. Мн., 1994.

Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. Полацкі і Наваградскі перыяды. Мн., 1990.

Іваноў М. Праблема прыналежнасці Вільні і беларускае нацыянальнае пытанне ў 1939 г. // Бел. гіст. часопіс. 1994. № 1. С. 32—38.

Кіштымаў А. Беларусь і геапалітыка // Беларусь. 1994. № 5.

Мазец В. Межы БНР // Спадчына. 1993. № 2.

Огурцов С. Участие БССР в борьбе за соблюдение прав человека. Мн., 1985.

Октябрь 1917 г..и судьбы политической оппозиции: В 3 ч. / Под общ. ред.

Э. М. Энтина Ч.2. У истоков политического противостояния: Материалы и документы по истории общественных движений и политических партий Республики Беларусь. Гомель, 1993.

Польский С. Азартные игры в географические карты // Бел. думка. 1993. № 1. С.11—16.

Саламонаў А. Якой ты была, Беларусь мая? Ці яшчэ раз пра дзяржаўныя межы // Беларусь. 1991. № 9. С.32—33.

Соловьев А. К. Белорусская Центральная Рада: Создание, деятельность, крах / Под ред. С. М.Симонова. Мн., 1995.

Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй / Пер. з польск. Мн., 1993.

Шыбека Э. Ступені нашага самастварэння // Літ. і мастацтва. 1992. № 9. С. 14—16.

Языкович Л. В. Деятельность БССР в ЮНЕСКО / Под ред. И. М. Игнатенко. Мн., 1986.

# Тэма 12

# АТРЫБУТЫ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СУВЕРЭНІТЭТУ

У гэтай тэме завяршаецца разгляд новага матэрыялу аб станаўленні беларускай дзяржаўнасці і атрыбутах нацыянальнага суверэнітэту. Асновай раскрыцця адзначанай праблематыкі павінна з'яўляцца Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Раім падкрэсліць, што ў Канстытуцыю 1994 г. былі прапанаваны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкам змяненні і дапаўненні, якія зацверджаны на рэферэндуме 24 лістапада 1996 г. Упершыню ў гісторыі беларускага грамадства Асноўны Закон прымаўся ўсенародным галасаваннем.

Выкладчык, характарызуючы Канстытуцыю, мае магчымасць зрабіць кароткую гістарычную даведку пра тыя Канстытуцыі, што прымаліся раней — у 1919, 1927, 1937, 1978, 1994 гг.; Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце (1990), якая мела канстытуцыйны статус. Асаблівая ўвага звяртаецца на змест і структуру сучаснай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, функцыі органаў дзяржаўнай улады і кіравання; свабоды, правы і абавязкі грамадзян нашай дзяржавы; сутнасць змяненняў, якія ўнесены ў 1996 г. Выкладчыку трэба ўлічваць, што некаторыя змястоўныя аспекты Асноўнага Закона Рэспублікі Беларусь маглі вывучацца ў курсах гісторыі, правазнаўства, паліталогіі, і таму пажадана пазбегнуць неабгрунтаваных паўтарэнняў.

Формы арганізацыі заняткаў па гэтай тэме залежаць ад адзначаных вышэй фактараў, таму выкладчык мае магчымасць выкарыстаць некалькі варыянтаў:

а) лекцыя — 2 гадзіны, семінар — 2 гадзіны;

б) лекцыя — 1 гадзіна, практыкум (работа з Канстытуцыяй, іншымі афіцыйнымі дакументамі) — 1 гадзіна, семінар-гутарка — 2 гадзіны;

в) практыкум — 1 гадзіна, лекцыя і адказы на пытанні — 1 гадзіна, семінар-канферэнцыя — 2 гадзіны.

Як сведчыць практыка правядзення заняткаў па гэтай тэме, навучэнцы не вельмі добра ведаюць сутнасць паняццяў "герб", "сцяг", "гімн"; гісторыю Дзяржаўнай сімволікі Рэспублікі Беларусь. Таму змястоўныя пытанні гэтай тэмы пажадана разглядаць у форме дыялога выкладчыка са слухачамі і таксама ў

рэфератах навучэнцаў на семінары — у мэтах замацавання ведаў.

На занятках рэкамендуецца растлумачыць навучэнцам сутнасць тых навук, якія займаюцца вывучэннем дзяржаўнай атрыбутыкі, адзначыць асноўныя тэрміны:

**Геральдыка** (фр. heraldique, лац. heraldus — вяшчальнік) — навука, дапаможная гістарычная дысцыпліна, якая займаецца вывучэннем гербаў (Булыка А.М. Слоўнік іншамоўных слоў. Мн., 1993. С.75);

**Вексілалогія** (лац. vecsilum — вертыкальны шост з кавалкам тканіны) — навука, дапаможная гістарычная дысцыпліна аб флагах, сцягах, харугвах, вымпелах, транспарантах і г.д. (Басаў А., Куркоў І. Флагі Беларусі ўчора і сёння. Мн., 1994. С. 3, 5);

**Герб** — умоўны відарыс, які з'яўляецца сімвалам і распазнавальным знакам дзяржавы, горада, а ў даўніну — роду або асобы і адлюстроўвае гістарычныя традыцыі ўладальніка; звычайна герб складаецца па правілах, прынятых у дадзены час ці ў дадзенай краіне, і зацвярджаецца пэўным заканадаўчым актам (Драчук В. С. Рассказывает геральдика. М., 1977. С. 7—8);

**Сцяг** — старажытнейшы сімвал, які вырабляецца ў адным экземпляры і з'яўляецца сімвалам дзяржаўнай установы, воінскай часці, прыватнай асобы; шыецца з дарагой матэрыі, мае складаны малюнак, багата ўпрыгожваецца; палотнішча сцяга прымацоўваецца да дрэўка;

**Флаг** — сімвал дзяржавы або нацыі; розных дзяржаўных службаў, гарадоў, рухаў, партый, спартыўных і іншых грамадскіх таварыстваў, авіяцыйных і судаходных кампаній, сігнальныя і г. д.; палотнішча мае выразны малюнак, эмблему і каляровую гаму, якія выпрацаваліся ў працэсе гістарычнага развіцця (Басаў А., Куркоў І. Флагі Беларусі ўчора і сёння. С. 4—5); палотнішча флага ўмацоўваецца да флагштока або дрэўка;

**Гімн** (грэч. hymnos) — урачыстая хвалебная песня; у сучасным разуменні гімн — афіцыйна зацверджаная гукавая эмблема дзяржавы (Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 2. Мн., 1994. С. 531).

Пры тлумачэнні гістарычных фактаў аб дзяржаўнай сімволіцы (гербе, сцягу, гімне) выкладчыку неабходна зыходзіць з пэўных прынцыпаў:

1) дзяржаўная сімволіка як у мінулым, так і ў наш час мае палітычны характар;

2) сімволіка не з'яўляецца пастаяннай на ўсе часы, і таму сучасная дзяржаўная сімволіка можа адрозніваецца ад гістарычнай сімволікі;

3) класічная геральдыка — як сістэма ведаў пра гербы, правілы іх складання і выкарыстання — паўнакроўна функцыяніравала толькі пры феадалізме (так, на Беларусі гербы атрымалі шырокае распаўсюджанне ў XIV—XV стст. — на падставе гэтых гербаў маглі ўзнікаць першыя сцягі; новыя гербы пачалі

стварацца пасля падзелаў Рэчы Паспалітай — у XVII—XIX стст., а таксама ў XX ст.);

4) на стабільнасць, збераржэнне старажытных сімвалаў уплываюць розныя фактары: гістарычная спадчына, традыцыі і культура грамадства, веданне народам сапраўды нацыянальных сімвалаў, тэрміны і ўмовы фарміравання нацыі і існавання дзяржавы і г.д.;

5) асаблівасцю стварэння дзяржаўнай сімволікі вызначаюцца ў XX ст. маладыя краіны, якія ў мінулым з'яўляліся калоніямі або не мелі сваіх дзяржаўных утварэнняў у складзе шматнацыянальных дзяржаў.

У якасці дзяржаўных сімвалаў маглі прымацца:

а) флагі і эмблемы нацыянальна-вызваленчых рухаў, якія прыйшлі да ўлады;

б) атрыбуты былых дзяржаў-метраполій з нязначнымі змяненнямі;

в) новыя сімвалы, якія стварыліся як на гістарычнай спадчыне, так і з улікам запатрабаванняў канкрэтных палітычных сіл; верагодна, такія атрыбуты маглі б мець назву "штучных".

Адзначаныя вышэй тэарэтычныя падыходы і прынцыпы ў значнай ступені адлюстраваліся ў гісторыі фарміравання дзяржаўнай сімволікі Беларусі.

У працэсе падрыхтоўкі да заняткаў па тэме выкладчыку раім звярнуць увагу на сутнасць дыскусій, якія адбываліся на розных узроўнях (на дзяржаўным — у Вярхоўным Савеце Беларусі, на навуковым, грамадскім, бытавым і г.д.):

1) у канцы 80 — пачатку 90-х гадоў — напярэдадні абвяшчэння незалежнасці Рэспублікі Беларусь і змянення сімволікі БССР;

2) у сярэдзіне 90-х гадоў, калі пытанне аб Дзяржаўнай сімволіцы выносілася на рэспубліканскі рэферэндум.

Магчыма адзначыць некалькі прынцыповых падыходаў:

а) палітычныя сілы камуністычнага накірунку лічылі неабходным зберагчы сімвалы Савецкай Беларусі і адстойвалі гэту пазіцыю да жніўня 1991 г.;

б) нацыянальна-дэмакратычныя рухі і партыі (БНФ, БСДГ і інш.) прапаноўвалі аднавіць у Беларусі тыя дзяржаўныя сімвалы, што выкарыстоўваліся ў Беларускай Народнай Рэспубліцы, — герб "Пагоня" і бела-чырвона-белы сцяг як "нацыянальныя сімвалы беларускага народа";

в) на рубяжы 80—90-х гадоў, калі абвастрыліся спрэчкі аб нацыянальнай і дзяржаўнай сімволіцы, большасць навукоўцаў не мелі абгрунтаваных поглядаў на гістарычную сімволіку Беларусі, што тлумачылася слабай распрацаванасцю дапаможных гістарычных дысцыплін — геральдыкі і вексілалогіі. Адносна герба "Пагоня" тлумачылася, што спачатку ён быў гербам княжацкім, потым — княжацкага роду, а з 1384 г. — дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай знак "Пагоня" перастаў быць дзяр-

жаўным гербам і выкарыстоўваўся ў якасці гарадскіх гербаў Віцебска, Магілёва, Полацка, Лепеля, Слуцка, Рэчыцы, Суража і інш. (На скрыжаванні думак: Вучоныя аб "белых плямах" гісторыі Беларусі. Мн., 1990. С.110; артыкулы "Герб", "Пагоня" у кн.: БССР. Кароткая энцыкл. Мн., 1978. Т. 1. С. 192, 449).

Герб "Пагоня" і бела-чырвона-белы флаг былі зацверджаны 5 жніўня 1918 г. Сакратарыятам Беларускай Народнай Рады як дзяржаўныя, палітычныя сімвалы ствараемай нацыянальнай дзяржавы — незалежнай ад Савецкай Расіі. Амаль адначасова з гэтым зацверджаннем "Пагоня" з'яўлялася гербам Літоўскай рэспублікі ў 1919—1940 гг., — адзначалі даследчыкі В. Чамярыцкі і Г. Штыхаў (БССР. Кароткая энцыкл. Т. 1. С. 449).

Аўтарам бела-чырвона-белага флага, верагодна, быў К. Є. Душэўскі — член Урада БНР, вядомы дзеяч вызваленчага руху, які пісаў: "Цікава адзначыць, што беларусы выбралі сваім дзяржаўным гербам той, што і літоўцы, гэта значыць белую "Пагоню" на чырвоным полі, аднак нацыянальнага флага не было. Мне давялося зрабіць некалькі праектаў нацыянальнага флага, і адзін з іх быў прыняты, а менавіта: бела-чырвона-белы". — Гэтыя звесткі змешчаны ў артыкуле кандыдата гістарычных навук С. Рудовіча ў газеце "Звязда" ад 25 сакавіка 1992 г.

Бела-чырвона-белы флаг і герб "Пагоня" былі актыўна выкарыстаны ўдзельнікамі Беларускага народнага фронту ў 1988—1989 гг. ва ўмовах дэмакратызацыі нашага грамадства і шукання шляхоў пераадолення недахопаў сацыялізму. Фактычна, гэтыя сімвалы пачалі аб'ядноўваць праціўнікаў камуністычнай партыі і існавання СССР, староннікаў выхаду Беларусі з Саюза, стварэння незалежнай Рэспублікі Беларусь і ажыццяўлення нацыянальнага адраджэння;

г) новыя ўмовы для развіцця дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі стварыліся пасля правалу жнівеньскай спробы 1991 г. умацавання Саюза ССР ваеннымі сродкамі. Вярхоўны Савет БССР (па свайму складу — шматпартыйны з перавагай пракамуністычнай большасці) быў вымушаны абвясціць 25 жніўня 1991 г. рэспубліку незалежнай дзяржавай; 19 верасня змяніў назву "БССР" на "Рэспубліка Беларусь", прыняў Закон "Аб Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь", "Аб Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь".

У перыяд 1991—1995 гг. Дзяржаўным гербам быў старажытны беларускі герб "Пагоня", які сімвалізаваў даўняе існаванне дзяржаўнасці ў беларускага народа; Дзяржаўны флаг уяўляў сабой прамавугольнае палотнішча, якое складалася з трох гарызантальна размешчаных каляровых палос роўнай шырыні: верхняй і ніжняй белага, а сярэдняй — чырвонага колеру. Прыняцце гэтых сімвалаў адбывалася ва ўмовах адказу ад аўтарытарна-таталітарнай сістэмы і яе сімвалаў, распаду Саюза ССР, антыкамуністычнай істэрыі, не толькі нацыянальнага, але і нацыяналістычнага ўздыму. Абставіны таго часу, ціск на дэпутатаў Вярхоўнага Савета з боку апазіцыі, неабходнасць

хуткага, фактычна паспешнага, вырашэння пытанняў аб сімволіцы прывялі да прыняцця азначаных вышэй герба і флага, якія вельмі ўмоўна магчыма вызначыць як "нацыянальныя".

Гісторыя бела-чырвона-белага флага не мае (калі спасылаюцца на вядомыя ў наш час архіўныя матэрыялы і меркаванні часткі гісторыкаў) глыбокіх гістарычных каранёў. Фактычна, гэты флаг пачалі выкарыстоўваць толькі ў пачатку XX ст. — эпізадычна ў 1909—1912 гг., 1917 г.; з 1918 г. — як сімвал БНР. З канца 1918 г., калі ўрад БНР пакінуў тэрыторыю Беларусі і існаваў у эміграцыі, бела-чырвона-белы флаг выкарыстоўваўся тымі палітычнымі сіламі, якія вялі барацьбу супраць Савецкай улады, напрыклад, у лістападзе — снежні 1920 г. у часы так званага Слуцкага паўстання, войскамі Булак-Балаховіча, што рабілася на грошы Польшчы (Басаў А. Н., Куркоў І. М. Флагі Беларусі ўчора і сёння. С. 21—22; Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 2. С. 71—72).

Але ў гісторыі нашай Радзімы зберагаюцца і іншыя факты, якія сведчаць аб падтрымцы народам адзначаных вышэй сімвалаў. Так, прадстаўнікі беларускага дэмакратычнага руху на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая ў 20—30-я гады была ў складзе Польшчы, карысталіся як бела-чырвона-белым, так і чырвоным флагам на мітынгах, дэманстрацыях; гэтай сімволікай насельніцтва вітала ў многіх месцах Чырвоную Армію ў 1939 г. (Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 1. Мн., 1993. С. 393).

У часы другой сусветнай вайны бела-чырвона-белы флаг і герб "Пагоня" выкарыстоўвалі ў сваіх мэтах беларускія калабарацыяністы, якія атрымалі спецыяльны дазвол ад фашысцкіх акупацыйных улад на Беларусі на ўжыванне гэтай сімволікі. (Гл. меркаванне гісторыка А. Літвіна ў газеце "Звязда". 1989. 7 чэрв. С. 3.; Нар. газ. 1993. 25 мая. С. 2; погляды М. Сташкевіча, А. Міхальчанка ў газеце "Советская Белоруссия". 1989. 13 окт. С. 3.)

У пасляваенныя гады гэтыя сімвалы выкарыстоўвалі беларускія эмігранты, у тым ліку паслядоўнікі ўрада (Рады) БНР (Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т.1. С.393).

Гэта вельмі своеасаблівая гісторыя старажытнага сімвала "Пагоня" і бела-чырвона-белага флага, якія амаль немагчыма вызначыць як толькі сімвалы ўсяго беларускага народа, прывяла да дыскусіі, ідэалагічнай і палітычнай барацьбы, вынікам якіх стаў рэспубліканскі рэферэндум 1995 г.

У часы існавання Беларускай ССР (ССРБ, Літоўска-Беларускай ССР, БССР) дзяржаўная сімволіка фарміравалася з улікам рэвалюцыйных умоў і на падставе вопыту Савецкай Расіі. Чырвоны флаг як сімвал рэвалюцыйнай барацьбы быў выкарыстаны ў VIII ст. паўстаўшымі сялянамі ў Персіі, у часы бурных падзей 30-х гадоў XIX ст. у Парыжы і Парыжскай камуне 1870—1871 гг.; з'яўляўся сімвалам камуністычных рухаў розных народаў. У ліпені 1918 г. на V Усерасійскім з'ездзе Саветаў быў прыняты дзяржаўны флаг РСФСР — "чырвонае

палотнішча з літарамі "РСФСР" у форме крыжа ў вугле ля дрэўка... Менавіта гэта палотнішча і стала ўзорам для перайманння ва ўсіх маладых савецкіх рэспубліках", — адзначаюць даследчыкі А. Басаў і І. Куркоў у кнізе "Флагі Беларусі ўчора і сёння" (С.20—21).

У першай Канстытуцыі ССРБ, якая была прынята 3 лютага 1919 г., флаг апісваецца наступным чынам: "Гандлёвы і ваенны флаг С.С.Р.Б. — прамавугольнае чырвонае (пунсовае) палотнішча з залатымі літарамі ў верхнім вугле ля дрэўка "С.С.Р.Б." або надпісам "Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусь".

Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Літва і Беларусь (люты—ліпень 1919 г.) мела дзяржаўны флаг у выглядзе чыстага чырвонага палотнішча з адносінамі шырыні да даўжыні 1 : 2.

Пасля вызвалення ад польскіх акупантаў і аднаўлення ССРБ 1 жніўня 1920 г. па-ранейшаму дзейнічаў Дзяржаўны флаг, прыняты ў лютым 1919 г.

Утварэнне ў снежні 1922 г. Саюза ССР запатрабавала распрацоўкі новага Дзяржаўнага флага рэспублікі на падставе флага СССР, у цэнтры якога быў змешчаны Дзяржаўны герб Саюза ССР. У нашай рэспубліцы па Канстытуцыі БССР 1927 г. была зменена абрэвіятура назвы краіны — яна стала БССР; гэта новая назва і герб размяшчаліся ў верхнім левым вугле флага.

Згодна з Канстытуцыяй БССР, якая была прынята 10 лютага 1937 г., новы флаг атрымаў наступнае апісанне: "Дзяржаўны сцяг БССР складаецца з чырвонага палотнішча з відарысам на яго верхнім вугле, ля дрэўка залатых сярпа і молата і над імі — чырвонай пяціканцовай зоркі, абрамлёнай залатым шлякам, а ўнізе сярпа і молата залатыя літары — БССР. Адносіны шырыні да даўжыні 1 : 2" (Канстытуцыя БССР. Мн., 1938. С. 41).

Колер флага — чырвоны (без пунсовага, як было раней); серп і молат сімвалізавалі саюз рабочых і сялян; пяціканцовая зорка — старажытны сімвал абароны, аховы, бяспекі; гэтыя два сімвалы сімвалізавалі Саветы рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў і існавалі на Дзяржаўным флагу БССР.

Новы шматколерны флаг пачаў стварацца пасля другой сусветнай вайны, калі БССР выйшла на міжнародную арэну і стала адной з дзяржаў-заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. У стварэнні новага Дзяржаўнага флага БССР прымалі ўдзел мастакі, гісторыкі, юрысты, навукоўцы сектара выяўленчага мастацтва Акадэміі навук (Кацер М. Герб и флаг БССР // Политич. собеседник. 1989. № 5. С. 44).

Малюнак флага, створаны М. І. Гусевым, быў зацверджаны 25 снежня 1951 г. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, у якім адзначалася: "... Дзяржаўны флаг БССР — палотнішча, якое складаецца з дзвюх гарызантальна размешчаных палос: верхняй чырвонага колеру, састаўляючай дзве трэціх шырыні, і ніжняй зялёнага колеру, састаўляючай адну трэць шырыні флага, з відарысам у верхнім левым вугле чырвонай

паласы залатых сярпа і молата і над імі чырвонай пяціканцовай зоркі, абрамленай залатым шлякам. Ля дрэўка вертыкальна размешчаны беларускі нацыянальны арнамент белага колеру на чырвоным полі, састаўляючым 1/9 даўжыні флага" (Басаў А., Куркоў І. Флагі Беларусі ўчора і сёння. С. 24—25). Аналагічнае апісанне Дзяржаўнага флага было ўключана ў Канстытуцыю БССР, зацверджаную ў 1978 г. (Канстытуцыя БССР. Мн., 1984. С. 43).

"Чырвоны колер у спалучэнні з нацыянальным арнаментам адлюстроўваў мастацкую творчасць беларускага народа, адзін з традыцыйных элементаў упрыгожвання адзення; зялёны колер увасабляў лясныя і прыродныя багацці Беларусі", — так тлумачылі элементы Дзяржаўнага флага выкладчыкі А. Стуканаў і В. Касмылёў (Сов. Белоруссия. 1989. 15 апр.).

Чырвона-зялёны флаг з беларускім арнаментам умацоўваў і падкрэсліваў гістарычныя, нацыянальныя і прыродныя асаблівасці Беларускай ССР. Дзяржаўны флаг у такім выглядзе існаваў да верасня 1991 г.

**Дзяржаўны герб БССР** мае сваю гісторыю стварэння, прыняцця і далейшага ўдасканалення.

Асновай першага герба ССРБ — БССР быў Дзяржаўны герб РСФСР; апісанне зацверджанага герба давалася ў артыкуле 31 Канстытуцыі БССР, прынятай 3 лютага 1919 г.: "Герб С.С.Р.Б. состоит из изображений на красном фоне в лучах солнца золотых серпа и молота, помещенных крест-накрест рукоятками книзу, окруженных венком из колосьев с надписью:

а) Социалистическая Советская Республика Белоруссия;

б) Пролетарии всех стран, соединяйтесь!"

(История Советской Конституции. М., 1957. С.112—113).

З цягам часу Дзяржаўны герб БССР набываў некаторыя самабытныя асаблівасці, характэрныя для нашай краіны, адначасова адлюстроўваў уваходжанне Беларусі ў склад Саюза ССР і некаторыя сацыялістычныя ідэалы (выявы гербаў Беларусі дадзены ў дадатку да тэмы).

Утварэнне СССР з'явілася штуршком да пошукаў новага герба нашай рэспублікі. Ён павінен быў выразна падкрэсліваць як адметныя рысы рэспублікі, так і адзінства ўсёй краіны. У 1924—1927 гг. урадам БССР быў абвешчаны і адбыўся конкурс на стварэнне герба рэспублікі, які сабраў спачатку 39 праектаў, а затым яшчэ 48 малюнкаў. Непасрэдны ўдзел у працы над праектам герба ў 1924—1926 гг. прымалі беларускія мастакі П. М. Гуткоўскі, Г. Е. Жмудзінскі, М. В. Лебедзева, В. В. Волкаў, Паўловіч і інш. У разглядзе праектаў і эскізаў удзельнічалі беларускія вучоныя, дзеячы навукі і культуры М. В. Доўнар-Запольскі, Б. І. Эпімах-Шыпіла, Я. Л. Дыла, І. І. Замоцін, а таксама дзяржаўныя кіраўнікі А. Р. Чарвякоў, І. А. Адамовіч, А. В. Баліцкі і інш. Найлепшым быў прызнаны праект кіраўніка Беларускага мастацкага тэхнікума з г. Віцебска мастака В. Волкава. Праект В. Волкава пасля ўнясення паправак

(чырвоная лента з белай каймой была заменена чырвонай, жыта пераплецена канюшынай, фарбы зямнога шара вытрыманы ў адпаведнасці з гербам СССР) быў зацверджаны на VIII Усебеларускім з'ездзе Саветаў 11 красавіка 1927 г.

Паміж 1927 — 1958 гг. у герб уносіліся некаторыя змены:

а) *у выяве* — правая частка вянка існавала ў выглядзе дубовай галінкі (раней — у 1919 — 1927 гг. — абедзве часткі вянка былі з каласоў жыта); 26 ліпеня 1939 г. па рашэнню сесіі Вярхоўнага Савета БССР заменена на каласы жыта, пераплеценыя льном;

б) *у надпісах* — заклік "Пралетарыі ўсіх краін, злучайцеся!" быў напісаны на чатырох дзяржаўных мовах нашай рэспублікі: з левага боку — на беларускай і яўрэйскай мовах, з правага боку — на рускай і польскай (раней — у 1919 — 1927 гг. — толькі на беларускай і рускай мовах); з лістапада 1938 г. — на беларускай і рускай мовах ("Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!"); у 1958 г. было зменена напісанне апошняга слова ў лозунгу: "яднайцеся".

У перыяд 1958—1991 гг. Дзяржаўны герб БССР існаваў стабільна і змены не ўносіліся. Паводле Канстытуцыі БССР 1978 г., як зацверджана ў артыкуле 167, "Дзяржаўны герб БССР складаецца з ізабражэння ў праменнях узыходзячага сонца сярпа і молата, акружаных вянком, які складаецца злева з жытніх каласоў, пераплецяных канюшынай, і справа — з жытных каласоў, пераплецяных ільном; унізе паміж абедзвюма палавінамі вянка знаходзіцца частка зямнога шара. Абедзве палавіны вянка абвіты чырвонай стужкай, на якой змешчаны надпісы на беларускай і рускай мовах: "Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!", і ніжэй — "БССР". У верхняй частцы герба — пяціканцовая зорка" (Канстытуцыя БССР. Мн., 1984. С.43).

Характарызуючы колеры, якія замацаваны за дзяржаўнымі сімваламі Беларусі — флагам і гербам, выкладчык можа спаслацца на меркаванне намесніка начальніка Галоўнага архіўнага ўпраўлення А.Міхальчанка: "Колеры і арнамент падкрэсліваюць і нашы этнічныя карані. Арнамент быў распаўсюджаны ў тых месцах, дзе пасяліліся радзімічы. Чырвоны колер (колер сцяга Вялікага княства Літоўскага, рэвалюцыі) звязваецца народнай этымалогіяй з крывічамі. Зялёны — з драўлянамі, дрыгавічамі, якія з некаторымі іншымі плямёнамі склалі аснову беларускага этнасу" (Сов. Белоруссия. 1989. 13 окт. С. 2).

Тыя малюнкі — геральдычныя атрыбуты, што змяшчаліся на Дзяржаўным гербе БССР, можна растлумачыць наступным чынам:

*сонца* — сімвал жыцця, свету, агня, багацця;
*каласы жыта* — жыватворная моц народа, мір, дабрабыт;
*кветкі льну і канюшыны* — прыродныя багацці нашай зямлі.

Раскрыццё сутнасці чырвонай зоркі, сярпа і молата давалася ў тэксце адносна флага БССР і сімволікі савецкага часу.

Завяршаючы тлумачэнне і разгляд дзяржаўнай сімволікі БССР, трэба адзначыць, што:

— першыя Дзяржаўныя флаг і герб БССР не адлюстроўвалі ніякіх нацыянальных асаблівасцей рэспублікі; парушалі адзін з асноўных законаў класічнай геральдыкі, які забараняў выкарыстанне аднаго і таго ж герба (флага) рознымі дзяржавамі;

— толькі ў 1927—1938 гг. Дзяржаўны герб набыў некаторыя нацыянальныя рысы, якія адлюстроўвалі ў графічнай і змястоўнай форме суверэнітэт рэспублікі; у перыяд 1958—1991 гг. герб існаваў стабільна;

— Дзяржаўны флаг — чырвона-зялёны з нацыянальным арнаментам — быў зацверджаны ў 1951 г.;

— пэўным недахопам сімволікі сацыялістычнага часу з'яўлялася тое, што Дзяржаўныя флаг і герб БССР былі залішне падобнымі на флагі і гербы іншых рэспублік былога Саюза ССР;

— пад выявай гэтых дзяржаўных сімвалаў народ Беларусі ажыццявіў значныя змены на шляху сацыяльна-эканамічнага і культурнага прагрэсу.

У наш час, калі Беларусь абвясціла сябе міралюбівай краінай, якая мае мэту быць нейтральнай і бяз'ядзернай дзяржавай, адзначаецца ў артыкуле 18 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (Мн., 1997. С. 8), старадаўні герб часоў сярэднявечча з выявай воіна з паднятым мячом не стаў адпавядаць сучасным сацыяльным умовам. Бо фактычна кожны чалавек можа спытаць: на каго падняты гэты меч? Як гэта стасуецца з палітыкай міру? Калі параўноўваць выяву "Пагоні" з дзяржаўнымі гербамі іншых краін свету, выкладчыку пажадана адзначыць, што *амаль ніводная* не мае ў гербе ваенных эмблем феадальных і больш позніх часоў (так, выява мяча прысутнічае ў гербах Манака, Тонга). Традыцыі сярэднявечча замацаваліся ў гербах тых дзяржаў, дзе ў наш час існуюць манархічныя формы ўлады, а ў большасці дзяржаў існуюць параўнальна новыя гербы і флагі, якія, як сведчыць гісторыя, ствараліся і прымаліся на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў (напрыклад, у ЗША дзяржаўны флаг усталёўваўся амаль 20 гадоў і быў афіцыйна ўведзены ў 1794 г.; у Канадзе прыняты праз 97 гадоў пасля абвяшчэння федэрацыі (Баскаков Э. Биографии гербов, флагов и гимнов зарубежных стран. М., 1967. С. 98, 127)).

Выкладчыку трэба падкрэсліць, што сучасныя дзяржаўныя сімвалы — герб і сцяг Рэспублікі Беларусь — былі ўведзены параўнальна нядаўна — па выніках падтрымкі насельніцтвам на рэспубліканскім рэферэндуме, які адбыўся 14 мая 1995 г., ініцыятыў і прапаноў Прэзідэнта А. Р. Лукашэнкі. У афіцыйным паведамленні Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў адзначалася, што за адабрэнне пытання "Ці падрымліваеце Вы прапанову аб устанаўленні новых Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь?" прагаласавалі 3 622 851 чалавек, або 75,1 %; супраць прагаласавалі 988 839 чалавек, або 20,5 %; 211 792 бюлетэні прызнаны несапраўднымі (Нар. газ. 1995. 26 мая. С.2).

Выкладчыку раім падкрэсліць, што рэферэндум адбыўся ва ўмовах дэмакратызацыі грамадства, калі грамадзяне мелі магчымасць выказаць свае думкі праз галасаванне. Вынікі галасавання замацаваны Указамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь адносна новай дзяржаўнай сімволікі — сцяга і герба (тэксты Указаў надрукаваны ў "Народнай газеце" 13 і 14 чэрвеня 1995 г.).

*Пытанне аб гімне* Беларусі можна разглядаць як на лекцыі, так і на семінары. Выкладчыку раім адзначыць, што на працягу даволі значнага шляху Беларуская ССР не мела свайго Дзяржаўнага гімна. У першыя гады савецкай улады ў якасці гімна выкарыстоўваўся "Інтэрнацыянал" — Міжнародны гімн камуністаў; у 1943 г. быў зацверджаны Гімн СССР, які ў пасляваенныя гады гучаў і на тэрыторыі Беларусі як сімвал аб'яднання розных народаў у шматнацыянальнай дзяржаве. У Канстытуцыях БССР 1919, 1927, 1937 гг. нават не было асобных артыкулаў адносна дзяржаўнага гімна (История Советской Конституции: Сб.док. М., 1957. С. 112—113).

У гады Вялікай Айчыннай вайны, калі рыхтавалася ўступленне БССР у склад Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, завяршалася распрацоўка адпаведнай нацыянальна-дзяржаўнай атрыбутыкі.

У 1943 г. Урад БССР абвясціў конкурс на стварэнне Дзяржаўнага гімна БССР. У конкурсе прымалі ўдзел беларускія паэты А. Астрэйка, П. Броўка, П. Глебка, М. Танк, М. Клімковіч. На кожны з паэтычных тэкстаў была створана музыка. Аднак конкурсная камісія ні адзін з іх не зацвердзіла ў якасці Нацыянальнага гімна БССР: песням не ставала эмацыянальнай выразнасці, глыбокага абагульнення, мастацкай завершанасці. Таму ў наступныя гады конкурс па стварэнню Дзяржаўнага гімна БССР быў працягнуты. Адначасова конкурсная камісія рэкамендавала паасобныя творы да выканання і публікацыі. Гэта былі песні "Мы — беларусы" М. Аладава і Н. Сакалоўскага (словы М. Клімковіча), "Шуміць наша слава" С. Палонскага і А. Багатырова (словы П. Броўкі) і шэраг іншых. На словы М. Клімковіча таксама напісалі музыку П. Падкавыраў, Н. Сакалоўскі. У першыя пасляваенныя гады гэта песня была, бадай, самай любімай на Беларусі, асабліва на музыку Н. Сакалоўскага.

Патрыятычная песня "Мы — беларусы", якую напісалі паэт М. Клімковіч і кампазітар Н. Сакалоўскі, прысвячалася дружбе беларускага народа з Расіяй, брацкімі народамі Савецкага Саюза. Гэта конкурсная песня, як і іншыя, мела як некаторыя станоўчыя якасці, так і неадпаведнасць наступным умовам конкурсу — запамінальнасць, лёгкасць засваення, эмацыянальная яркасць, закончанасць мастацкай формы. У далейшым паэт Міхась Клімковіч неаднаразова дапрацоўваў тэкст, дамагаўся мастацкай прастаты і яснасці думкі. Музычную структуру песні перагледзеў і Нестар Сакалоўскі, у выніку песня загучала больш урачыста і гімнічна.

У канцы 1949 г. аўтары перапрацавалі песню — узбагацілі фактуру, надалі ёй больш стрыманы тэмп, характэрны для ўрачыстасці гімна. У гэтым выглядзе песня з новым варыянтам тэксту была прадстаўлена Вярхоўнаму Савету БССР.

Дзяржаўны гімн Беларускай ССР як урачыстая песня і афіцыйная музычная эмблема нашай дзяржавы быў зацверджаны Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР 24 верасня 1955 г. Аўтарамі гімна былі паэт М. Клімковіч (1899—1954 гг.) і кампазітар Н. Сакалоўскі (1902—1950 гг.). Гімн Беларусі як урачыстая песня выконваецца ў сувязі з дзяржаўнымі і грамадскімі святамі, афіцыйнымі цырыманіяламі і разам з Дзяржаўным гербам і Дзяржаўным флагам з'яўляецца сімвалам дзяржаўнага суверэнітэту рэспублікі (БССР. Кароткая энцыклапедыя. Т. 1. Мн., 1978. С. 239; Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. Т. 2. Мн., 1985. С. 80—81).

Паўсюднае выкананне гімна было ўведзена з 1 кастрычніка 1955 г. Упершыню Дзяржаўны гімн БССР урачыста прагучаў на вечары польска-савецкай дружбы ў Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі ў Мінску (Содаль У. І. Людзьмі звацца. Мн., 1977. С. 66—70).

Гімн БССР (у сукупнасці музычнай і тэкставай частак) існаваў да жніўня 1991 г. У сувязі з тым, што гэты гімн быў створаны ў гістарычна мінулыя гады і паэтычная (тэкставая) частка застарэла (ухваляліся кіраўнічая роля камуністычнай партыі, імя У. І. Леніна, вельмі недастаткова раскрываліся нацыянальныя асаблівасці, гісторыя і традыцыі Беларусі), пачала выкарыстоўвацца толькі музычная частка Дзяржаўнага гімна БССР. Адначасова Вярхоўны Савет Беларусі зацвердзіў спецыяльную камісію па арганізацыі конкурсу на стварэнне Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь. У працэсе конкурсу камісія адабрала 7 варыянтаў новага гімна. У фінал конкурса вылучылі наступныя творы: "Магутны Божа" (словы Н. Арсенневай, музыка М. Равенскага), "Мы выйдзем шчыльнымі радамі" — былы гімн БНР (словы М. Краўцова, музыка У. Тэраўскага), "Пагоня" (словы М. Багдановіча, музыка М. Куліковіча); тры паэтычныя творы сучасных аўтараў пад дэвізамі "О, фартуна!", "А хто там ідзе?", "Трэці варыянт" і адзін музычны твор пад дэвізам "Белая вежа" (Нар. газ. 1992. 15 ліп.).

Матэрыялы конкурсу, а таксама водгукі грамадзян былі надрукаваны на старонках рэспубліканскага друку (Звязда. 1991. 6 верас.; Добры вечар. 1992. 19 жн.; Літ. і мастацтва. 1993. 12 лістап. і інш.). Праекты новага гімна гучалі па радыё, у зале паседжанняў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Па выніках конкурсу ні адзін з варыянтаў не быў прыняты ў якасці гімна рэспублікі. Таму Вярхоўны Савет Беларусі зацвердзіў у якасці тэксту Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь вядомы верш нацыянальнага паэта Я. Купалы "Маладая Беларусь" ("Вольны вецер напеў..."), у якім "увасоблена ідэя адраджэння дзяржаўнага станаўлення Беларусі", змешчаны "сэнсоўна знач-

ныя заклікі", "прыгожыя вобразы народа і яго зямлі", — адзначаў старшыня журы конкурсу на Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь Н. Гілевіч (Нар. газ. 1993. 19 кастр. С. 2). На гэтыя радкі і прапанавана кампазітарам напісаць музычную частку гімна.

У апошнія гады на старонках друку пачалі выказвацца прапановы аб тым, каб пакінуць музычную частку без змен і падрыхтаваць новыя вершы, якія "ўпісаліся б" у існуючую мелодыю. У некаторых газетах былі надрукаваны праекты такіх вершаваных радкоў (Настаўн. газ. 1994. 23 лістап. С. 4; Нар. газ. 1995. 2 сак. С. 2).

Можна адзначыць, што Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь знаходзіцца ў стадыі стварэння і існуюць некалькі варыянтаў яго будучыні. Раім завершыць разгляд гэтага пытання праслухоўваннем музычнай часткі гімна.

Іншыя пытанні: аб сталіцы, геральдыцы, беларускім войску, грошах, паштовых марках — мэтазгодна абмеркаваць на семінары. Карысныя і змястоўныя матэрыялы для рэфератаў змешчаны ў Беларускай савецкай энцыклапедыі і Энцыклапедыі гісторыі Беларусі аб геральдыцы і сімволіцы; у Энцыклапедыі археалогіі і нумізматыкі, навуковых працах Ш.Бекцінеева, Ю. Бугары, В. Рабцэвіча — аб грошах Беларусі; у працах Л. Коласава — аб паштовых марках; аб войску — у калектыўных працах "Баявы летапіс беларускіх палкоў" (Мн., 1994) і "Забытая слава" (Сов. Белоруссия. 1992. 30 июня — 3 июля).

Выкладчыку раім звярнуць увагу на палемічныя матэрыялы аб сімволіцы Беларусі, якія змяшчаліся на старонках друку У. Корзунам, В. Вячоркам, М. Жабінскай, Л. Лычом, М. Ткачовым і інш., а таксама на дыскусійныя погляды навукоўцаў (На скрыжаванні думак: Вучоныя аб "белых плямах" гісторыі Беларусі. Мн., 1990. С. 99—118; Нар. газ. 1993. 25 мая. С. 2) і розныя падыходы, якія адлюстраваны ў артыкулах газет і часопісаў (Звязда. 1991. 31 жн.; 20 верас.; Нар. газ. 1991. 20 верас.; Літ. і мастацтва. 1991. 4 кастр. і г.д.). Цікавы абагульняючы матэрыял змешчаны ў кнізе А. Басава і І. Куркова "Флагі Беларусі ўчора і сёння" (Мн.: Полымя, 1994). Гістарычныя звесткі аб дзяржаўных сімвалах рэспублікі надрукаваны ў энцыклапедычным даведніку "Беларусь" (Мн., 1995. С. 660—661).

На занятках па гэтай тэме магчыма выкарыстанне даведачных лічбаў і параўнальных даных аб Беларусі і іншых краінах, якія змешчаны ў табліцах 12.1 і 12.2; па выніках рэферэндумаў раім скласці табліцы-дыяграмы.

У мэтах завяршэння вывучэння тэмы прапануюцца кантрольныя пытанні, рэфераты і практычныя заданні.

У заключнай частцы заняткаў па тэме рэкамендуецца падкрэсліць, што Рэспубліка Беларусь як суверэнная дзяржава адносна маладая і значная частка атрыбутаў яе самастойнасці, незалежнасці знаходзіцца ў стане фарміравання, станаўлення і замацавання.

## Кантрольныя пытанні:

1. Чаму канстытуцыя з'яўляецца Асноўным законам дзяржавы?
2. Калі ўведзена ў дзеянне сучасная Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь?
3. Якую структуру мае сучасная Канстытуцыя РБ?
4. Як фарміруюцца органы дзяржаўнай улады і кіравання ў нашай рэспубліцы?
5. Хто з'яўляецца кіраўнікам дзяржавы?
6. Хто ўзначальвае заканадаўчую і выканаўчую ўлады ў нашай дзяржаве?
7. Хто фарміруе судовую ўладу?
8. Якія атрыбуты нацыянальнага суверэнітэту мае наша дзяржава?
9. Чаму Дзяржаўны сцяг мае чырвоны, зялёны колеры і бела-чырвоны арнамент?
10. Які гімн з'яўляецца Дзяржаўным? Хто напісаў словы і музыку гімна?
11. Калі і дзе пачалі чаканіць грошы на Беларусі? Які статус маюць сучасныя беларускія рублі ("зайчыкі")?
12. Дзе і калі пачалі друкаваць беларускую паштовую марку? Якія сучасныя паштовыя маркі існуюць у рэспубліцы?
13. Які герб і чаму мае сталіца Беларусі?
14. Які герб мае Ваш горад?

## Тэматыка рэфератаў:

1. Сучасная дзяржаўная сімволіка Рэспублікі Беларусь.
2. Дзяржаўныя атрыбуты БССР.
3. Дзяржаўныя атрыбуты БНР.
4. Гісторыя стварэння гімна нашай дзяржавы: мінулае і сучаснасць.
5. Гарадская геральдыка Беларусі.
6. Гісторыя беларускай паштовай маркі.
7. Беларускія грошы.
8. З гісторыі стварэння беларускага войска.
9. Гісторыя паходжання герба мястэчка, горада (у якім знаходзіцца навучальная ўстанова або адкуль родам навучэнцы).

## Практычныя заданні:

1. Правесці аналіз твораў беларускіх пісьменнікаў М. Ермаловіча, К. Тарасава, гісторыкаў М. Ткачова, А.Цітова аб нацыянальных сімвалах Беларусі.
2. Падрыхтавацца да заключнай дыскусіі па тэме "Беларускі шлях сёння: ідэі, накірункі развіцця, праблемы і людзі".
3. Азнаёміцца з артыкуламі аб гарадской геральдыцы Бела-

русі (па "Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі". Т.2. С. 70; "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі". Т. 2. С. 512, 515—517).

4. Падрыхтоўка малюнкаў да наглядных дапаможнікаў па тэмах:

а) Гербы беларускіх гарадоў (Спадчына. 1993. № 1, 2, 4);

б) Гербы беларускай шляхты (Спадчына. 1993. № 1, 2, 4);

в) Гербы беларускіх ваяводстваў БНР (Спадчына. 1990. № 4);

г) Беларуская паштоўка (Спадчына. 1990. № 4; 1991. № 5); (Подлипский А. М. Белоруссия на почтовых открытках. Мн., 1988. С.111, ил.);

д) Дзяржаўныя сімвалы Беларусі.

5. Правядзенне параўнальнага аналізу тэкстаў дзяржаўных гімнаў РБ і БССР, а таксама тэкстаў, якія ўдзельнічалі ў рэспубліканскім конкурсе.

## Афіцыйныя дакументы:

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г. (са зняненнямі і дапаўненнямі). Мн., 1997.

Аб дзяржаўных узнагародах Рэспублікі Беларусь. Закон Рэспублікі Беларусь // Нар. газ. 1995. 16 мая. С. 3.

Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь: Тэкст Янкі Купалы // Нар. газ. 1993. 19 кастр. С.2.

Заканадаўчыя акты аб дзяржаўнай сімволіцы Рэспублікі Беларусь / Склад. А. Трусаў, І. Лазавікоў. Мн., 1994.

Палажэнне аб Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь: Зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 чэрвеня 1995 г. № 214 // Нар. газ. 1995. 13 чэрв. С.1.

Палажэнне аб Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь: Зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 чэрвеня 1995 г. № 213 // Нар. газ. 1995. 14 чэрв. С. 2.

## ЛІТАРАТУРА:

### Асноўная

Басаў А. Н., Куркоў І. М. Флагі Беларусі ўчора і сёння. Мн., 1994.

Васільеў Я., Камінскі М. Як ствараўся герб БССР // Маладосць. 1970. № 1.

Вячорка В., Драчоў П. Пра герб і сцяг. Мн., 1993.

Государственный герб, флаг и гимн БССР / Сост. Е.Г.Васильев. Мн., 1972.

Кацер М. Герб и флаг БССР // Полит. собеседник. 1989. № 5. С. 43—45.

Кашпераў Ф. З гісторыі гімнаў // Беларусь. 1978. № 8. С. 26.

Пастухов М. "Мы, народ Республики Беларусь..." // Нар. газ. 1994. 7, 8, 13 ліп.

Побаль Л. Паходжанне сучаснага герба і сцяга Беларусі вядзе ў далёкую мінуўшчыну // Бел. думка. 1996. № 6. С. 107—117.

Рябцевич В. Н. Нумизматика Белоруссии. Мн., 1995.

Сапрыков В. Флаги содружества: Республика Беларусь // Наука и жизнь. 1992. № 10. С. 17—19.

Сімволіка на Беларусі: Учора і сёння // На скрыжаванні думак: Вучоныя

аб "белых плямах" гісторыі Беларусі / Склад. Я.І.Бараноўскі. Мн., 1990. С. 99—118.

Сказание о гербе и флаге: О нынешней гос. символике / А. Савицкий, Е. Хромченко, Э. Самусенко, В. Космычев // Бел. думка. 1996. № 8. С. 80—88.

Хай стане сэрцам і душой народа: Аб конкурсе Дзяржаўнага гімна РБ // Нар. газ. 1992. 15 ліп. С. 3.

Цітоў А. К. Наш сімвал — Пагоня: Шлях праз стагоддзі. 2-е выд. Мн., 1993.

Цітоў А. Сімвалы новага поступу: З гісторыі Дзяржаўнага герба і флага БССР // Мастацтва Беларусі. 1989. № 1. С. 67—69.

## Дадатковая

Баркун Г. І. Імя рэспублікі на ордэне // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1979. № 1.

Барыс А. Сучасныя партыі на Беларусі // Бел. гіст. часопіс. 1995. № 1.

Басаў А. Сцягі дзяржаваў — былых рэспублік СССР // Спадчына. 1995. № 3.

Бектинеев Ш. И. Денежное обращение Великого княжества Литовского в XIII—XV вв. Мн., 1994.

Бекцінееў Ш. Беларускія грошы // Чырв. змена. 1994. 22 лют.

Боевая летопись белорусских полков. Вып. II / Ю.С.Иванов; Упр. воспит. работы М-ва обороны РБ. Мн., 1994.

Бугара Ю. Грошы Беларусі // Культура. 1992. № 16.

Вабішэвіч В. Вывучэнне сімволікі ў школе // Бел. гіст. часопіс. 1995. № 2.

Вишневский А. Ф., Ильинский Н. И., Сороковик И. А. История милиции Беларуси (1917 — 1994 гг.): Учебник. Мн., 1995.

Гнидаш В.С. Герб, флаг, гимн СССР. Л., 1985.

Грыб Т. Да пытання аб паходжанні герба "Пагоня" // Культура. 1992. № 28—29.

Драчук В. С. Рассказывает геральдика. М., 1977.

Колосов Л. Л. Филателия о Белоруссии. Мн., 1984.

Лыч Л. Коннік з глыбі стагоддзяў // Наст. газ. 1995. 13 мая.

Мазырэц Ц. Узнагароды Беларусі // Спадчына. 1992. № 5; 1993. № 1.

Очерки военной истории Белоруссии: В 5 ч. / Мин-во обороны РБ. Мн., 1995.

Палітычныя партыі Беларусі: Тэмат. зб./ Склад. і адказ. за вып. В. К. Банько. Мн., 1996.

Сімволіка на Беларусі: Рэк. бібл. спіс // Новыя кнігі БССР. 1991. № 4. Дадатак.

Стуканов А., Космылев В. Государственные символы Советской Белоруссии // Сов. Белоруссия. 1989. 15 апр. С.2.

Ткачев М. Национальные символы: народ и история // Сов. Белоруссия. 1989. 11—12 окт. С. 3.

Цітоў А.К. Гарадская геральдыка Беларусі. Мн., 1989.

Цітоў А. Сімволіка і аўтары марак БНР // Спадчына. 1990. № 4.

Цітоў А. Сцяг, прапар, харугва... // Бел. мінуўшчына. 1994. № 2.

**Т а б л і ц а 12.1. Статыстычныя даныя аб некаторых дзяржавах Еўропы ***

| Дзяржава | Колькасць насельніцтва, млн чал. | Плошча тэрыторыі, тыс. км$^2$ |
|---|---|---|
| Беларусь | 10,3 | 207,6 |
| Польшча | 38,6 | 312,7 |
| Літва | 3,7 | 65,2 |
| Латвія | 2,7 | 64,5 |
| Украіна | 51,9 | 603,7 |
| Расія | 148,5 | 17075,0 |
| Англія | 58,6 | 130,4 |
| Балгарыя | 9,0 | 110,9 |
| Бельгія | 10,2 | 30,5 |
| Венгрыя | 10,6 | 93,0 |
| Галандыя | 15,5 | 41,5 |
| Германія | 81,7 | 356,3 |
| Францыя | 58,1 | 551,0 |
| Швецыя | 8,9 | 450,0 |

* Географический энциклопедический словарь. М., 1989; Беларусы: Атлас. Мн., 1996. С.33.

**Т а б л і ц а 12.2. Даведачныя лічбы аб Беларусі (па стану на 01.01.92 г.) ***

**А) Працягласць тэрыторыі рэспублікі:**
з усходу на захад – 650 км,
з поўдня на поўнач – 560 км.

(Геаграфія Беларусі: Энцыкл. даведнік. Мн.: БелЭн, 1992. С.6.)

**Б) Колькасць адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак па абласцях рэспублікі:**

